Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
«Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»

С.Ф. ЛАПАНОВІЧ

# ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫХ І ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПА АКАЗАННІ ДАПАМОГІ БЕЖАНЦАМ У БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1914 – КАСТРЫЧНІК 1917 г.)

Мінск
Акадэмія МУС
2010

УДК 947.6«1914/1917»

**Лапановіч**, **С.Ф**. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1914 – кастрычнік 1917 г.) / С.Ф. Лапановіч ; М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь ; установа адукацыі «Акадэмія М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь». Мінск : Акад. МУС, 2010. – 127 с. ISBN 978-985-427-616-8.

У манаграфіі на падставе вывучэння шырокага кола архіўных матэрыялаў і дарэвалюцыйных перыядычных выданняў аналізуюцца абставіны і ўмовы ператварэння мірнага насельніцтва Беларусі ў бежанцаў у гады Першай сусветнай вайны, раскрываюцца асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі па забеспячэнні патрэб бежанцаў, даследуецца ўдзел грамадскіх арганізацый у аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі.

Прааналізаваны комплекс матэрыялаў паспрыяў вызначэнню характару і памераў дапамогі бежанцам, удзельнай вазе ў гэтай справе дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, а таксама выяўленню залежнасці справы забеспячэння патрэб бежанцаў ад аб'ектыўных умоў палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.

Адрасуецца ўсім, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

Табл. 6. Бібліягр.: 155 назв.

Рэкамендавана да выдання рэдакцыйна-выдавецкім саветам
Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь 23 студзеня 2009 г. (пратакол № 2)

Рэцэнзенты:

доктар гістарычных навук, прафесар *А.П. Жытко*,
доктар гістарычных навук, прафесар *А.Ф. Вішнеўскі*,
кандыдат юрыдычных навук, дацэнт *А.Ул. Веніосаў*,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *С.А. Талмачова*

ISBN 978-985-427-616-8

© УА «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь», 2010

# УВОДЗІНЫ

Сучасная гістарыяграфія разглядае Першую сусветную вайну як важнейшую падзею пачатку XX ст. Вядучыя дзяржавы свету вырашалі свае праблемы шляхам жорсткай і бескампраміснай вайны, якая стала паваротным пунктам у лёсе мірнага насельніцтва. Жыхары франтавых і прыфрантавых тэрыторый у пошуках выратавання вымушаны былі перасяляцца і шукаць сабе іншы прытулак. Яны станавіліся бежанцамі. Матэрыяльныя страты і душэўныя перажыванні паставілі бежанцаў на мяжу адчаю, амаль поўнасцю пазбавілі іх дзеяздольнасці.Ператварэнне мірнага насельніцтва ў бежанцаў мела наступствамі частковае разбурэнне сацыяльнай структуры грамадства, былі парушаны сямейныя адносіны і традыцыйныя сувязі.

Адзначым, што расійскае армейскае кіраўніцтва рыхтавалася да наступальнай і скарацечнай вайны. Генеральны штаб планаваў наступленне супраць войск праціўніка з мэтай перанясення баявых дзеянняў на яго тэрыторыю. Акрамя гэтага, расійскае ваеннае кіраўніцтва меркавала, што будучая вайна не можа быць працяглай. Панаванне тэорыі хуткабежнай вайны адмоўна паўплывала на падрыхтоўку да яе. Крызіс забеспячэння зброяй, боезапасамі, амуніцыяй назіраўся ўжо ў першыя месяцы вайны [105; 106; 108; 123; 129; 135; 155]. Гэта стала адной з асноўных прычын няўдалых дзеянняў расійскай арміі і яе адступлення ў 1915 г., што ў сваю чаргу паўплывала на ператварэнне бежанства ў сапраўдную катастрофу. Так характарызавалі масавае бежанства сучаснікі тых падзей, у тым ліку прадстаўнікі вышэйшых ваенных і цывільных органаў улады. Генерал В.І. Гурко пісаў: «Людзі, якія ваявалі ў некалькіх войнах і ўдзельнічалі ў шмат якіх крывавых бітвах, казалі мне, што ніякі жах бітвы не можа параўнацца з жудасным відовішчам бясконцага руху насельніцтва, якое не ведае ні мэты свайго падарожжа, ні месца, дзе яно зможа адпачыць, знайсці ежу і прытулак… Толькі Бог ведае, якія пакуты зведалі яны, колькі слёз пралілі, колькі чалавечых жыццяў было прынесена ненасытнаму Малоху вайны».

Міністр сельскай гаспадаркі царскага ўрада А.В. Крывашэін папярэджваў аб асаблівай небяспецы бежанства: «З усіх суровых выпрабаванняў вайны рух бежанцаў з'яўляецца найбольш нечаканым, самым сур'ёзным і цяжкавылечным… Хваробы, смутак і жабрацтва рухаюцца разам з бежанцамі ў Расію. Яны ствараюць паніку і знішчаюць усё… Як член Савета міністраў, я сцвярджаю, што наступная міграцыя насельніцтва прывядзе Расію ў бездань рэвалюцыі» [146, с. 149].



Гэтая з'ява непасрэдна закранула сотні тысяч жыхароў нашай краіны, якія самі сталі бежанцамі, і апасродкавана паўплывала амаль на ўсё насельніцтва, якое жыло побач з імі. У красавіку 1917 г. у адным з перыядычных выданняў былі паведамлены наступныя афіцыйныя звесткі аб колькасці бежанцаў у Расійскай імперыі – больш за 3 млн 110 тыс. чалавек. Вялікія памеры бежанства набыло ў Беларусі. Больш за 1 млн 120 тыс. бежанцаў былі з Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віленскай і Віцебскай губерняў [52, № 17, с. 8–9]. Прыведзеныя вышэй лічбы далёка не поўныя – пры падліку не ўлічваліся памёршыя ў час высялення і руху людзі, тыя бежанцы, якія знайшлі прытулак у сваякоў і пэўным чынам сацыялізаваліся ў новым асяроддзі, а таксама бежанцы, што пражывалі ў прыфрантавой паласе (перапіс насельніцтва тут забараняла ваенныя ўлады).

У Расійскай імперыі ў вырашэнні праблемы бежанства прымалі ўдзел як дзяржаўныя ўстановы і службовыя асобы, так і арганізацыі, што дзейнічалі на грамадскіх і дабрачынных пачатках. З боку цэнтральнай дзяржаўнай улады пра бежанцаў клапаціліся Міністэрства ўнутраных спраў (МУС), Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў, Галоўнаўпаўнаважаныя па ўладкаванні бежанцаў, з боку мясцовых улад – губернскія, павятовыя і гарадскія ўлады. Сярод недзяржаўных арганізацый галоўную ролю ў аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі адыгрывалі Усерасійскі земскі саюз (УЗС), Усерасійскі саюз гарадоў (УСГ) (аб'яднаная арганізацыя саюзаў атрымала назву ЗемГор) і Камітэт Яе Імператарскай Высокасці Вялікай Князёўны Таццяны Мікалаеўны (далей – Таццянінскі камітэт), а таксама дабрачынныя арганізацыі, пабудаваныя па нацыянальных, тэрытарыяльных ці рэлігійных прынцыпах.

Савецкая гістарыяграфія амаль не разглядала пытанні бежанства і ацэньвала ў асноўным адмоўна дзейнасць у дасавецкі час дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам, прычым без навуковага аналізу і абгрунтаванага доказу такой пазіцыі. Пры даследаванні названага перыяду савецкіх гісторыкаў перш за ўсё цікавілі рэвалюцыйныя падзеі, а ўся метадалогія грунтавалася на падставе партыйна-класавага прынцыпу, які дыктаваў прыярытэт класавых каштоўнасцей. Таму ў савецкі час праблема становішча мірнага насельніцтва ў перыяд Першай сусветнай вайны даследавалася выключна праз прызму класавых і сацыяльных супярэчнасцей у грамадстве.

У цяперашні час актуальным з'яўляецца даследаванне сацыяльнай і палітычнай гісторыі на падставе прынцыпаў гістарызму і аб'ектыўнасці, якія даюць магчымасць аналізаваць факты, зыходзячы з прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей. Гэта даты-

чыцца і бежанства, якое паўплывала на стан усяго тагачаснага грамадства, закранула сацыяльную, эканамічную і духоўную сферы жыцця насельніцтва. Даследаванне справы аказання дапамогі бежанцам у акрэслены перыяд з'яўляецца актуальнай гістарычнай праблемай, паколькі дапамагае ўсебакова і грунтоўна прааналізаваць дзяржаўную палітыку ў адносінах да мірнага насельніцтва ў ваенны час, раскрыць напрамкі дзейнасці недзяржаўных арганізацый, вызначыць спецыфіку іх узаемаадносін з органамі ўлады Расійскай імперыі ў апошнія гады яе існавання. Актуальнасць даследавання вызначаецца таксама ўплывам наступстваў бежанства як сацыяльнай катастрофы на разбурэнне традыцыйных грамадскіх інстытутаў. Апошняе стала важным фактарам рэвалюцыйных падзей.

Даследаванне дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам запатрабавана грамадствам, паколькі на сучасным этапе бежанства застаецца надзённай гуманітарнай праблемай [13; 40; 107; 113; 137].

Аб'ектам даследавання манаграфіі з'яўляецца сацыяльная катастрофа беларускага грамадства ў гады Першай сусветнай вайны і бежанства як фактар апошняй. Прадмет даследавання – асноўныя напрамкі ў дзейнасці арганізацый па забеспячэнні патрэб бежанцаў і па аказанні апошнім розных відаў дапамогі. Пад увагу браліся таксама сацыяльныя і палітычныя адносіны ў грамадстве, якія ўплывалі на стан справы аказання дапамогі бежанцам.

Хранaлагічныя рамкі манаграфіі ахопліваюць 1914 – кастрычнік 1917 г. Бежанства было адным з фактараў Першай сусветнай вайны, у якую Расійская імперыя ўступіла ў 1914 г. З гэтага часу і да лютага 1917 г. вядзенне справы аказання дапамогі бежанцам адбывалася ва ўмовах праўлення царскага ўрада, а з лютага па кастрычнік 1917 г. – у перыяд кіравання Часовага ўрада. Канчатковай датай даследавання вызначаны кастрычнік 1917 г., таму што ў Савецкай краіне дзейнасць розных арганізацый ажыццяўлялася ў іншых умовах.



# ГЛАВА 1 ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ І КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ АГЛЯД

Пачатак даследавання праблемы бежанцаў і дзейнасці па аказанні ім дапамогі быў пакладзены непасрэдна ў час Першай сусветнай вайны. Прадстаўнікі і супрацоўнікі розных арганізацый як дзяржаўных, так і дабрачынных, якія займаліся забеспячэннем патрэб бежанцаў, у нарысах аб сваёй дзейнасці імкнуліся прааналізаваць прычыны з'яўлення бежанства, акрэслівалі ўмовы і акалічнасці сваёй працы, вызначалі (на свой погляд) поспехі і недахопы апошняй. Сярод такіх работ – справаздача кіраўніка ўрадавай арганізацыі «Поўначдапамога» С.І. Зубчанінава «Организация и условия работы по устройству беженцев Северо-Западного фронта» (1915) [45], справаздачы аб працы Тацянінскага камітэта – «Очерк деятельности комитета Е.И.В. Великой княжны Татьяны Николаевны по оказанию временной помощи потерпевшим от военных действий со дня основания до 1 января 1916 г.» (1916) [104], «Отчет о деятельности Особого отдела комитета Е.И.В. Великой княжны Татьяны Николаевны по регистрации беженцев в 1915 г.» (1916), нарыс аб дзейнасці ЗемГора: «Всероссийский Земский и Городской союзы: отдел по устройству беженцев». У першую чаргу неабходна адзначыць пэўную тэндэнцыйнасць аўтараў гэтых справаздач і нарысаў – яны імкнуліся засяродзіць увагу на аспектах дзейнасці сваіх арганізацый, а да працы іншых устаноў падыходзілі вельмі крытычна. У гады Першай сусветнай вайны быў абвешчаны ўседзяржаўны збор матэрыялаў для складання абагульняючай працы «Гісторыя бежанскага руху ў Расіі», аднак рэвалюцыя прыпыніла правядзенне гэтых даследаванняў [64, с. 182].

У савецкі час пры даследаванні перыяду Першай сусветнай вайны для гісторыкаў прыярытэтнай была рэвалюцыйная тэматыка [1; 18; 32; 36; 37; 54; 61; 82; 83; 85; 114; 148–150]. Спецыяльныя даследаванні па праблеме бежанства не праводзіліся на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў [68]. На думку сучаснага расійскага гісторыка А.Н. Курцава, замоўчванне бежанства звязана з тым, што параўнанне многіх аспектаў аказання дапамогі бежанцам у царскай Расіі былі не на карысць як савецкаму перыяду іх вяртання на радзіму, так і ўмовам масавай эвакуацыі насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны [65, с. 98].

Назапашванне матэрыялу пра бежанства адбывалася пры даследаванні агульных праблем Першай сусветнай вайны. У 20–30-х гг. пры аналізе міграцыйных і дэмаграфічных працэсаў рабіліся

спробы вызначыць колькасць бежанцаў (Л.І. Лубны-Герцык «Движение населения на территории СССР за время мировой войны и революции» (1926) [78], Я.З. Волкаў «Динамика народонаселения СССР за восемьдесят лет» (1930) [22]).

Адной з першых прац пасляваеннага перыяду, у якой былі закрануты пытанні аказання дапамогі бежанцам, стала «Экономика русской промышленности в условиях первой мировой войны» І.В. Маеўскага (1957). Аўтар, зыходзячы з марксісцкіх пазіцый і з класавым падыходам, асноўны змест сваёй працы прысвяціў палітычнаму і эканамічнаму крызісу Расійскай імперыі ў 1914–1917 гг. Пры разглядзе эканамічнага становішча краіны І.В. Маеўскі эпізадычна закрануў праблему бежанцаў. Ён лічыў, што для царскага ўрада бежанцы з'яўляліся рэзервуарам, з якога меркавалася атрымаць значную колькасць таннай працоўнай сілы. Узгадваўся шэраг устаноў па аказанні дапамогі бежанцам (Таццянінскі камітэт, Земскі і Гарадскі саюзы, нацыянальныя арганізацыі), дзейнасць якіх аўтар звёў да «палявання» на бежанцаў з мэтай уладкавання іх на працу. І.В. Маеўскі асабліва падкрэсліваў, што ў выпадках адмовы бежанцы прыцягваліся да працы прымусова. Было таксама адзначана, што з-за таго, што большасць бежанцаў паходзіла з сельскай мясцовасці, іх на прамысловыя прадпрыемствы ўладкоўвалася няшмат [79, с. 321–322].

Часткова пытанні выкарыстання працы бежанцаў у сельскай гаспадарцы былі закрануты і ў працы А.М. Анфімава «Российская деревня в годы первой мировой войны (1914 – февраль 1917 г.)» (1962). Аўтар таксама акцэнтаваў увагу на эксплуатацыі бежанцаў. Ён адзначаў цяжкае становішча бежанцаў у месцах іх часовага жыхарства і невялікія памеры дапамогі з боку ўлад. Апошнія, як падкрэсліў сам аўтар, «прымусова прыцягвалі іх працаваць у памешчыкаў і кулакоў за мізэрны заробак» [2, с. 97–98, 104–106, 195].

У 1967 г. з'явілася праца В.С. Дзякіна «Русская буржуазия и царизм в годы первой мировой войны», у якой разглядаліся асобныя напрамкі дзейнасці УЗС і УСГ. У ёй негатыўна ацэньваліся дзеячы земскіх і гарадскіх самакіраванняў, акцэнт рабіўся на іх «здрадзе» народным інтарэсам за супрацоўніцтва з памешчыкамі і царом. Крытыка буржуазіяй урада разглядалася як палітычная гульня з мэтай атрымання новых прывілей. Аб дзейнасці саюзаў па аказанні дапамогі бежанцам В.С. Дзякін узгадаў толькі эпізадычна. У той жа час ён справядліва адзначыў, што саюзы імкнуліся выкарыстаць дабрачынную працу для пашырэння межаў сваёй дзейнасці [35, с. 61, 67–68, 71].

У фундаментальнай працы А.Л. Сідарава «Экономическое положение России в годы первой мировой войны» (1973) былі закрануты некаторыя аспекты эвакуацыі з заходніх губерняў. Аўтар грунтоўна прааналізаваў падрыхтоўку Расіі да вайны. Менавіта ў



яе незавершанасці бачыў прычыны паражэнняў і адступлення рускай арміі ў 1915 г. Аўтар адзначыў стыхійны характар эвакуацыі прамысловасці з заходніх губерняў, тлумачачы гэта нераспрацаванасцю эвакуацыйных планаў у пачатку вайны [130, с. 8–13, 213–219].

Толькі ў 1985 г. у манаграфіі Т.М. Кітанінай «Война, хлеб и революция (Продовольственный вопрос в России, 1914 – октябрь 1917 г.)» быў прызнаны факт клопату аб бежанцах з боку дзяржавы. У цэлым у гэтай працы акцэнт робіцца на эканамічным крызісе ў Расійскай імперыі, таксама разглядаюцца пытанні забеспячэння сельскай гаспадаркі працоўнай сілай. Зноў паўтараецца тэзіс аб выкарыстанні прымусовай працы бежанцаў без уліку іх кваліфікацыі і прафесіі. У той жа час Т.М. Кітаніна амаль упершыню ў савецкай гістарыяграфіі ўзгадвае, што царскім урадам быў прыняты закон ад 30 жніўня 1915 г.* «Аб забеспячэнні патрэб бежанцаў», які акрэсліў кола арганізацый, адказных за гэту справу. У працы Т.М. Кітанінай ёсць таксама вельмі цікавыя разважанні і вывады аб барацьбе паміж грамадскімі дабрачыннымі арганізацыямі і мясцовымі цывільнымі ўладамі ў асобе губернатараў за кіраўніцтва справай уладкавання бежанцаў на месцах. Аўтар указвае на крытычнае стаўленне губернатараў да УЗС і УСТ, «спрабуючых у некаторых губернях захапіць бежанцаў у свае рукі» і да дзейнасці Галоўнаўпаўнаважаных на франтах па ўладкаванні бежанцаў на працу. Т.М. Кітаніна адзначае і вынік барацьбы паміж грамадскімі арганізацыямі і губернатарамі ў гэтым пытанні. Згодна з выдадзеным у 1916 г. цыркулярам А.М. Хвастова і з фактычным змяненнем палажэнняў закона ад 30 жніўня 1915 г. кіраўніцтва справай уладкавання бежанцаў на месцах пераходзіла да губернатараў [59, с. 51–54].

Беларускія гісторыкі ў савецкі час таксама практычна не разглядалі праблему бежанства [30; 34; 62; 77; 112; 128; 138; 142]. Яна выкарыстоўвалася толькі як фон для крытыкі дасавецкіх органаў улады. Так, у манаграфіях Т.Я. Саладкова «Борьба трудящихся Белоруссии против царизма (1907–1917 гг.)» [138, с. 305–308] і Э.М. Савіцкага «Революционное движение в Белоруссии (август 1914 – февраль 1917 г.)» [127, с. 30–31, 35–37, 126–128] узгадана пра цяжкае становішча бежанцаў, што тлумачылася абыякавымі адносінамі да іх лёсу з боку дзяржаўнай улады.

Адным з першых, хто яшчэ ў савецкі час звярнуў увагу на важнасць вывучэння праблематыкі бежанства ў айчыннай гістарыяграфіі, быў М.М. Улашчык [12, с. 3; 144, с. 211–218].

З блізкіх да М.М. Улашчыка пазіцый падышоў да адлюстравання дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам В. Скалабан, які і па

---

* Даты прыводзяцца па старому стылю.

сённяшні час з’яўляецца адным з самых кампетэнтных навукоўцаў па даследаванні праблемы бежанства ў гады Першай сусветнай вайны [131]. Яшчэ ў 1981 г. у артыкуле «...У гэты суровы і важны час (Максім Багдановіч у Мінску)» аўтар даволі падрабязна распавёў пра стварэнне і дзейнасць Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны, пра яго мінскі аддзел і пра працу ў апошнім М. Багдановіча. Акцэнт у артыкуле зроблены на дабрачыннай дзейнасці Беларускага таварыства і на яго ўзаемаадносінах з уладай [133, с. 141–149].

Такім чынам, у савецкі час праблема бежанцаў разглядалася эпізадычна і ў большасці выпадкаў толькі для канстатацыі антынароднага характару царскай улады. На навуковай канферэнцыі ў 1989 г. у Маскве, прысвечанай 75-годдзю пачатку Першай сусветнай вайны, не было ніводнага даклада, які закранаў бы праблему бежанства. У дакладзе А.П. Жыліна аб вывучэнні гісторыі Першай сусветнай вайны ў СССР работы пра бежанства ў мінулыя часы не былі названы, не планаваліся яны для вывучэння і ў наступныя гады [39].

Сітуацыя карэнным чынам змянілася ў 90-я гг. ХХ ст., калі былі зняты ідэалагічныя перашкоды. Навукоўцы пачалі разглядаць бежанства як гуманітарную праблему, акцэнтаваць увагу на лёсе як асобных людзей, так і цэлых народаў, трапіўшых у катастрафічнае становішча. У сучаснай расійскай гістарыяграфіі з’яўляецца ўсе большая колькасць даследаванняў, прысвечаных праблеме бежанцаў і аказання ім дапамогі, а таксама іх становішча і рээвакуацыі ў пасляваенны перыяд [140]. Так, некаторыя пытанні руху бежанцаў і іх уладкавання ва ўнутраных губернях Расійскай імперыі раскрываюцца ў дысертацыях І.П. Шчэрава «Организация и деятельность коллегий по делам пленных и беженцев в смоленском крае (1914–1921)» (1998) [153], У.В. Хасіна «Миграционные процессы в Российской империи в Первую мировую войну» (1999) [147], А.С. Шчацінінай «Беженцы на юге Западной Сибири 1914–1923 гг.: источники и методы изучения» (2007) [154], В.В. Немавай «Организация благотворительной помощи на Дону в годы первой мировой войны» (2009) [101, с. 1–25].

У 1998 г. у Санкт-Пецярбургу адбыўся міжнародны навуковы калёквіум «Расія ў Першай сусветнай вайне», у рамках якога працавала секцыя «Вайна і грамадства». Паведамленні расійскага гісторыка А.Н. Курцава і англійскага даследчыка П. Гетрэла былі прысвечаны бежанцам. У сваім дакладзе «Беженство» А.Н. Курцаў акцэнтаваў увагу на такіх пытаннях, як рух і жыццё бежанцаў на месцы часовага пражывання, дзяржаўны клопат пра эвакуіраванае насельніцтва, узаемаадносіны бежанцаў і мясцовага насельніцтва, агульная колькасць бежанцаў і іх нацыянальны састаў. Значную ролю А.Н. Курцаў адводзіць арганізацыям па аказанні дапамогі бежанцам. Сярод іх цэнтральнай установай з першага года вайны ён вызначыў Таццянінскі камітэт і менавіта разгляду яго дзейнасці прысвяціў асноўную ўвагу. Аўтар узгадаў пра дзейнасць мясцовай адміністрацыі, нацыянальных арганізацый, асобна адзначыў дзейнасць Галоўнаупаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў на франтах. У той жа час, улічваючы, што аўтар у асноўным карыстаўся дакументамі праўрадавых устаноў, ён амаль не асвяціў дзейнасць УЗС і УСГ. У названай працы падкрэсліваецца актуальнасць даследавання праблем бежанства ў сувязі з сённяшнім палітычным і эканамічным становішчам у свеце, якое нараджае новых бежанцаў [64, с. 129–146, 181–183].

П. Гетрэл сваю працу «Беженцы и проблема пола в России во время Первой мировой войны» прысвяціў размеркаванню сацыяльных роляў сярод бежанцаў. Выкарыстоўваючы гендэрны падыход, на падставе даных аб колькасці мужчын і жанчын (іх было значна больш сярод бежанцаў), аўтар разглядае працэс частковай змены сацыяльных роляў. Парушэнне традыцыйнага ўкладу жыцця бежанцаў прымусіла жанчын узяць на сябе новыя сацыяльныя абавязкі, якія раней лічыліся толькі мужчынскімі. З іншага боку, узнікненне бежанства і неабходнасць аказання дапамогі пацярпеўшым ад вайны далі магчымасць жанчынам з прывілеяваных саслоўяў пачаць актыўнае грамадскае жыццё і стаць удзельніцамі вырашэння агульнадзяржаўнай праблемы [29].

У абагульняючым нарысе «Беженцы в России в годы первой мировой войны» П. Гетрэл падрабязна прааналізаваў акалічнасці ўзнікнення бежанства, акрэсліў асаблівасці іх руху на Усход, а таксама вызначыў па нацыянальнай прыкмеце катэгорыі бежанцаў [28].

Сучасных гісторыкаў цікавяць і акалічнасці ўзнікнення бежанства. Так, С.Г. Неліповіч у артыкуле «Репрессии против подданных „центральных держав“. Департации в России 1914–1918 гг.», аналізуючы высяленне немцаў і аўстрыйцаў з заходніх губерняў у глыб імперыі, адзначае, што менавіта ваенныя ўлады выступілі з такой ініцыятывай. Аўтар падкрэслівае непадрыхтаванасць ваенных і цывільных улад да руху і ўладкавання дэпарціраванага насельніцтва, адзначае адмоўныя вынікі высялення мірных жыхароў для ўнутранага становішча ў краіне [100].

Адзначым таксама артыкул Г.З. Іофе (зараз грамадзяніна Канады) «Выселение евреев из прифронтовой полосы в 1915 г.» (2001). Аўтар адзначае, што ўрад разумеў адмоўныя вынікі прымусовага высялення насельніцтва, аднак не быў здольны карэнным чынам паўплываць на сітуацыю, бо заходнія губерні фактычна знаходзіліся пад уладай армейскага камандавання. Менавіта апошняе выступіла ініцыятарам высялення мірных жыхароў, а потым пераклала клопат аб іх забеспячэнні на мясцовыя цывіль-

ныя ўлады і дабрачынныя арганізацыі. Г.З. Іофе робіць выснову, што дыскрымінацыя ўладамі Расійскай імперыі яўрэйскага насельніцтва стала падставай для актыўнага ўдзелу апошняга ў рэвалюцыйных падзеях [53].

Вывучэнне гісторыі бежанства становіцца актуальнай праблемай і ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі, аб чым сведчыць павелічэнне колькасці работ па гэтай тэматыцы [58; 115; 151; 152].

У 1994 г. з'явіліся артыкулы А. Мікалаевіча «Бежанцы» і «Бежанцы першай сусветнай вайны», у якіх аўтар разглядаў ператварэнне значнай колькасці насельніцтва ў бежанцаў як сапраўдную катастрофу беларускага народа. Аўтар зрабіў акцэнт на прымусовым характары высялення насельніцтва, жудасным стане бежанцаў, іх неўладкаванасці на новым месцы жыхарства. А. Мікалаевіч закрануў аспекты дзейнасці Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў, Таццянінскага камітэта, ЗемГора, нацыянальных і дабрачынных арганізацый. Аўтар адзначыў, што асноўная грашовая дапамога бежанцам ішла ад указанай нарады, якая выдзяляла сродкі на забеспячэнне іх патрэб. Таксама шмат увагі звернута на дзейнасць беларускіх арганізацый як у Беларусі, так і ва ўнутраных губернях Расійскай імперыі [80; 81].

Значны ўклад у даследаванне бежанства ў Беларусі ўнёс гомельскі навуковец А.М. Бабкоў, які перыядычна друкуе артыкулы па гэтай праблеме. Аўтар грунтоўна даследуе самыя розныя аспекты бежанства, шырока выкарыстоўвае дакументы з беларускіх і расійскіх архіваў, апублікаваных дарэвалюцыйных крыніц. Асобныя артыкулы ён прысвяціў агульнай характарыстыцы становішча бежанцаў у 1915–1916 гг. [4], становішчу бежанцаў на Гомельшчыне [7], у Віцебскай губерні [6, с. 349–352], а таксама праблеме рээвакуацыі бежанцаў [9]. А.М. Бабкоў закрануў дзейнасць усіх асноўных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам, а менавіта Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў, УЗС, УСГ, Таццянінскага камітэта, Галоўнаупаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў на франтах, іншых устаноў і асоб. Пры аналізе становішча пацярпеўшых ад вайны аўтар робіць акцэнт на адмоўных наступствах бежанства, разглядае лёс бежанцаў як трагедыю людзей [5; 8].

Пэўным аспектам гісторыі бежанства прысвяціў шэраг артыкулаў гродзенскі навуковец В.Р. Карнялюк. У 2001 г. ён абараніў дысертацыю на тэму «Фактары гісторыка-дэмаграфічных змен у складзе насельніцтва Беларусі ў 1913–1918 гг.», у якой назваў бежанства адным з такіх фактараў. В.Р. Карнялюк вызначыў колькасць бежанцаў з пяці заходніх губерняў у 1,2 млн чалавек. Аўтар размежаваў такія паняцці, як «бежанства» і «эвакуацыя». Апошняе ён вызначыў як вываз людзей пры пэўнай арганізацыі і кантролі, а бежанства – як сыход з месца жыхарства. В.Р. Карнялюк на



падставе вывучэння сацыяльнага статуса беларусаў-бежанцаў ва ўнутраных губернях Расійскай імперыі зрабіў выснову, што яны тут набылі маргінальныя рысы і гэта пэўным чынам садзейнічала росту іх нацыянальнай самасвядомасці [55–57].

У 2003 г. у Санкт-Пецярбургскім інстытуце гісторыі была абаронена дысертацыя В.С. Утгоф «Белорусские беженцы Первой мировой войны в 1914–1922 гг.» [145].

Побач з разглядам дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам непасрэдна ў Беларусі, важнай задачай з'яўляецца даследаванне гэтай справы ў розных рэгіёнах Расійскай імперыі, куды накіроўвалі бежанцаў. У 2004 г. у Маскве адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «Россия, мир накануне, в ходе и после Первой мировой войны по документам российских и зарубежных архивов», на якой В. Скалабан выступіў з паведамленнем «Белорусские беженцы Первой мировой войны: перспективы изучения» [132]. У час гэтага мерапрыемства была выказана прапанова аб выданні міжархіўнага даведніка, прысвечанага дзейнасці Беларускага таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны, што было рэалізавана сумеснымі намаганнямі архівістаў Мінска і Санкт-Пецярбурга ў 2008 г. [12, с. 3–8].

Такім чынам, нягледзячы на шырокі спектр даследаванняў праблематыкі бежанства ў апошнія дзесяцігоддзі, якой прысвечаны працы расійскіх і беларускіх гісторыкаў, значная частка пытанняў патрабуе далейшага вывучэння. Гэта датычыць і разгляду дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам, для чаго патрэбны глыбокі і крытычны аналіз крыніц.

Крыніцы, якія адлюстроўваюць гісторыю бежанства і ўсіх звязаных з ім аспектаў, можна падзяліць на некалькі груп: матэрыялы архіваў, дарэвалюцыйная перыёдыка, а таксама мемуары.

Бежанцы з Беларусі рассяліліся па ўсёй Расійскай імперыі – на еўрапейскай частцы, Каўказе, у Сібіры і Сярэдняй Азіі, а адтуль некаторыя аказаліся ў замежжы. Таму звесткі пра бежанцаў з Беларусі разгрупаваны ў архіўных матэрыялах не толькі Беларусі і Расіі, але і Прыбалтыкі, Украіны, Польшчы і далёкага замежжа [66].

У Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве ў Маскве (РДВГА) захоўваюцца дакументы, якія датычацца дзеянняў ваенных улад па высяленні насельніцтва і па арганізацыі апошняму дапамогі. У матэрыялах аддзялення цывільных спраў штаба Дзвінскай ваеннай акругі (ф. 1932) змешчаны звесткі пра бежанцаў з Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў. У дакументах ваенна-палітычнага і цывільнага ўпраўлення фонду штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага (ф. 2005) змешчаны загады армейскага камандавання, аналіз якіх паказвае супярэчлівасць і недапрацаванасць эвакуацыйных мерапрыемстваў, якія ажыццяўлялі ваенныя і цывільныя ўлады. У фондах канцылярыі галоўнага

начальніка забеспячэння армій Паўночна-Заходняга фронту і Заходняга фронту (ф. 2020, 2049) знаходзіцца шмат дакументаў пра самыя розныя аспекты бежанства – высяленне насельніцтва, накірункі руху бежанцаў, а таксама справаздачы прадстаўнікоў дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый. У фондзе Аддзела па ўладкаванні бежанцаў Усерасійскіх земскага і гарадскога саюза (ф. 13 273) адлюстраваны асноўныя напрамкі дзейнасці як гэтай арганізацыі, так і іншых таварыстваў у азначанай сферы, шмат дакументаў прысвечаны арганізацыі дапамогі бежанцам у Беларусі.

У Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Санкт-Пецярбургу (РДГА) захаваліся дакументы, якія ярка адлюстроўваюць аспекты ўрадавай палітыкі па забеспячэнні патрэб бежанцаў. У асноўным гэтыя матэрыялы сканцэнтраваны ў фондзе Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў (ф. 1322), якая з верасня 1915 г. была галоўнай каардынацыйнай установай у гэтай справе. У Санкт-Пецярбургу захоўваюцца пратаколы ўсіх пасяджэнняў Асобай нарады, спачатку як установы царскага, а потым Часовага ўрада. У РДГА захоўваюцца пастановы і распараджэнні, выдадзеныя гэтай установай, якія былі абавязковымі для выканання ўсімі губернскімі і гарадскімі ўладамі ў імперыі, у тым ліку і ў Беларусі. Адметнай рысай амаль усіх вышэйзгаданых дакументаў і матэрыялаў з'яўляецца адлюстраванне імі ў асноўным толькі праўрадавай пазіцыі ў дачыненні да шмат якіх спрэчных пытанняў адносна бежанства.

Напрыклад, аналіз загадаў ваенных улад аб прымусовым высяленні пацвярджае, што менавіта гэтая мера стала адным з асноўных штуршкоў да з'яўлення некантралюемай вялікай масы бежанцаў. Нягледзячы на ўпамінанне гэтых загадаў у афіцыйных крыніцах, бежанства тут тлумачылася выключна як вынік добраахвотных уцёкаў ад злачынстваў нямецкіх войскаў. Праз афіцыйныя дакументы РДГА таксама можна прасачыць тэндэнцыйнасць у адносінах імперскіх улад да бежанцаў нярускага паходжання і неправаслаўнага веравызнання. Гэта адносіцца перш за ўсё да немцаў-каланістаў, палякаў, галічан і яўрэяў, якіх высялялі ў глыб імперыі, у тым ліку праз Беларусь. Выключэнне складаюць дакументы перыяду праўлення Часовага ўрада, у якіх стаўленне да такіх бежанцаў было больш дэмакратычным. У РДГА захоўваецца шмат фінансавых дакументаў, якія адлюстроўваюць памеры грашовых сродкаў на забеспячэнне патрэб бежанцаў, што найбольш аб'ектыўна сведчыць аб рэальным узроўні клопату аб бежанцах. Фінансавыя дакументы з фонду Асобай нарады таксама змяшчаюць звесткі пра рэвізіі і кантроль фінансавых сродкаў, якія выдзяляліся на патрэбы бежанцаў.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску (НГАБ) захоўваецца шэраг фондаў, якія змяшчаюць матэрыялы аб становішчы бежанцаў у перыяд Першай сусветнай вайны. Пры гэтым сустракаюцца дакументы губернскіх і гарадскіх улад, што адлюстроўваюць афіцыйную ўрадавую пазіцыю, і матэрыялы грамадскіх і дабрачынных устаноў, якія расказваюць пра ўдзел апошніх у аказанні дапамогі бежанцам.



У НГАБ частка матэрыялаў пра бежанцаў знаходзіцца ў фондах канцылярый губернатараў – перш за ўсё Мінскага (ф. 295), у меншай ступені – Магілёўскага (ф. 2001) і Віцебскага (ф. 1430). Губернатары кіравалі на падначаленай тэрыторыі справай аказання дапамогі бежанцам, рэалізоўвалі пастановы ўрада на месцах. У ф. 295 захоўваюцца дакументы аб мерапрыемствах па аказанні дапамогі бежанцам: рапарты павятовых спраўнікаў аб высяленні і руху бежанцаў; матэрыялы і пратаколы губернскіх, павятовых і гарадскіх нарад па ўладкаванні бежанцаў; загады і распараджэнні ваенных і паліцэйскіх улад адносна бежанцаў; перапіска канцылярыі мінскага губернатара з камандаваннем Паўночна-Заходняга, а потым Заходняга фронту, з гарадскімі ўправамі і павятовымі прадвадзіцелямі дваранства аб арганізацыі руху бежанцаў; рашэнні аб адкрыцці харчовых і медыцынскіх пунктаў.

У дакументах канцылярыі магілёўскага губернатара звесткі пра бежанцаў нешматлікія – у асноўным спісы ці рэестры арганізацый па дапамозе бежанцам. Яшчэ меншая колькасць матэрыялаў пра бежанцаў у ф. 1430 – тут у асноўным матэрыялы пра эвакуацыю ўрадавых устаноў. Перад мясцовымі цывільнымі ўладамі стаяла задача скаардынаваць і накіраваць дзейнасць розных арганізацый, якія аказвалі дапамогу бежанцам.

Дзейнасці ўрадавых устаноў па забеспячэнні патрэб бежанцаў таксама прысвечаны матэрыялы ф. 2289, у якім адлюстраваны дзеянні Галоўнаўпаўнаважанага па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронту С.І. Зубчанінава, кіраваўшага сеткай дзяржаўных устаноў пад агульнай назвай «Поўначдапамога».

Недзяржаўныя арганізацыі праявілі павышаную цікавасць да ўдзелу ў аказанні дапамогі бежанцам. Дакументы з фондаў земскіх устаноў і гарадскіх самакіраванняў (ф. 1, 700, 2708) змяшчаюць звесткі пра дзейнасць мясцовых аддзяленняў УЗС і УСГ у Беларусі, арганізацыю харчовай і медыцынскай дапамогі бежанцам.

У ф. 511 знаходзяцца матэрыялы мясцовых аддзяленняў дабрачынных арганізацый, перш за ўсё Таццянінскага камітэта. Пры актыўнай падтрымцы ўлады мясцовыя аддзяленні Таццянінскага камітэта адкрываліся на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Адносіны паміж саюзамі і Таццянінскім камітэтам вызначаліся жорсткай канкурэнцыяй і барацьбой за сферы дзейнасці, напрыклад за права весці рэгістрацыю і ўлік бежанцаў.

Галоўнае адрозненне паміж афіцыйнымі дакументамі губернскіх улад і матэрыяламі дабрачынных арганізацый заключаецца ў пазіцыі стаўлення да беженцаў. Дабрачынныя арганізацыі ўспрымалі беженцаў перш за ўсё як пацярпеўшых ад вайны, якім патрабуецца дапамога. Дзяржаўныя ўстановы, не адмаўляючы іх клопату пра беженцаў, успрымалі апошніх і як пэўную абузу, што перашкаджала ўсталяванню сацыяльнай і эканамічнай стабільнасці ў рэгіёне.

Пэўныя звесткі аб дзейнасці Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва ў Мінску. У ф. 3 змешчана калекцыя дакументаў Беларускага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні, якая была перададзена Літоўскай Рэспублікай.

Каштоўныя звесткі змешчаны ў дарэвалюцыйных перыядычных выданнях. Праблема забеспячэння патрэб беженцаў адлюстроўвалася як у тых часопісах, якія з'яўляліся афіцыйнымі выданнямі розных установаў, так і цалкам прысвечаных беженцам. Сярод іх назавём: «Известия Всероссийского союза городов» (выходзілі ў 1914–1917 гг.), «Всероссийский земский союз. Известия Главного комитета» (выдаваліся ў 1914–1917 гг.), «Вестник Всероссийского общества попечения о беженцах» (выходзіў у 1915–1917 гг.), «Известия Комитета Её Императорского Высочества Великой Княжны Татьяны Николаевны» (1916–1917 гг.). Цалкам гісторыі і быту беженцаў быў прысвечаны ілюстраваны часопіс «Жизнь беженцев» (выходзіў у 1916 г.).

Асобную групу крыніц складаюць мемуары. Іх аўтары яскрава і выразна апісваюць падзеі, сучаснікамі якіх з'яўляліся, даюць ім цікавыя каментарыі [122; 139]. У той жа час змешчаная ў мемуарах інфармацыя з'яўляецца вынікам суб'ектыўных разважанняў аўтараў, таму яе аналіз патрабуе найбольш крытычнага падыходу. Цікавымі з'яўляюцца ўспаміны саміх беженцаў, якія даволі выразна і па-мастацку ярка апісваюць свае пакуты ў час вайны [31; 44; 63]. З мемуараў службовых асоб, у якіх узгадваюцца беженцы, адзначым успаміны М. Лемке «250 дней в царской ставке» [76], Ю.М. Данілава «На пути к крушению» [33]. Характэрна, што ўсе гэтыя вышэйшыя афіцэры царскай арміі вельмі адмоўна ацанілі высяленне мірнага насельніцтва і папярэджвалі (з іх слоў) аб адмоўных выніках гэтай справы.

Падсумоўваючы сказанае, можна зрабіць наступныя высновы. Цікавасць да вывучэння праблематыкі беженства назіралася ўжо ў гады Першай сусветнай вайны. Прадстаўнікі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, якія прымалі непасрэдны ўдзел у аказанні дапамогі беженцам, у нарысах і справаздачах далі сваю ацэнку гэтай з'яве. Праца па далейшым вывучэнні і сістэматызацыі гісторыі беженства была прыпынена рэвалюцыяй, пасля якой падобныя даследаванні не праводзіліся доўгі час.



У другой палове 50-х гг. ХХ ст. з'явіліся публікацыі, у якіх разглядаліся вузкія аспекты беженства ў кантэксце сацыяльна-эканамічнага крызісу Расійскай імперыі ў гады Першай сусветнай вайны. Савецкія гісторыкі, зыходзячы з марксісцкіх пазіцый і кіруючыся класавым падыходам, акцэнтавалі ўвагу на эксплуатацыі працы беженцаў у прамысловасці і сельскай гаспадарцы (працы І.В. Маеўскага, А.М. Анфімава і інш.), а пра дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі гэтай катэгорыі пацярпеўшых ад вайны амаль не ўзгадвалі. Фактычна савецкая гістарыяграфія выкарыстоўвала разгляд цяжкага становішча беженцаў для негатыўнай характарыстыкі адносін дарэвалюцыйных органаў улады да мірнага насельніцтва ў час вайны. Толькі ў 1985 г. прызналі факт (і не болей) існавання карыснай дапамогі беженцам з боку дзяржаўных і дабрачынных арганізацый, прычым была зроблена спроба прааналізаваць адносіны паміж апошнімі (манаграфія Т.М. Кітанінай).

Беларуская гістарыяграфія ў савецкі час таксама практычна не праводзіла даследаванняў па гісторыі беженства. Некаторыя аўтары эпізадычна ўзгадвалі беженства для адмоўнай характарыстыкі дасавецкіх органаў улады (манаграфіі Т.Я. Саладкова, Э.М. Савіцкага). Пры гэтым колькасць крыніц, выкарыстаных у даследаваннях, была абмежаванай. Адзінкавымі аказаліся выпадкі, калі пры даследаванні жыцця і працы вядомых беларускіх дзеячаў станоўча апісвалася дзейнасць дабрачынных установаў (нарысы В. Скалабана).

Тэндэнцыйнасць савецкіх гісторыкаў пры разглядзе перыяду Першай сусветнай вайны перашкодзіла ім правесці аб'ектыўнае даследаванне беженства. Больш станоўчыя вынікі былі дасягнуты ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст., калі даследчыкі ў большасці пачалі адмаўляцца ад класавых падыходаў. Сучасная расійская і замежная гістарыяграфія пры вывучэнні гісторыі беженства ў Расійскай імперыі акцэнтуе ўвагу на наступных аспектах: дэпартацыя прадстаўнікоў «нядобранадзейных» народаў, а менавіта немцаў (артыкул С.Г. Неліповіча) і яўрэяў (артыкул Г.З. Іофе); напрамкі руху беженцаў і іх жыццё на новым месцы жыхарства, а таксама аказанне ім дапамогі (артыкулы А.Н. Курцава); палавы і сацыяльны склад беженцаў (працы П. Гетрэла).

Сучасныя беларускія гісторыкі пры вывучэнні беженства характарызуюць гэтую з'яву як сапраўдную катастрофу беларускага народа. Разгляду розных аспектаў беженства прысвечаны працы А.М. Бабкова, В. Скалабана, В.Р. Карнелюка і інш.

# ГЛАВА 2 ЭВАКУАЦЫЙНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ВАЕННЫХ І ЦЫВІЛЬНЫХ УЛАД У БЕЛАРУСІ

Спецыфіка і асаблівасць умоў, у якіх разгортвалася дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у гады Першай сусветнай вайны, вызначалася пэўным двоеўладдзем у заходніх губернях, у тым ліку і ў Беларусі. Апошняе ўсталявалася з пачаткам дзеяння «Палажэння аб палявым кіраванні войск у ваенны час». Яно аўтаматычна ўводзілася з абвяшчэннем мабілізацыі, якая пачала праводзіцца з ліпеня 1914 г.

У «Палажэнні аб палявым кіраванні войск у ваенны час» Вярхоўны Галоўнакамандуючы (з 20 ліпеня 1914 г. па 23 жніўня 1915 г. гэту пасаду займаў вялікі князь Мікалай Мікалаевіч, а потым імператар Мікалай II) абвяшчаўся вышэйшым начальнікам усіх узброеных сіл. Ён атрымліваў надзвычайную ўладу і яго загады павінны былі выконвацца на тэатры ваенных дзеянняў усімі ўрадавымі ўстановамі і цывільнымі кіраўніцтвамі, а таксама службовымі асобамі ўсіх ведамстваў і ўсім насельніцтвам як найвышэйшыя загады (арт. 17 указанага Палажэння). Артыкулам 91 надзвычайнымі паўнамоцтвамі надзяляліся галоўнакамандуючыя франтоў. Іх распараджэнні павінны былі выконвацца ў межах падначаленага раёна ўсімі ўрадавымі і цывільнымі ўстановамі, службовымі асобамі і ўвогуле ўсім насельніцтвам [76, с. 43, 48; 124, с. 112–115].

Згодна з арт. 14 «Палажэння аб палявым кіраванні войск у ваенны час» усе мясцовасці і цывільныя кіраванні тэатра ваенных дзеянняў з абвяшчэннем мабілізацыі падпарадкоўваліся галоўным начальнікам адпаведных ваенных акруг ці ваенным генерал-губернатарам. Пры гэтым у мясцовасцях, абвешчаных на ваенным становішчы, узаемаадносіны цывільных і ваенных улад вызначаліся «Правіламі аб мясцовасцях, якія абвешчаны на ваенным становішчы» [76, с. 42; 124, с. 112–115]. Гэтым дакументам ваенным уладам, а таксама генерал-губернатарам прадастаўлялася права прымаць надзвычайныя меры па забеспячэнні паспяховага вядзення баявых дзеянняў, папярэджанні парушэнняў дзяржаўнай бяспекі і грамадскага парадку. У выніку цывільныя ўлады і мясцовае насельніцтва былі фактычна перападпарадкаваны армейскаму камандаванню, гэта значыць у тэатры ваенных дзеянняў усталявалася пэўнае двоеўладдзе.

Ваенныя ўлады ў поўнай меры выкарысталі сваё права распараджацца жыццём і лёсам мірнага насельніцтва Беларусі,



высяляючы і перамяшчаючы яго з пастаяннага месца жыхарства ў глыб імперыі. Вынік – ператварэнне мірных жыхароў у бежанцаў. У ваенны час умовы жыцця на франтавых і прыфрантавых тэрыторыях таксама садзейнічалі імкненню насельніцтва кіравацца ў больш бяспечныя раёны Расійскай імперыі.

Сярод вялікай масы бежанцаў умоўна можна вызначыць некалькі катэгорый. Першая – дзяржаўныя чыноўнікі, служачыя, іх сем'і, праваслаўныя святары, эвакуацыю якіх забяспечвала дзяржава. Другая катэгорыя – прымусова выселеныя загадамі ваенных і цывільных улад мірныя жыхары. Апошнія складаюцца з дзвюх вялікіх груп насельніцтва. З аднаго боку, гэта дэпартыраваныя прадстаўнікі нядобранадзейных (з пункту гледжання царскага ўрада) нацыянальнасцей – немцы, яўрэі, палякі, галічане і інш., а з другога – жыхары заходніх губерняў ваеннаабавязанага ўзросту і ўвогуле ўсё насельніцтва, высяленне якога ўлады палічылі неабходным ці патрэбным у сувязі з ваенным часам. Трэцюю катэгорыю бежанцаў складалі мірныя жыхары, якія з-за блізкасці фронту і звязанымі з гэтым умовамі жыцця па ўласнай ініцыятыве пакінулі свой дом і накіраваліся ва ўнутраныя губерні імперыі [71].

Эвакуацыя дзяржаўных служачых і іх сем'яў ажыццяўлялася на падставе шэрагу палажэнняў, прынятых у другой палове 1914 г. 17 ліпеня 1914 г. начальнікам штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага было зацверджана «Палажэнне аб вывазе за кошт казны па ваенных абставінах дзяржаўнай маёмасці, урадавых устаноў, служачых і іх сем'яў» [93, спр. 48 720, арк. 3]. 20 жніўня 1914 г. урадам было зацверджана «Часовае палажэнне аб вывазе за кошт казны па ваенных абставінах дзяржаўнай маёмасці, урадавых устаноў, служачых і іх сем'яў», якое фактычна дубліравала артыкулы палажэння ад 17 ліпеня і стала асноўным дакументам, на падставе якога ваенныя і цывільныя ўлады ажыццяўлялі эвакуацыю ўрадавых устаноў і іх служачых.

Згодна з арт. 1 «Часовага палажэння аб вывазе за кошт казны па ваенных абставінах дзяржаўнай маёмасці, урадавых устаноў, служачых і іх сем'яў» ад 20 жніўня, «вываз па ваенных абставінах у глыб імперыі з цытадэльных і ўмацаваных раёнаў, якім пагражае нашэсце праціўніка, дзяржаўнай маёмасці, урадавых устаноў і асоб, якія знаходзяцца ў гэтых раёнах ці мясцовасцях на службе ўрада... а таксама іх сем'яў, адбываецца не інакш як па распараджэнні камандуючага войскамі акругі, галоўнакамандуючага і камандуючага асобнай арміяй, камандуючых флотам і камендантаў крэпасцей» [110, с. 1]. Артыкул 2 гэтага дакумента абвяшчаў, што абавязковаму вывазу падлягаюць народныя святыні, прадметы найбольш каштоўныя ў дзяржаўных адносінах і ўвогуле ўсё, што можа стаць трафеем праціўніка. Прадметы і парадак вывазу

(арт. 3 «Часовага палажэння» ад 20 жніўня 1914 г.) павінны былі абапірацца на мабілізацыйныя планы і прыватныя правілы кожнага міністэрства. Усе расходы павінны былі ажыццяўляцца за кошт казны [110, с. 1].

Выключная ўвага з боку дзяржавы да бяспекі дзяржаўных служачых і іх сем'яў пацвярджаецца тым, што толькі чыноўнікаў, служачых, іх сем'і і праваслаўных святароў эвакуіравалі па своечасова распрацаваных палажэннях. Высяленне астатніх катэгорый насельніцтва адбывалася на падставе загадаў і распараджэнняў, выдадзеных непасрэдна пры правядзенні эвакуацыйных мерапрыемстваў.

Баявыя дзеянні на рускім фронце ў другой палове 1914 г. адбываліся з пераменным поспехам, перыядычна ўзнікала пагроза для заходніх губерняў. Таму ўлады эвакуіравалі чыноўнікаў і іх сем'і ў бліжэйшыя гарады і мясцовасці, каб пасля вызвалення тэрыторыі ад праціўніка зноў вярнуць іх на месца службы [65, с. 100].

Бліжэй да вясны 1915 г. эвакуіраванае чыноўніцтва месяцамі блукала па прыфрантавых гарадах, пераходзячы з аднаго горада ў другі па меры захопу іх праціўнікам. Асабліва складаным было становішча ніжэйшых служачых, якія фактычна апынуліся перад пагрозай стаць жабракамі, таму што па некалькі месяцаў не атрымлівалі зарплату і жылі на невялікую грашовую дапамогу [64, с. 131].

Па прычыне вялікіх расходаў на эвакуацыю Савет Міністраў 16 снежня 1914 г. зацвердзіў некаторыя дапаўненні да «Часовага палажэння аб вывазе за кошт казны па ваенных абставінах дзяржаўнай маёмасці, урадавых устаноў, служачых і іх сем'яў» ад 20 жніўня 1914 г., якія павінны былі ўпарадкаваць і абмежаваць гэты працэс. У прыватнасці, было зроблена ўдакладненне, што падставай для вывазу ўрадавых устаноў, служачых і іх сем'яў павінен служыць не дазвол, а пэўнае распараджэнне адпаведных ваенных улад [111, с. 1]. Чыноўнікі і іх сем'і, эвакуіраваныя з губерняў Царства Польскага і прыбалтыйскага краю, траплялі ў тым ліку і ў Беларусь. Непасрэдна з апошняй эвакуацыяй урадавых устаноў і іх служачых адбывалася пад пагрозай наступлення праціўніка вясной – восенню 1915 г.

У час эвакуацыі ўстаноў Віленскай і Віцебскай губерняў ваенныя ўлады патрабавалі ад губернатараў арганізаваць справу такім чынам, каб да апошняга заставаліся паштовыя і тэлеграфныя ўстановы. Паліцэйскія ўлады павінны былі сыходзіць разам з войскамі. Як паказаў вопыт, у населеных пунктах з сыходам паліцыі пачыналіся п'янства і рабаванні [93, спр. 48 720, арк. 23, 128].

Непаслядоўна адбывалася эвакуацыя стратэгічна важных Гродзенскай і Брэст-Літоўскай крэпасцей. Адначасова з загадам эвакуіраваць Гродзенскую крэпасць выйшла распараджэнне ўмацаваць і забяспечыць баявымі запасамі Брэст-Літоўскую крэпасць. Калі стала вядома пра падзенне Новагеоргіеўскай крэпасці, ваенныя ўлады пачалі экстранную эвакуацыю Брэст-Літоўскай крэпасці [4, с. 131].



У жніўні 1915 г. па загадзе галоўнага начальніка Дзвінскай ваеннай акругі пачалася эвакуацыя ўрадавых служачых і іх сем'яў са стовярстовай паласы ад лініі баявых дзеянняў. У пачатку верасня ён жа распарадзіўся эвакуіраваць усіх чыноўнікаў і іх сем'і з такіх гарадоў, як Лепель, Полацк і Дрысы (на падставе «Часовага палажэння аб вывазе за кошт казны па ваенных абставінах дзяржаўнай маёмасці, урадавых устаноў, служачых і іх сем'яў» ад 20 жніўня 1914 г.) [93, спр. 48 720, арк. 195, 220, 226]. Эвакуіраваныя ўстановы з заходніх губерняў накіроўвалі ў самыя розныя гарады і мясцовасці Расійскай імперыі. Напрыклад, з Віленскай губерні акружны суд быў эвакуіраваны ў Старадуб Чарнігаўскай губерні, губернскае кіраванне – у Тулу, кантрольная палата – у Цвер, казначэйствы – у Тамбоў, а губернатар пераехаў у Дзісну [19, № 1, с. 15].

Шмат у якіх выпадках эвакуацыя дзяржаўных служачых ператваралася ў хаатычныя ўцёкі. Як згадваў у адным са сваіх дакладаў Галоўнаўпаўнаважаны па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронту, мясцовай адміністрацыі было дазволена эвакуіравацца раней за асноўную масу насельніцтва, таму «...некаторыя губернатары выязджалі раней за павятовых начальнікаў, павятовыя начальнікі – раней чым ніжэйшыя чыны паліцыі. Уся гэта армія рассыпалася па ўсёй Расіі, сядзела без справы ў той час, калі стомленыя і разбітыя, збітыя з панталыку мірныя жыхары гразлі ў пінскіх балотах» [119, спр. 438, арк. 209].

Дзеянні часткі святароў таксама не садзейнічалі заспакоенасці насельніцтва ў час эвакуацыі. Камісія па задавальненні духоўных патрэбнасцей бежанцаў пры Асобай нарадзе па ўладкаванні іх у спецыяльным дакладзе адзначыла, што шмат у якіх мясцовасцях святары рухаліся з месца раней за прыхаджан [121, спр. 1, арк. 64].

Адступленне рускай арміі і страта часткі заходніх губерняў летам – восенню 1915 г. ператварылі эвакуацыю дзяржаўных устаноў, прадпрыемстваў і іх служачых у асабліва важную праблему для ўлад Расійскай імперыі. Эвакуацыя органаў дзяржаўнай улады прывяла да разбурэння сістэмы адміністрацыйнага кіравання адпаведных тэрыторый. У рамках Асобай нарады для абмеркавання і аб'яднання мерапрыемстваў па абароне дзяржавы ў кастрычніку 1915 г. была створана Эвакуацыйная камісія з мэтай упарадкавання і ўдасканалення працэдуры эвакуацыі важных з дзяржаўнага пункту гледжання ўстаноў і прадпрыемстваў (якія працуюць на абарону) з паласы, якой пагражае нашэсце праціўніка. Гэта эвакуацыйная камісія ажыццяўляла

вышэйшы нагляд за дзейнасцю мясцовых камісій па эвакуацыі [41, с. 35–36]. Апошнія дзейнічалі на падставе спецыяльна распрацаванага «Палажэння аб камісіях па эвакуацыі». Згодна з яго артыкулам па распараджэнні старшыні Асобай нарады для абмеркавання і аб'яднання мерапрыемстваў па абароне дзяржавы і па ўзгадненні са штабам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ўтвараліся асобыя раённыя камісіі. Апошнія фарміраваліся як у мясцовасцях, адкуль праводзілася эвакуацыя, так і ў месцах, куды ажыццяўлялася перавозка [41, с. 36–41]. Шэраг эвакуацыйных камісій дзейнічалі ў Беларусі. Напрыклад, восенню 1915 г. працавала камісія па эвакуацыі Мінска.

Самую значную катэгорыю бежанцаў складала насельніцтва, якое было дэпарціравана ці выселена па загадах ваенных і цывільных улад. Дэпартацыя прадстаўнікоў асобных нацыянальнасцей Расійскай імперыі адбывалася напярэдадні і з пачаткам вайны. Армейскае камандаванне палічыла немцаў, яўрэяў, чэхаў і палякаў здольнымі да здрады. Таму з ліпеня 1914 г. паліцыя, апарат галоўных начальнікаў забеспячэння франтоў, галоўныя начальнікі ваенных акруг, мясцовыя брыгады і павятовыя военачальнікі пачалі арыштоўваць германскіх і аўстра-венгерскіх падданых і пад аховай высылаць іх далёка ў глыб імперыі [100, с. 32–33].

Улады Расійскай імперыі варожа ставіліся не толькі да мужчын так званых «нядобранадзейных народаў», але да жанчын і дзяцей. Прыблізна з 700 чалавек, якія ў пачатку жніўня 1914 г. былі інтэрніраваны з Ковеля ў Віцебск, толькі 61 аказаліся мужчынамі ваеннаабавязанага ўзросту, а 677 – старыя, жанчыны і дзеці. Падобнае паўтарылася ў Беластоцкім павеце, дзе па загадзе Гродзенскага генерал-губернатара І.А. Шабекі былі высланы 2053 германскія падданыя, з іх арышту падлягалі 473 ваеннаабавязаныя мужчыны [100, с. 34].

Праследаванне па нацыянальнай прыкмеце працягвалася восенню – зімой 1914 г. Армейскае камандаванне лічыла неабходным узмацніць назіранне за тымі, хто пазбегнуў высылкі, і заахвочвала грашовымі прэміямі добраахвотна сачыўшых за паводзінамі прадстаўнікоў «нядобранадзейных народаў». Падданых ваюючых з Расіяй дзяржаў абвінавачвалі не толькі ў шпіянажы, на іх фактычна ўсклалі адказнасць за жорсткасць германскіх і аўстрыйскіх войскаў [100, с. 35].

Адзначым, што ў кастрычніку 1914 г. вялікі князь Мікалай Мікалаевіч накіраваў старшыні Савета Міністраў І.Л. Гарамыкіну тэлеграму, у якой патрабаваў абвясціць усіх падданых дзяржаў, якія ваявалі з Расіяй, ваеннапалоннымі. І.Л. Гарамыкін у тэлеграме ў адказ паведаміў, што прыраўноўванне ўсіх «непрыяцельскіх падданых» да ваеннапалонных і іх перамяшчэнне ў аддаленыя мясцовасці выклікае вельмі вялікія расходы для казны



па перавозцы, уладкаванні і харчаванні гэтых людзей. Пры гэтым Старшыня Савета Міністраў пацвердзіў, што па прыгаворы адпаведных улад «непрыяцельскія падданыя» могуць быць высланы ў аддаленыя губерні [100, с. 35]. Расійскі гісторык С.Г. Неліповіч пры аналізе гэтай перапіскі падкрэслівае, што падобны зварот Старшыні Савета Міністраў да асобы, якая фактычна мела ніжэйшы ранг, і ўвогуле разгляд урадам гэтай тэлеграмы сведчыць, што цывільныя ўлады залежалі ад ваеннага камандавання [100, с. 37].

У 1915 г. і далейшыя гады вайны арышты, высяленне немцаў і прадстаўнікоў іншых «нядобранадзейных народаў» у аддаленыя губерні працягваліся. Асабліва гэты працэс узмацніўся ў час адступлення рускай арміі летам – восенню 1915 г. Высяляць пачалі немцаў рускага падданства, так званых немцаў-каланістаў. 26 чэрвеня 1915 г. галоўны начальнік забеспячэння армій Паўночна-Заходняга фронту генерал М.А. Данілаў загадаў генералам і губернатарам: усе немцы-каланісты без розніцы полу і ўзросту павінны выехаць з франтавых губерняў (у тым ліку Гродзенскай) у мясцовасці па іх выбару, якія размешчаны па-за межамі тэатра ваенных дзеянняў і не знаходзяцца на ваенным становішчы [119, спр. 453, арк. 1].

Пэўная колькасць немцаў-каланістаў рухалася транзітам цераз Беларусь. 2 чэрвеня 1915 г. рэчыцкі спраўнік дакладваў мінскаму губернатару, што з Мазыра на Рэчыцу невялікімі партыямі, па чыгунцы і грунтавымі шляхамі, перапраўляліся немцы-каланісты [88, спр. 8982, арк. 1]. У канцы чэрвеня з Кобрына цераз Пінск, Мазыр і Рэчыцу ў Магілёўскую губерню было накіравана каля 35 тыс. нямецкіх і аўстрыйскіх каланістаў [88, спр. 9031, арк. 8; 13; 17]. У ліпені немцаў-каланістаў партыямі прыкладна па адной тысячы чалавек перавозілі са Слуцка ў Бабруйск, адтуль – у Рагачоў ці Гомель. Клопат аб медыцынскай і харчовай дапамозе пры руху каланістаў быў ускладзены на земствы. У гэтай справе апошнім павінны былі садзейнічаць мясцовыя паліцыя і адміністрацыя, аднак яны не заўсёды аказвалі патрэбную дапамогу пры руху каланістаў. 12 ліпеня 1915 г. бабруйскі павятовы спраўнік атрымаў загад ад віцэ-губернатара даследаваць факты ўхілення сельскіх улад ад аказання садзейнічання пры перавозцы каланістаў і выправіць выяўленыя недахопы [88, спр. 8989, арк. 18, 20, 27].

28 ліпеня 1915 г. пад старшынствам мінскага губернатара адбылася асобая нарада па пытанні стварэння ўрачэбна-харчовых пунктаў на шляху руху немцаў-каланістаў. Іх асноўны маршрут праходзіў цераз Пінскі, Рэчыцкі і Мазырскі паветы, ахопленыя эпідэміяй халеры. Таму медыцынскай і харчовай дапамогі з боку мясцовых земстваў было недастаткова. Нарада вырашыла ўскласці клопат пра немцаў-каланістаў на шляху ад

Пінска да Мазыра – Калінкавіч на УСГ, ад Мазыра – Калінкавіч да Магілёўскай губерні – на УЗС [88, спр. 9028, арк. 16].

Аб'ём дзяржаўнай дапамогі немцам-каланістам быў мінімальны. Першапачаткова яны атрымлівалі субсідыі ад Дэпартамента паліцыі, потым сродкі ім выдзяляліся па бежанскім каштарысе. Памеры дапамогі паступова скарачаліся, а потым выдача грашовых сродкаў немцам-каланістам была спынена, палічыўшы, што яны ўяўляюць сабой забяспечаную катэгорыю насельніцтва. Аднак ужо з лютага 1917 г. у Асобую нараду па ўладкаванні бежанцаў пачалі паступаць звесткі аб бядотным становішчы і шматлікіх захворваннях сярод немцаў-каланістаў. Ім зноў сталі выдаваць субсідыі, але ў мінімальным аб'ёме [91, спр. 229, арк. 56].

Усяго згодна з рапартам этапна-перасылачнай часці Галоўнага штаба ў 1914 г. было перавезена ў аддаленыя губерні 68 тыс. інтэрніраваных, у 1915 г. – 134 тыс., у 1916 – 41 278, у 1917 – 11 511 чалавек [100, с. 41].

Улады Расійскай імперыі таксама праводзілі рэпрэсіўныя мерапрыемствы (арыштоўвалі, высылалі, бралі ў заложнікі) супраць яўрэяў. Кіруючыя колы Расіі падазравалі яўрэяў у сімпатыях да праціўніка [53, с. 87]. Таму ўжо ў першыя месяцы вайны пачаліся арышты і высылка асобных катэгорый яўрэйскага насельніцтва. Адзін з ініцыятараў масавага высялення яўрэяў з Галіцыі і заходніх губерняў – начальнік штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага М.М. Янушкевіч, вядомы сваімі антысеміцкімі поглядамі. Спачатку дзесяткі, а потым і сотні тысяч яўрэяў атрымалі пад пагрозай смяротнай кары прадпісанне ў 24 гадзіны выселіцца ў мясцовасці, аддаленыя ад тэатра ваенных дзеянняў [103, с. 477].

У пачатку 1915 г. генерал М.А. Данілаў накіраваў у армію паведамленне, што цар загадаў спыніць пагалоўнае высяленне яўрэйскіх сем'яў з месцаў пастаяннага жыхарства. Разам з тым Вярхоўны Галоўнакамандуючы палічыў неабходным браць заложнікаў з ліку рабінаў і заможных яўрэяў [118, спр. 124, арк. 17, 28]. 30 ліпеня 1915 г. галоўнакамандуючы арміямі Паўночна-Заходняга фронту генерал М.В. Аляксееў зацвердзіў правілы высялення яўрэяў з вайсковых раёнаў Паўночна-Заходняга фронту па патрабаванні камандуючых арміямі. Згодна з гэтым дакументам яўрэі да 14 гадоў і старэйшыя за 60 высяленню не падлягалі. Астатнія заставаліся на месцы свайго жыхарства пры ўмове паручыцельства за іх прадстаўнікоў абшчыны (па выбару губернатара). Яны выступалі ў якасці заложнікаў [93, спр. 49 128, арк. 1, 15, 23].

Асноўную масу бежанцаў складалі мірныя жыхары заходніх губерняў, якіх ваенныя ўлады непасрэдна ці апасродкавана прымусілі выехаць у глыб імперыі. Згодна з данымі Аб'яднанага аддзела па ўладкаванні бежанцаў пры ЗемГоры на лета 1916 г. з усіх зарэгістраваных на той час у імперыі бежанцаў з Гродзен-



скай губерні было 30,6 %, Мінскай – 4,82 %, Віленскай – 4,12 %, з Віцебскай – 1,47 %, усяго каля 42 % ад 100 % зарэгістраваных чалавек [26, № 43–44, с. 121].

Прычына, па якой высялялася насельніцтва заходніх губерняў, звязана з распрацаванай армейскім камандаваннем тактыкай «выпаленай зямлі». Расійскае ваеннае кіраўніцтва вырашыла стварыць у якасці перашкоды мнагавёрстую паласу змярцвення, з якой павінны былі выселіць жыхароў і знішчыць усю маёмасць. Гэта рабілася для таго, каб спыніць паспяховае нямецкае наступленне ў канцы вясны – летам 1915 г. і пазбавіць праціўніка магчымасці атрымаць значныя трафеі.

З ініцыятывай масавага высялення мірных жыхароў у глыб імперыі выступіла камандаванне Паўднёва-Заходняга фронту. 24 мая 1915 г. галоўны начальнік забеспячэння армій апошняга распарадзіўся адначасова з адыходам войск выводзіць усё мужчынскае насельніцтва ад 18 да 50 гадоў. 6 чэрвеня галоўнакамандуючы арміямі Паўднёва-Заходняга фронту М.І. Іваноў загадаў «прыняць экстранныя меры ўсімі магчымымі спосабамі ўсяму насельніцтву прапаноўваць адпраўляцца ў тыл па меры адходу нашых войск». Было загадана таксама вывозіць ці знішчаць прадукты і маёмасць. Генерал М.І. Іваноў прапаноўваў выселеных мужчын і жанчын заклікаць да працы, а іх сем'ям выдаваць паёк. Усе клопаты па забеспячэнні патрэб бежанцаў галоўнакамандуючы арміямі Паўднёва-Заходняга фронту ўсклаў на губернатараў [117, спр. 40, арк. 6].

Свае дзеянні ваеннае камандаванне тлумачыла тым, што немцы ў захопленых губернях прымусова выкарыстоўваюць працу і службу мірных жыхароў на карысць сваіх войск [117, спр. 40, арк. 1–2]. Гэтыя рашэнні сведчаць аб недаверы ваенных улад насельніцтву заходніх губерняў. Фактычна дзяржава лічыла не толькі немцаў-каланістаў і яўрэяў, але рускіх, беларусаў і ўкраінцаў з заходніх губерняў здольнымі да здрады інтарэсам імперыі. Эвакуацыя ці знішчэнне маёмасці, матэрыяльных рэчаў і прадуктаў харчавання таксама тлумачыліся свавольствам праціўніка. Начальнік штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага М.М. Янушкевіч указваў, што ўсе запасы неабходна вывозіць, а потым «лягчэй будзе зноў забяспечыць насельніцтва пры наступленні, але не пакідаць праціўніку, які ўсё роўна адбярэ» [117, спр. 40, арк. 12].

Меры генерала М.І. Іванова па высылцы насельніцтва былі адобраны М.М. Янушкевічам [117, спр. 40, арк. 20]. Больш таго, апошні тэлеграмай № 1443 ад 10 чэрвеня загадаў камандаванню абодвух франтоў «мужчынскае насельніцтва, акрамя жыдоў, высяляць у тыл» [117, спр. 40, арк. 12]. Прымусова выселенае мужчынскае насельніцтва ваеннаабавязанага ўзросту рухалася ў глыб імперыі, забіраючы з сабою сем'і. У выніку ўтвараліся

вялізныя масы людзей, забеспячэнне якіх пры транспартаванні аказалася вострай праблемай для ўлад. Таму 19 чэрвеня 1915 г. галоўны начальнік забеспячэння армій Паўночна-Заходняга фронту М.А. Данілаў перадаў загад генерала М.В. Аляксеева: каб не зрываць з месца жанчын і дзяцей, мужчын 18–45 гадоў заклікаць да прымусовай працы ў працоўных камандах. Армейскае камандаванне разлічвала аддаліць мужчын ад іх сем'яў, а потым накіраваць ваеннаабавязаных у складзе працоўных каманд у глыб імперыі [118, спр. 131, арк. 211–219].

Прымусовыя дзеянні армейскага камандавання выклікалі актыўны пратэст з боку насельніцтва і палітычна актыўнай яго часткі. Прадстаўнікі ўсіх саслоўяў заходніх губерняў – ад сялян да памешчыкаў – накіроўвалі ў Дзяржаўную Думу, Дзяржаўны Савет, Савет Міністраў, Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму і нават цару шматлікія звароты з пратэстамі супраць самавольства армейскіх чыноў [117, спр. 40, арк. 70, 81, 85; 119, спр. 402, арк. 41; 121, спр. 30, арк. 22]. У Стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага (далей – Стаўка) прыбылі гофмайстар А.Б. Нейдгард, граф Веляпольскі, якія паведамілі аб знішчэнні цэлых паселішчаў, бессістэмнасці эвакуацыйных распараджэнняў і аб тым, што насельніцтва ўспрымае ажыццяўляемыя меры як рэпрэсіўныя [119, спр. 428, арк. 44].

Пасля іх візіту Вярхоўны Галоўнакамандуючы 22 чэрвеня 1915 г. выдаў тэлеграмай № 1741 загад: не высяляць пагалоўна насельніцтва з месца жыхарства [119, спр. 428, арк. 44 ]. У сваіх мемуарах афіцэр Стаўкі М. Лемке выразна пракаменціраваў гэты выпадак: «Праз год пасля пачатку вайны Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму вочы адкрылі два зацікаўленыя магнаты – да гэтага часу ён і не ўяўляў жахаў вайны пад сваім кіраўніцтвам» [76, с. 265–266].

Галоўнакамандуючы арміямі Паўночна-Заходняга фронту генерал М.В. Аляксееў для выканання патрабавання, змешчанага ў тэлеграме № 1741, выдаў загад не зрываць насельніцтва пагалоўна з месцаў, а толькі мужчын ваеннаабавязанага ўзросту, якіх неабходна заклікаць да працы. Насельніцтва, якое заставалася, павінна было забяспечвацца запасамі харчавання на пэўны тэрмін (адзін месяц). Генерал М.В. Аляксееў прапанаваў максімальна шырока заклікаць цывільныя ўлады выконваць эвакуацыйныя меры [117, спр. 40, арк. 55].

З мэтай вырашэння супярэчнасцей пры ажыццяўленні эвакуацыі 23 чэрвеня 1915 г. у Стаўцы пад старшынствам М.М. Янушкевіча, з удзелам вышэйшага армейскага камандавання адбылася Асобая нарада аб мерах пры ачышчэнні войскамі некаторых мясцовасцей Паўднёва- і Паўночна-Заходняга франтоў. Нарада прыняла рашэнне: абавязковаму высяленню падлягаюць толькі немцы-каланісты. Адносна астатніх катэгорый насельніцтва вырашылі, што галічанам рускага паходжання, польскаму і карэннаму рускаму насельніцтву (меліся на ўвазе таксама праваслаўныя беларусы і ўкраінцы), калі яны пажадаюць пакінуць месца пастаяннага жыхарства, улады павінны аказваць «усялякае садзейнічанне» і прадастаўляць бясплатны праезд па чыгунцы [42, с. 16–17].



Асобая нарада ад 23 чэрвеня таксама палічыла правільным ускласці на МУС клопат аб далейшым руху бежанцаў і пошуках імі працы. Яўрэяў вырашылі пакінуць на месцы. Прымусовае прыцягванне мужчын у працоўныя роты было вырашана замяніць стварэннем добраахвотных каманд, удзельнікі якіх на час працы вызваляліся ад ваеннай службы [42, с. 17–19]. Як паказаў час, насельніцтва не сустрэла з энтузіязмам заклік уступаць у добраахвотныя каманды, і надзея такім чынам вывезці мужчынскае насельніцтва ў глыб імперыі не спраўдзілася.

24 чэрвеня 1915 г. Вярхоўны Галоўнакамандуючы зацвердзіў рашэнні Асобай нарады ад 23 чэрвеня як кіраўніцтва да дзеяння. Паколькі паведамленні аб бясчынствах армейскіх чыноў у дачыненні да мірных жыхароў працягвалі паступаць у Стаўку, 26 чэрвеня Вярхоўны Галоўнакамандуючы выдаў загад № 523. У ім прызнаваліся факты здзекаў вайскоўцаў з насельніцтва, таму было вырашана «неадступна і неадкладна прыняць меры да спынення ў адносінах да мясцовага насельніцтва і яго маёмасці насілля». Знішчэнне маёмасці дапускалася толькі ў сувязі з патрабаваннем ваеннага становішча [117, спр. 40, арк. 36].

Загад № 523 не вырашыў праблем, выкліканых прымусовым высяленнем насельніцтва. У больш позніх тлумачэннях да яго ўдакладнялася, што забараняецца толькі самавольнае высяленне жыхароў, а ваеннаабавязаных мужчын можна і неабходна высяляць. Дзеянні армейскага камандавання былі нескаардынаванымі. Стаўка вырашыла не высяляць насельніцтва, а камандаванне 3-й і 10-й армій амаль усё мірнае насельніцтва з тэрыторый сваёй дыслакацыі перамясціла ў Кобрынскі і Пружанскі паветы [117, спр. 42, арк. 172–173].

У ліпені 1915 г. вышэйшае камандаванне працягвала супярэчлівую, нават незразумелую армейскаму кіраўніцтву эвакуацыйную палітыку. Галоўны начальнік забеспячэння армій Паўночна-Заходняга фронту ў тэлеграме № 5934 паведамляў, што начальнікі карпусным камандзірам ўключна, якія дапускаюць выгнанне насельніцтва з месцаў яго жыхарства, будуць неадкладна пазбаўлены камандзірскіх пасад [119, спр. 428, арк. 117]. У тым жа ліпені Стаўка зноў звярнулася да практыкі ачышчэння мясцовасцей на вузкіх участках фронту. Адбывалася высяленне насельніцтва з прынёманскай берагавой паласы, а потым – з-за р. Дубісы. У хуткім часе з'явіліся паведамленні: «…высяляецца пагалоўна ўсё мясцовае насельніцтва з маёнткаў, сёл і вёсак… Беластоцкага

павета Гродзенскай губерні з папярэджаннем, што ўся пакінутая ў вёсках і маёнтках маёмасць будзе знішчана» [64, с. 132].

Успаміны мірных жыхароў Беластоцкага павета, выселеных улетку 1915 г., былі запісаны і сабраны ў зборніку «Бежанства 1915 г.» (выдадзены ў Беластоку ў 2000 г.) [125]. Напрыклад, С. Анішчук узгадваў: «А пасля казакі верхам ездзілі і выганялі нас, а вёску падпалілі». А. Барташук расказаў: «Памятаю, як па вёсцы ездзілі казакі на конях і крычалі: «Выбірайцеся ўсе, бо вас германцы заб'юць!». В. Беляшук успамінаў: «...калі да Брэста падыходзіў нямецкі фронт, на хутар уварваліся казакі і загадалі выязджаць у Расію. Хто супраціўляўся, дык сілком выганялі». А. Селеванюк прыгадаў: «Было гэта якраз у жніво 1915 г. Знячэўку ў наша сяло ўскочыў эскадрон казакаў, рассыпаўся па панадворках і давай усіх гнаць з хат, гэта значыць у бежанства» [15, с. 29, 43, 47, 292–293].

Шэраг прадстаўнікоў армейскага камандавання разумелі адмоўныя вынікі непаслядоўных эвакуацыйных дзеянняў. Так, начальнік штаба 3-й арміі накіраваў генералу М.А. Данілаву дакладную запіску, у якой адзначыў, што існаванне супярэчлівых і няўзгодненых рашэнняў вельмі ўскладняюць ажыццяўленне эвакуацыйных мерапрыемстваў і, галоўнае, падрываюць давер да ўлад з боку насельніцтва [119, спр. 428, арк. 91].

Прымусовыя дзеянні армейскага камандавання ў дачыненні да мірнага насельніцтва заходніх губерняў выклікалі пратэст з боку Савета Міністраў. Апошні з-за ўзгаданых вышэй прычын вымушаны быў абмежавацца папярэджаннямі і заклікамі да разважлівасці. Выступаючы ў Савеце Міністраў, А.В. Крывашэін казаў: «Ніякая краіна, нават шматпакутная Русь, не можа існаваць пры наяўнасці двух урадаў. Ці няхай Стаўка возьме на сябе ўсё і зніме з Савета Міністраў адказнасць за ход спраў, ці няхай яна і яе падначаленыя лічацца з інтарэсамі дзяржаўнага кіравання». Яго падтрымліваў міністр унутраных спраў князь М.Б. Шчарбатаў: «Губернатары закідваюць мяне запытамі і тэлеграмамі аб нязносным становішчы з-за дзеянняў ваенных улад» [53, с. 86–87].

Старшыня Савета Міністраў дакладваў цару Мікалаю II, што прымусовае высяленне соцень тысяч людзей, знішчэнне іх маёмасці і да таго падобнае ўяўляюць дзяржаўную небяспеку і патрабуюць хуткага спынення. 16 жніўня 1915 г. Савет Міністраў пасля афіцыйнага абмеркавання прызнаў агульную эвакуацыю насельніцтва недапушчальнай [64, с. 132–133].

У працы С.С. Альдэнбурга «Царствование императора Николая II» таксама падкрэслівалася, што такая «тактыка 1812 г.» рэзка крытыкавалася ў Савеце Міністраў, але з-за падпарадкаванасці тэатра ваенных дзеянняў Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму кабінет вымушаны быў з ім пагаджацца. Пэўныя надзеі на ліквідацыю двоеўладдзя ўскладаліся на прыняцце Мікалаем II пасады Вярхоўнага Галоўнакамандуючага [103, с. 480–483]. Аднак, з іншага боку, па прычыне меркавання пра няздатнасць цара да ваенных спраў многія чакалі пагаршэння сітуацыі.



У заходніх губернях летам 1915 г. справай высялення насельніцтва і эвакуацыі маёмасці кіраваў галоўны начальнік забеспячэння армій Паўночна-Заходняга фронту генерал М.А. Данілаў. Ён таксама размяркоўваў грашовыя сродкі з ваеннага фонду для дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, якія займаліся ўладкаваннем бежанцаў. Дакументы з фондаў канцылярыі галоўнага начальніка забеспячэння армій Паўночна-Заходняга фронту сведчаць, што генерал прыклаў пэўныя намаганні, каб цэнтралізаваць і правільна арганізаваць справу высялення і перамяшчэння бежанцаў. Аднак яго матывамі былі перш за ўсё гарантаванне патрэб і бяспекі арміі, а таксама тылавых часцей. Акрамя таго, М.А. Данілаў, як і астатнія армейскія начальнікі, фактычна пераклаў клопат пра бежанцаў на мясцовыя цывільныя ўлады, Земскі і Гарадскі саюзы і дабрачынныя арганізацыі. Пасля распараджэнняў аб высяленні насельніцтва (якія змяніліся загадамі «не высяляць») генерал заняўся арганізацыяй дапамогі бежанцам сіламі губернатараў і саюзаў. 21 чэрвеня 1915 г. ён выдаў распараджэнне: губернатарам заходніх губерняў накіроўваць бежанцаў у Кобрынскі і Пружанскі паветы, а ўпаўнаважаным УЗС і УСГ указаў, дзе стварыць харчовыя і медыцынскія пункты для аказання ім дапамогі [118, спр. 131, арк. 211–219].

Загад генерала М.А. Данілава дапамагаць бежанцам таксама атрымала армейскае і тылавое камандаванне. Апошнія павінны былі арганізаваць харчаванне бежанцаў на чыгуначных пунктах і тылавых этапах. Начальніку санітарнай часці было паведамлена, што ўсе лячэбныя ўстановы павінны аказваць бежанцам медыцынскую дапамогу. 4 ліпеня 1915 г. генерал загадаў усім камандуючым арміямі ўсталяваць на шляху руху бежанцаў харчовыя і медыцынскія пункты. Для гэтага неабходна была дапамога з боку цывільных улад, Чырвонага Крыжа, УЗС і УСГ [117, спр. 42, арк. 174–178]. 25 ліпеня 1915 г. генерал М.А. Данілаў загадам № 419 выдаў правілы, якімі акрэсліў свой погляд на правільную арганізацыю харчова-медыцынскай дапамогі бежанцам. Згодна з гэтымі правіламі на шляху руху бежанцаў павінны былі ўладкоўвацца харчовыя і медыцынскія пункты. Насельніцтва трэба было перамяшчаць партыямі па 500–600 чалавек. Партыі бежанцаў пажадана адпраўляць з пэўнымі інтэрваламі і абавязкова папярэджваць пункт прызначэння [119, спр. 74, арк. 6]. Адзначым, што гэтыя фактычна элементарныя правілы былі падрыхтаваны несвоечасова, каб прадухіліць катастрофу, а ў перыяд, калі рух бежанцаў пачаў набываць амаль некантралюемыя ўладамі памеры.

У жніўні 1915 г. стала відавочна, што прымусовыя дзеянні ваенных улад у дачыненні да мірных жыхароў ператварылі бежанства ў праблему агульнадзяржаўнага маштабу. У расійскім грамадстве актыўна крытыкавалася прымусовае высяленне мірных жыхароў ваеннымі ўладамі і менавіта з гэтымі дзеяннямі звязвалася ператварэнне бежанства ў катастрофу. Ваенныя ўла-

ды ў сваю чаргу поўнасцю адмаўлялі сваю віну за масавае бежанства (напрыклад, у дакладзе М.А. Данілава генералу М.В. Аляксееву [118, спр. 131, арк. 211–219]) і тлумачылі рэзкае павелічэнне колькасці бежанцаў добраахвотнымі ўцёкамі мірных жыхароў ад жахаў вайны.

У жніўні 1915 г. генерал М.В. Аляксееў змяніў М.М. Янушкевіча на пасадзе начальніка штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага [43]. Ён больш сур'ёзна ў адрозненне ад свайго папярэдніка ставіўся да праблемы высялення насельніцтва. Магчыма, адбіўся вопыт назірання за жахамі бежанства ў час камандавання фронтам. 31 жніўня М.В. Аляксееў пацвердзіў загадам высяленне толькі мужчын ваеннаабавязанага ўзросту. У той жа час 5 верасня камандуючым франтамі было загадана «ліквідаваць усялякую прымету прымусовага высялення насельніцтва, бо з гэтым бедствам не могуць справіцца сродкамі ўлады» [117, спр. 42, арк. 197, 220].

Трэцюю катэгорыю бежанцаў можна ўмоўна вызначыць як жыхароў, якія па ўласнай ініцыятыве накіраваліся ў глыб імперыі. Гэта рашэнне яны прымалі пад непасрэдным ці апасродкаваным уплывам ваеннага становішча і дзеянняў улад. Сярод асноўных фактараў, што выклікалі ўцёкі насельніцтва, назавём наступныя. Адзначым уплыў афіцыйнай дзяржаўнай ідэалогіі, якая яскрава малявала зверствы наступаючага праціўніка. На шырокай тэрыторыі прапагандаваўся сцэнарый падзей, быццам наступаючых з прыходам нямецкай арміі. Паводле прапаганды, нямецкія салдаты страшэнна здзекаваліся з праваслаўнага насельніцтва: жанчынам абразалі грудзі, дзецям – вушы і насы, мужчын асляплялі, а ўсіх без розніцы масава забівалі. Адзіным спосабам выратавання ўлады называлі ўцёкі ў глыб Расіі. Праваслаўная царква таксама актыўна агітавала за ўцёкі ў бяспечныя раёны. Святары самі паказвалі прыклад, выязджаючы разам з царкоўнай маёмасцю [15, с. 6–7].

Аб прапагандзе царскіх улад узгадваюць і бежанцы Беласточчыны, што адлюстравана ў названым вышэй зборніку «Бежанства 1915 г.» Вось як успамінае пра гэтыя падзеі Р. Багроўскі: «...фронт штораз набліжаўся. У наваколлі загаварылі пра немцаў, якія быццам жанчын гвалтуюць, а мужчын і дзяцей забіваюць. Усе кінуліся ў бежанства». А вось успаміны В. Весялоўскага: «Калі немцы забралі Варшаву, нашы пачалі рыхтавацца да ўцёкаў. Наш поп зняў званы і адправіў у Маскву, а сам сеў на поезд і паехаў. Страшылі нас, што лютры ідуць, вера іншая». І, нарэшце, некалькі слоў з успамінаў Д. Мароза: «Немец наступаў. Перад тым пагалоска разнеслася: паляць усё, здзекуюцца з людзей. Хто можа – уцякай. Усе на ўсход – у глыб Расіі» [15, с. 31–32, 57, 189].

Важным фактарам, які падштурхоўваў насельніцтва да ўцёкаў, былі рэквізіцыі. Згодна з законамі ваеннага часу армейскае камандаванне праводзіла ў насельніцтва (за плату, але толькі частковую) рэквізіцыю патрэбных рэчаў [119, спр. 399, арк. 50, 62; спр. 400, арк. 40, 239–248]. Афіцыйная прапаганда паведамляла, што ў тых жыхароў, якія пажадаюць застацца, будуць рэквізаваны свойская жывёла, коні, павозкі і харчаванне. Пакінута будзе харчаванне толькі на адзін месяц, за астатняе будуць заплачаны грошы. У тых жыхароў, якія пажадаюць выселіцца, будзе рэквізавана толькі тое, што самі жыхары пажадаюць аддаць, за гэта будуць выплачаны грошы [119, спр. 441, арк. 49]. Зразумела, што частка мірных жыхароў, каб выратаваць сваю маёмасць, уцякала ў глыб Расіі.



Таксама важным фактарам, які садзейнічаў уцёкам, быў псіхалагічны стан насельніцтва пад уплывам ваенных падзей. Страх выклікала ўсё – і праціўнік, і марадзёры са сваіх войскаў, і небяспека для жыцця дзяцей і жанчын [143]. У выніку ўцёкі насельніцтва ў глыб імперыі асабліва ўзмацніліся ў жніўні – верасні 1915 г., у час кульмінацыі трагічнага адступлення рускай арміі.

Новае кіраўніцтва Стаўкі ўлічыла катастрафічныя наступствы бежанскага руху лета – восені 1915 г. Напрыклад, 1 кастрычніка ў Стаўцы пад старшынствам М.В. Аляксеева адбылася нарада па пытанні аб перавозцы бежанцаў і эвакуіраваных грузаў. Была пастаўлена мэта правільна і ўпарадкавана ажыццявіць вываз бежанцаў з франтавой тэрыторыі, для чаго выдзяляліся 200 цягнікоў і асігнавана было 10 млн р. [117, спр. 42, арк. 319, 517].

На працягу канца 1915 – пачатку 1916 г. паступалі звесткі аб выпадках прымусовага высялення асобных груп бежанцаў з тылу арміі, што ўладай не падтрымлівалася. У 1916 г. была таксама спынена вельмі прывабная для армейскага камандавання эвакуацыя бежанцаў з трохвярстовай прыфрантавой паласы. З ініцыятывай гэтай акцыі выступіла камандаванне Заходняга фронту, якое даведалася, што праціўнік выселіў усё мясцовае насельніцтва з паласы ў 5 км каля фронту. Былі праведзены нарады з губернатарамі адпаведных мясцовасцей, а таксама з арганізацыямі па дапамозе бежанцам. У канчатковым выніку высяленне бежанцаў з трохвярстовай паласы было прызнана дарагім і цяжкім, таму было адменена [119, спр. 436, арк. 1, 29].

Падсумоўваючы сказанае, можна зрабіць наступныя высновы. Мірнае насельніцтва Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны было перападначалена армейскаму камандаванню. Апошняе атрымала надзвычайныя паўнамоцтвы на франтавых і прыфрантавых тэрыторыях. З пачатку вайны, і асабліва калі баявыя дзеянні былі перанесены на тэрыторыю Расійскай імперыі, ваенныя і цывільныя ўлады інтэнсіўна праводзілі эвакуацыю груп насельніцтва, служба і жыццё якіх прызнаваліся найбольш карыснымі для дзяржавы. Такімі грамадзянамі лічылі чыноўнікаў, дзяржаўных служачых, іх сем'і, а таксама праваслаўных святароў. Эвакуацыя чыноўніцтва і праваслаўнага святарства ў Беларусі праводзілася ў большай ступені ў Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губернях, і ў меншай – у Мінскай і Магілёўскай. Калі чыноўнікаў, служачых, іх сем'і і праваслаўных святароў эвакуіра-

валі па папярэдне распрацаваных палажэннях, то высяленне большасці грамадзян адбывалася на падставе загадаў і распараджэнняў, якія былі выдадзены непасрэдна ў час правядзення эвакуацыйных мерапрыемстваў.

Дэпартацыі прадстаўнікоў «нядобранадзейных», з пункту гледжання ўлад, народаў праводзіліся з самага пачатку вайны. Значная колькасць іх рухалася цераз Беларусь транзітам, частка палякаў і яўрэяў засталася тут на часовае жыхарства.

Ва ўмовах адступлення рускай арміі летам і восенню 1915 г. адбывалася масавае прымусовае высяленне насельніцтва заходніх губерняў, у тым ліку Беларусі. Армейскае кіраўніцтва імкнулася спыніць нямецкае наступленне любой цаной, таму пайшло на такую надзвычайную меру, як стварэнне на ўласнай тэрыторыі паласы спусташэння. Прадугледжвалася высяленне мужчынскага насельніцтва ваеннаабавязанага ўзросту, а таксама вываз ці знішчэнне ўсялякай маёмасці і прадуктаў харчавання.

Улады афіцыйна тлумачылі прымусовае высяленне насельніцтва клопатам аб яго бяспецы, аднак іх сапраўдныя матывы – недапушчэнне магчымасці працы і службы жыхароў заходніх губерняў на карысць праціўніка. Эвакуацыйныя дзеянні выпрацоўваліся і праводзіліся ў тэрміновым парадку, што не дазваляла папярэдне падмацаваць іх неабходнай колькасцю фінансавых сродкаў. Ніжэйшыя армейскія чыны падзялялі недавер свайго кіраўніцтва, што прыводзіла да злоўжыванняў у адносінах да мірных жыхароў. Сярод апошняга панавалі панічныя настроі, паколькі насельніцтва не было дастаткова праінфармавана аб прычынах і сутнасці эвакуацыі. Колькасць бежанцаў павялічвалася за кошт жыхароў Беларусі, якія пад уплывам ваеннага становішча і дзеянняў армейскага камандавання па ўласнай ініцыятыве накіроўваліся ў глыб імперыі, каб выратавацца ад жахаў вайны. Такое значнае павелічэнне памераў бежанства ва ўмовах сістэмнага крызісу ў Расійскай імперыі ў выніку ператварыла гэту з'яву ў праблему агульнадзяржаўнага маштабу.

Такім чынам, сярод бежанцаў умоўна можна вызначыць некалькі катэгорый. Першая – дзяржаўныя чыноўнікі, служачыя, іх сем'і, праваслаўныя святары, эвакуацыю якіх забяспечвала дзяржава. Другая – прымусова выселеныя загадамі ваенных і цывільных улад мірныя жыхары. Апошнія складаюцца з дзвюх вялікіх груп насельніцтва. З аднаго боку, гэта дэпарціраваныя прадстаўнікі нядобранадзейных (з пункту гледжання царскага ўрада) нацыянальнасцей – немцы, яўрэі, галічане і палякі, з другога – жыхары заходніх губерняў ваеннаабавязанага ўзросту і ўвогуле ўсё насельніцтва. Высяленне іх улада палічыла неабходным з нагоды ваеннага часу. Трэцюю катэгорыю бежанцаў складалі мірныя жыхары, якія з-за блізкасці фронту і звязаных з гэтым умоў жыцця па ўласнай ініцыятыве пакінулі свой дом і накіраваліся ва ўнутраныя губерні імперыі.



# ГЛАВА 3 ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫХ УСТАНОЎ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ ПАТРЭБ БЕЖАНЦАЎ

Першыя бежанцы з'явіліся ў Беларусі ў самым пачатку вайны. Колькасць іх была нязначная. Часовае павелічэнне тут колькасці бежанцаў назіралася зімой 1914–1915 гг., калі армейскае камандаванне санкцыяніравала масавае высяленне «нядобранадзейных народаў». Іх хутка перапраўлялі ў глыб Расійскай імперыі і да лета 1915 г. колькасць бежанцаў у Беларусі была адносна нязначнай (ад некалькіх соцень да некалькіх тысяч чалавек) [116, спр. 60, арк. 56].

Падкрэслім, што ў першы год вайны, да пачатку лета 1915 г., дапамогу асноўнай колькасці бежанцаў аказвалі дабрачынныя ўстановы. У гэты перыяд цывільныя ўлады забяспечвалі патрэбы толькі пэўных катэгорый бежанцаў, перш за ўсе дзяржаўных служачых. Непасрэдны ўдзел у аказанні дапамогі бежанцам органы дзяржаўнай улады пачалі прымаць з пачатку масавага руху бежанцаў, а менавіта з лета 1915 г.

З боку цэнтральнай дзяржаўнай улады клопат пра бежанцаў ажыццяўлялі Галоўнаупаўнаважаныя па ўладкаванні бежанцаў, з боку мясцовых – губернскія, павятовыя і гарадскія ўлады. Беларусь уваходзіла ў сферу паўнамоцтваў Галоўнаупаўнаважанага па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронту С.І. Зубчанінава, які быў кіраўніком урадавай установы «Поўначдапамога». Губернскія і павятовыя ўлады ў Беларусі ажыццяўлялі кантроль і фінансаванне справы ўладкавання бежанцаў шляхам склікання губернскіх і павятовых нарад, якія павінны былі аб'ядноўваць дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам.

Стварэнне інстытута Галоўнаупаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў звязана з наступнымі акалічнасцямі. Значнае павелічэнне колькасці бежанцаў і стыхійнасць напрамкаў іх руху сталі падставай для разгляду бежанскага пытання 26 і 30 чэрвеня 1915 г. на пасяджэннях Савета Міністраў. 1 ліпеня 1915 г. была прынята пастанова Савета Міністраў «Аб арганізацыі дапамогі асобам, якія прыбылі ва ўнутраныя губерні з памежных мясцовасцей». У гэтай пастанове прызнавалася, што павелічэнне колькасці бежанцаў з'явілася вынікам як узмацнення наступлення нямецкіх войск, так і прымусовага высялення мірных жыхароў ваеннымі ўладамі. Урад у пастанове адзначыў, што цэлыя сёлы ў поўным складзе з

дзецьмі і маёмасцю пакінулі месца пастаяннага жыхарства, каб выратавацца ад праціўніка, пры гэтым нават не ведаючы канчатковай мэты свайго падарожжа. Рабілася выснова, што ва ўмовах абвастрэння праблемы бежанства клопат аб упарадкаванні іх руху і забеспячэнні ўсім неабходным не можа быць ускладзены на прыватныя арганізацыі і павінен стаць задачай дзяржавы [117, спр. 42, арк. 1–2].

Пастановай ад 1 ліпеня 1915 г. Савет Міністраў усклаў клопат аб забеспячэнні патрэб бежанцаў на двух членаў Дзяржаўнага Савета. Дзейнасць апошніх залежала ад распараджэнняў галоўных начальнікаў забеспячэння армій Паўночна- і Паўднёва-Заходніх франтоў [117, спр. 42, арк. 1]. Фактычна гэта азначала, што дзейнасць сенатараў па ўладкаванні бежанцаў павінна была ажыццяўляцца пад кантролем і кіраўніцтвам ваенных улад. Гэта пацвярджаецца і тым, што зацвярджэнне асоб, адказных за дапамогу бежанцам, адбывалася толькі пасля ўзгаднення іх кандыдатур з Вярхоўным Галоўнакамандуючым [117, спр. 42, арк. 53–54]. Савет Міністраў назначыў С.І. Зубчанінава пры галоўным начальніку забеспячэння армій Паўночна-Заходняга фронту генерале М.А. Данілаве і М.П. Урусава пры галоўным начальніку забеспячэння армій Паўднёва-Заходняга фронту [117, спр. 42, арк. 2].

Перад пачаткам сваёй працы С.І. Зубчанінаў і М.П. Урусаў наведалі Стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага і атрымалі ад яго начальніка штаба запэўненне, што ваенныя ўлады гатовы дапамагчы ў выкананні ўскладзеных на сенатараў задач [117, спр. 42, арк. 79]. Начальнік штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага М.М. Янушкевіч таксама абавязаў М.А. Данілава аказваць поўнае садзейнічанне С.І. Зубчанінаву [117, спр. 42, арк. 73]. Падкрэслім, што Галоўнаўпаўнаважаныя па ўладкаванні бежанцаў на франтах пачыналі сваю работу са спадзяваннем на падтрымку і дапамогу з боку ваенных улад.

У час масавага высялення насельніцтва армейскае камандаванне звярнулася па дапамогу да МУС. Савет Міністраў таксама палічыў, што менавіта МУС, як адказнае за захаванне стабільнасці і парадку ў імперыі, павінна займацца кіраўніцтвам з боку цывільных улад справай уладкавання бежанцаў. Таму менавіта пад наглядам міністра ўнутраных спраў М.Б. Шчарбатава, па ўзгадненні з Галоўнакіруючым землеўпарадкаваннем і земляробствам і начальнікам штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага быў падрыхтаваны спецыяльны наказ, які акрэсліў абавязкі і паўнамоцтвы С.І. Зубчанінава і М.П. Урусава. Савет Міністраў зацвердзіў гэты наказ 24 ліпеня 1915 г. Артыкуламі наказа клопат пра бежанцаў ускладваўся на Паўночна-Заходнім фронце на С.І. Зубчанінава, на Паўднёва-Заходнім – на М.П. Урусава. Сенатарам



было прысвоена званне Галоўнаўпаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў на франтах [41, с. 7].

Наказ Галоўнаўпаўнаважаным па бежанцах акрэсліў наступныя напрамкі дзейнасці С.І. Зубчанінава і М.П. Урусава: вызначэнне парадку высялення, маршруты і спосабы руху бежанцаў у прызначаныя мясцовасці, а таксама арганізацыя харчавання і забеспячэнне іх медыцынскай і ветэрынарнай дапамогай і ўвогуле ўсім, што неабходна для перамяшчэння і ўладкавання бежанцаў на новым месцы жыхарства [41, с. 7]. Галоўнаўпаўнаважаныя па ўладкаванні бежанцаў на франтах павінны былі аказваць садзейнічанне асобам, якія высяляліся, пры здачы хлеба, фуражу, коней, іншай жывёлы і да таго падобнага для патрэб арміі (фактычна забяспечваць правядзенне рэквізіцый), а таксама ў атрыманні адпаведнай узнагароды за здадзеныя рэчы; у вывазе хлеба, фуражу і іншай маёмасці ў бяспечныя мясцовасці (праводзіць эвакуацыю маёмасці); утойванню пакінутай маёмасці, якая можа быць каштоўнай для праціўніка (фактычна займацца ліквідацыяй маёмасці); у пошуках працы для бежанцаў [41, с. 8–9]. На правядзенне гэтых мерапрыемстваў сенатарам былі выдзелены па 2 млн р. [25, № 21, с. 9].

Адзначым, што МУС вызначыла для С.І. Зубчанінава і М.П. Урусава клопат пра бежанцаў толькі як частку іх абавязкаў. Меркавалася, што Галоўнаўпаўнаважаныя па ўладкаванні бежанцаў на франтах вызваляць армейскія і тылавыя часці ад эвакуацыйных і рэквізіцыйных мерапрыемстваў. У сувязі з гэтым асаблівая ўвага ў наказе ўдзялялася супрацоўніцтву С.І. Зубчанінава і М.П. Урусава з ваеннымі і цывільнымі ўладамі, дабрачыннымі і грамадскімі арганізацыямі. Пры гэтым пытанне аб супрацоўніцтве і дапамозе з боку армейскага камандавання вырашалася ў наказе вельмі расплывіста – апошняму рэкамендавалася «па магчымасці» папярэджваць аб высяленні насельніцтва [41, с. 8–9].

У наказе таксама было сказана, якім чынам Галоўнаўпаўнаважаныя па ўладкаванні бежанцаў на франтах могуць фарміраваць свой службовы апарат. Яны маглі выбіраць у якасці памочнікаў упаўнаважаных, а сваіх супрацоўнікаў набіраць з чыноўнікаў, эвакуіраваных з занятых праціўнікам мясцовасцей. Наказ дазваляў С.І. Зубчанінаву і М.П. Урусаву ствараць камітэты па аб'яднанні мясцовых дзеячаў у справе аказання дапамогі бежанцам, але толькі па ўзгадненні з губернатарамі. Пад старшынствам апошніх Галоўнаўпаўнаважаныя па ўладкаванні бежанцаў на франтах маглі склікаць губернскія нарады, а непасрэдна пад сваім старшынствам – абласныя нарады [41, с. 8–9].

Па ўзаемным узгадненні С.І. Зубчанінаў і М.П. Урусаў падзялілі губерні еўрапейскай Расіі на дзве часткі. Віленская, Віцебская,

Гродзенская, Мінская і Магілёўская трапілі сярод іншых у сферу паўнамоцтваў Галоўнаўпаўнаважанага па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронту С.І. Зубчанінава. Ён прыступіў да працы, маючы шырокія паўнамоцтвы і вялікія абавязкі, а пачаў сваю дзейнасць, калі дзесяткі тысяч бежанцаў вялізнай чалавечай хваляй ужо запоўнілі заходнія губерні. С.І. Зубчанінаву трэба было фактычна з нуля стварыць новую арганізацыю па аказанні дапамогі бежанцам. Упраўленне і сетка ўстаноў, якія ўзначальваў ён, атрымалі скарочаную назву «Поўначдапамога» (аналагічная арганізацыя М.П. Урусава называлася «Поўдзень-бежанец») [70].

Разгледзім больш падрабязна структуру службовага апарату «Поўначдапамогі», бо менавіта яна была буйнейшай урадавай установай па дапамозе бежанцам у Беларусі. С.І. Зубчанінаў ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва арганізацыяй. Прадстаўнікамі яго ў губернях і раёнах буйной канцэнтрацыі бежанцаў былі ўпаўнаважаныя і асобаўпаўнаважаныя. Летам 1915 г. гэтыя пасады займалі: па Віцебскай губерні Я.Н. Афросімаў, Віленскай і Ковенскай – І.С. Васільчыкаў, Кобрынскім раёне Гродзенскай губерні – Г.В. Віктараў, Слонімскім раёне Гродзенскай губерні – Ю.Г. Чэлішчаў і па Мінскай губерні – А.П. Фацінскі [117, спр. 42, арк. 133]. Пасля падзелу Паўночна-Заходняга фронту на дзве часткі С.І. Зубчанінаў прызначыў сваімі таварышамі (намеснікамі) А. Зарына – па Паўночным і Г. Віктарава – па Заходнім фронце.

З мэтай рэгламентацыі працы ўпаўнаважаных як афіцыйных прадстаўнікоў Галоўнаўпаўнаважанага па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронту ў губернях быў складзены спецыяльны наказ. Згодна з ім упаўнаважаныя і іх памочнікі працавалі па наступных напрамках: садзейнічалі ліквідацыі маёмасці высяляемага насельніцтва, вызначалі маршруты руху бежанцаў на гужавым шляху да месца пасадкі на чыгунку, арганізоўвалі медыцынскую і харчовую дапамогу, забяспечвалі бежанцаў фуражом для жывёлы і сродкамі перамяшчэння. Падкрэслім, што лепшым спосабам дапамогі з боку ўпаўнаважаных з'яўляўся пошук працы для бежанцаў [97, спр. 6, арк. 8].

Упаўнаважаныя «Поўначдапамогі» ў сваю чаргу мелі ў месцах найбольшай канцэнтрацыі бежанцаў сваіх прадстаўнікоў. Абавязкі апошніх акрэсліваліся наказам для асоб, якія камандзіраваліся на вузлавыя пункты і станцыі і ўключалі санітарны нагляд за бежанцамі і клопат пра іх харчаванне. Камандзіраваныя на станцыі і пункты супрацоўнікі «Поўначдапамогі» таксама павінны былі фарміраваць з бежанцаў групы, зыходзячы з тэрытарыяльных прымет, прызначаць у гэтых групах старшых і абавязкова тэлеграфаваць на наступныя пункты пра колькасць адпраўленых бежанцаў і рэгістраваць іх [97, спр. 6, арк. 6].



Адзначым, што структура «Поўначдапамогі» была арганізацыйна незавершанай, таму што праца гэтай установы будавалася на дзейнасці асобных супрацоўнікаў, накіраваных у пэўныя раёны і там набіраўшых штат служачых. Фарміраванне арганізацыі адбывалася адначасова з ажыццяўленнем ёю дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам, што адмоўна паўплывала на працу «Поўначдапамогі».

Асноўныя звесткі пра дзейнасць С.І. Зубчанінава змешчаны ў яго дакладах аб арганізацыі і ўмовах працы па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронту, якія былі падрыхтаваны як для ваенных улад, так і для справаздачы ў друку аб дзейнасці «Поўначдапамогі». С.І. Зубчанінаў апісаў канкрэтныя мерапрыемствы па дапамозе бежанцам, а таксама паспрабаваў прааналізаваць прычыны поспехаў і недахопаў у гэтай справе [119, спр. 438, арк. 208–211; 38, № 1, с. 2, № 2, с. 10, № 3, с. 9–10].

С.І. Зубчанінаў падзяліў падначаленую яму тэрыторыю на дзве часткі – падлягаючую і непадлягаючую засяленню бежанцамі. Засяленню падлягалі губерні ўсходняга мерыдыяна Старой Русы да лініі Дняпра і за гэтай лініяй, за выключэннем Аланецкай, Архангельскай і паўночнай часткі Валагодскай губерняў. С.І. Зубчанінаў імкнуўся браць пад увагу пры разліку памеру кожнай губерні для прыняцця бежанцаў звесткі аб прасторы і мясцовым насельніцтве, а таксама мясцовыя асаблівасці (наяўнасць шляхоў зносін, кошт прадуктаў харчавання, спажывання, магчымасць працаўладкавання) [119, спр. 438, арк. 208].

Першы мільён бежанцаў Галоўнаўпаўнаважаныя па іх уладкаванні размеркавалі па 15 губернях еўрапейскай часткі Расіі, прыкладна ад 30 да 100 тыс. чалавек на губерню. Гэтыя разлікі былі прадстаўлены губернатарам, якія ў большасці паведамлялі С.І. Зубчанінаву і М.П. Урусаву, што іх губерні ніякім чынам не здольны прыняць такую колькасць бежанцаў. Аднак пад націскам урада і перш за ўсё МУС, мясцовыя цывільныя ўлады вымушаны былі прымаць і ўладкоўваць бежанцаў [119, спр. 438, арк. 208].

Для С.І. Зубчанінава галоўнай праблемай з'яўлялася мэтанакіраванае і раўнамернае засяленне бежанцамі ўнутраных губерняў. Справа ў тым, што яны рухаліся адначасова ад усёй лініі фронту, расцягнуўшыся больш чым на тысячу вёрст. Напрыклад, у канцы ліпеня – пачатку жніўня 1915 г. перадавыя хвалі бежанскага руху дасягнулі граніц Магілёўскай і Смаленскай губерняў і, такім чынам, увесь шлях вакол і на Маскоўска-Брэсцкай шашы ў межах Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў быў запоўнены бежанцамі. Другая хваля рухалася шляхамі: Пружаны – Слонім – Баранавічы і Беласток – Ваўкавыск – Баранавічы. У Віленскай і Віцебскай губернях таксама назіраўся масавы бежанскі рух.

С.І. Зубчанінаў імкнуўся ўпарадкаваць маршруты і схемы перамяшчэння бежанцаў, аднак, як ён сам прызнаў у сваім дакладзе, «перад такой грандыёзнай задачай трэба было думаць не аб карэнных мерах, з якімі спазніліся, а аб унясенні толькі некаторых паляпшэнняў у становішча бежанцаў, і то пры ўмове ўзгодненай працы» [119, спр. 438, арк. 208–209]. Аб выніках размеркавання бежанцаў па імперыі сведчаць даныя аб іх колькасці па месцах выхаду і месцах часовага пасялення, змешчаныя ў табл. 1 [51, № 11, с. 5–15].

*Табліца 1*

***Колькасць бежанцаў з Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў у месцах часовага жыхарства. Апрацаваны даныя аб** 2 298 162 **бежанцах***

| Губерні часовага жыхарства | Губерні выхаду | | | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Віленская | Віцебская | Гродзенская | Мінская | Магілёўская | |
| Архангельская | 36 | 115 | 86 | 45 | 5 | 287 |
| Астраханская | 479 | 35 | 1943 | 224 | 21 | 2702 |
| Бесарабская | 7 | 0 | 121 | 2 | 0 | 130 |
| Віленская | 6171 | 12 | 77 | 1494 | 0 | 7754 |
| Віцебская | 3332 | 4490 | 1517 | 220 | 13 | 9572 |
| Уладзімірская | 1358 | 518 | 11631 | 4316 | 45 | 17868 |
| Валагодская | 428 | 1048 | 416 | 378 | 25 | 2295 |
| Валынская | 54 | 748 | 504 | 965 | 0 | 2271 |
| Варонежская | 1081 | 114 | 11196 | 1339 | 36 | 13766 |
| Вяцкая | 727 | 249 | 1068 | 160 | 9 | 2213 |
| Данскога войска | 3223 | 545 | 23651 | 7387 | 29 | 34835 |
| Екацярынаслаўская | 4097 | 1165 | 18329 | 5623 | 96 | 29310 |
| Казанская | 1216 | 413 | 35300 | 1062 | 28 | 38019 |
| Калужская | 721 | 176 | 46821 | 1290 | 30 | 49038 |
| Кіеўская | 662 | 73 | 1823 | 811 | 32 | 3401 |
| Кастрамская | 1558 | 841 | 1313 | 397 | 77 | 4186 |
| Курляндская | 22 | 40 | 1 | 0 | 0 | 63 |



| Губерні часовага жыхарства | Губерні выхаду | | | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Віленская | Віцебская | Гродзенская | Мінская | Магілёўская | |
| Курская | 1283 | 466 | 2400 | 1094 | 55 | 5298 |
| Ліфляндская | 133 | 222 | 22 | 15 | 13 | 405 |
| Мінская | 13793 | 47 | 23445 | 26405 | 18 | 63708 |
| Магілёўская | 3022 | 517 | 12012 | 4501 | 42 | 20094 |
| Маскоўская | 3883 | 2238 | 10025 | 2043 | 81 | 18270 |
| Ніжагародская | 2669 | 2228 | 10510 | 2143 | 39 | 17589 |
| Наўгародская | 1851 | 1070 | 3390 | 454 | 17 | 6782 |
| Аланецкая | 12 | 72 | 63 | 11 | 1 | 159 |
| Арэнбургская | 3815 | 251 | 32916 | 3470 | 7 | 40459 |
| Арлоўская | 2739 | 1897 | 11875 | 4649 | 57 | 21217 |
| Пензенская | 2666 | 209 | 22102 | 5253 | 11 | 30241 |
| Пермская | 1727 | 744 | 6027 | 3179 | 40 | 11717 |
| Падольская | 9 | 0 | 172 | 9 | 0 | 190 |
| Палтаўская | 1580 | 202 | 1099 | 1762 | 13 | 4656 |
| Пскоўская | 1984 | 1887 | 1155 | 111 | 16 | 5153 |
| Разанская | 1356 | 164 | 29405 | 2124 | 20 | 33069 |
| Самарская | 3723 | 448 | 52827 | 5173 | 56 | 62227 |
| Петраградская | 18515 | 6830 | 8784 | 3177 | 87 | 37393 |
| Саратаўская | 3334 | 670 | 33307 | 4421 | 31 | 41763 |
| Сімбірская | 487 | 234 | 15192 | 838 | 4 | 16755 |
| Смаленская | 330 | 59 | 1959 | 518 | 2 | 2868 |
| Таўрычаская | 399 | 84 | 2008 | 442 | 9 | 2942 |
| Тамбоўская | 5605 | 338 | 53271 | 7677 | 20 | 66911 |
| Цвярская | 3166 | 2277 | 6042 | 2913 | 52 | 14450 |
| Тульская | 3627 | 1111 | 8183 | 2500 | 87 | 15508 |
| Уфімская | 1720 | 289 | 28707 | 3450 | 6 | 34172 |
| Харкаўская | 4123 | 1578 | 13048 | 3239 | 52 | 22040 |

| Губерні часовага жыхарства | Губерні выхаду | | | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Віленская | Віцебская | Гродзенская | Мінская | Магілёўская | |
| Херсонская | 1591 | 353 | 4584 | 1902 | 23 | 8453 |
| Чарнігаўская | 3305 | 134 | 5092 | 4505 | 88 | 13124 |
| Эстляндская | 236 | 117 | 153 | 61 | 0 | 567 |
| Яраслаўская | 2111 | 2780 | 5744 | 1868 | 50 | 12553 |
| па еўр. Расіі | 119966 | 40098 | 561316 | 125620 | 1443 | 848443 |
| па Каўказе | 233 | 218 | 5056 | 437 | 9 | 5953 |
| па Сібіры | 5278 | 801 | 27081 | 4057 | 44 | 37261 |
| па Сярэдняй Азіі | 797 | 66 | 8978 | 1167 | 0 | 11008 |
| Усяго па Расійскай імперыі | 126274 | 41183 | 602431 | 131278 | 1496 | 902662 |

Амаль 90 % бежанцаў з пяці заходніх губерняў былі накіраваны на часовае жыхарства ў еўрапейскую частку Расійскай імперыі. Самая значная колькасць такіх бежанцаў апынулася ў Тамбоўскай, Самарскай, Арэнбургскай, Калужскай, Саратаўскай і Петраградскай губернях. Непасрэдна на тэрыторыі Беларусі найбольш бежанцаў аказалася ў Мінскай губерні. Пэўная колькасць іх апынулася ў Сібіры, нязначная частка была перасялена на Каўказ і ў Сярэднюю Азію. Фактычна бежанцы з пяці заходніх губерняў складалі не менш чым $^1/_3$ ад агульнай колькасці зарэгістраваных бежанцаў.

Дзеянні С.І. Зубчанінава па размеркаванні бежанцаў неаднаразова крытыкавалі як мясцовыя цывільныя ўлады, так і прадстаўнікі УЗС і УСГ. Як адзначалася ў перыядычных выданнях УЗС і УСГ, рассяленне бежанцаў ва ўнутраных губернях праводзілася без якога-небудзь плана, а Галоўнаўпаўнаважаныя па ўладкаванні бежанцаў на франтах перш за ўсё імкнуліся вызваліць ад бежанцаў тыл арміі, а асаблівасці губерняў не ўлічвалі [48, № 17, с. 24–25].

С.І. Зубчанінаў і яго ўпраўленне пачалі сваю працу з вырашэння крызісу ў Кобрынскім раёне. Па прычыне таго, што па распараджэнні генерала М.А. Данілава бежанцаў з губерняў Царства Польскага накіроўвалі ў Пружанскі і Кобрынскі паветы, у апошнім у канцы ліпеня 1915 г. сканцэнтравалася каля 200 тыс. бежанцаў. Сярод іх бушавалі эпідэміі, катастрафічна не хапала



прадуктаў харчавання і рэчаў першай неабходнасці. Галоўнаўпаўнаважаны па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронту выступіў са зваротам у друку, у якім заклікаў аб'яднаць арганізацыі для дапамогі бежанцам, асабіста і праз упаўнаважаных праводзіў нарады з зацікаўленымі асобамі. На гэтых нарадах была дасягнута дамоўленасць, што ўладкоўваць харчовыя і медыцынскія пункты на шляху руху бежанцаў будуць УЗС і УСГ. За арганізацыяй «Поўначдапамога» засталіся ўказанне напрамкаў руху бежанцаў, ліквідацыя іх маёмасці, назіранне за санітарна-харчовым забеспячэннем і размеркаванне грашовых сродкаў. Апошнія С.І. Зубчанінаў атрымліваў ад галоўнага начальніка забеспячэння армій Паўночна-Заходняга фронту і ад Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў пры МУС [119, спр. 438, арк. 208–209].

Пры аналізе сваёй дзейнасці ў раёне Кобрына С.І. Зубчанінаў зрабіў вывад, што ён не здолеў мабілізаваць усе сродкі на дапамогу бежанцам. Сам Галоўнаўпаўнаважаны па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронту тлумачыў гэта адсутнасцю агульнага кіраўніцтва і каардынацыі справай эвакуацыі насельніцтва і ліквідацыяй маёмасці ў час стварэння «паласы змярцвення». Наказ МУС ад 24 ліпеня 1915 г. усклаў гэты абавязак на С.І. Зубчанінава і М.П. Урусава, аднак яны пачалі працу не з прэвентыўных мер, а ў момант, калі дзесяткі тысяч бежанцаў знаходзіліся на адлегласці соцень вёрст ад дому. С.І. Зубчанінаў лічыў, што галоўнай умовай паспяховага перамяшчэння бежанцаў з'яўляецца правільнае выкарыстанне гужавых і чыгуначных шляхоў. Аднак менавіта тут яго напаткалі галоўныя праблемы і перашкоды. Апошнія ствараліся ваеннымі ўладамі, якія, зразумела, перш за ўсё імкнуліся забяспечыць ваенныя перавозкі, а бежанцаў успрымалі толькі як лішнюю абузу. Ваенныя ўлады заклікалі С.І. Зубчанінава «вызваліць» франтавую і тылавую палосы ад бежанцаў і пры гэтым абмяжоўвалі яго пры карыстанні як гужавымі, так і чыгуначнымі шляхамі [119, спр. 438, арк. 209].

Да захопу праціўнікам Кобрынскага павета ў верасні 1915 г. у выніку Свянцянскага прарыву С.І. Зубчанінаву і яго арганізацыі ўдалося эвакуіраваць адсюль каля 100 тыс. бежанцаў. Астатнія апынуліся пад уладай немцаў, шмат загінула. Як пісаў у справаздачы С.І. Зубчанінаў: «Здавалася, што нехта як быццам спецыяльна рыхтуе гэту катастрофу з бежанцамі: шаша ад іх была вызвалена, але акрамя вайсковых часцей была занята абозам з абывацельскіх фурманак, якія перавозілі хворых жывёлін, што адбіліся ад інтэнданцкіх гуртоў... вось дзеля чаго зганяліся бежанцы з шашы на прасёлкі» [119, спр. 438, арк. 210].

Галоўнаўпаўнаважаныя па ўладкаванні бежанцаў павінны ажыццяўляць сваю дзейнасць у цесным супрацоўніцтве з мясцовай адміністрацыяй. Дзякуючы намаганням ваенных і цэнт-

ральных цывільных улад менавіта губернатарам было даручана арганізоўваць і кантраляваць дзейнасць усіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам на падуладнай ім тэрыторыі. Да выдання спецыяльнага закона аб бежанцах дзейнасць губернскіх і павятовых улад па забеспячэнні патрэб бежанцаў адбывалася ніжэйапісаным чынам.

Значная колькасць бежанцаў прайшла цераз Гродзенскую губерню. Рух бежанцаў спыніўся толькі з пераходам губерні пад уладу праціўніка, які вярнуў выселеных мірных жыхароў, якія апынуліся пад яго ўладай, дадому. З боку мясцовых улад кіраваў дапамогай бежанцам гродзенскі генерал-губернатар І.А. Шабека. Ён сачыў за ўладкаваннем бежанцаў, якія рухаліся транзітам з губерняў Царства Польскага, а таксама тых, што высяляліся непасрэдна з Гродзенскай губерні. Каб упарадкаваць справу ўладкавання бежанцаў, І.А. Шабека ў пачатку ліпеня 1915 г. распрацаваў і выдаў падначаленым як кіраўніцтва да дзеяння «Прыкладную інструкцыю для арганізацыі ўрачэбна-харчовай дапамогі ў Гродзенскай губерні эвакуіраванаму насельніцтву». У інструкцыі адзначалася, што прычынамі з'яўлення гэтага дакумента сталі, па-першае, магчымая эвакуацыя жыхароў з тэатра ваенных дзеянняў і, па-другое, адсутнасць дакладных указанняў па гэтым пытанні. «Прыкладная інструкцыя» змяшчала заўвагі І.А. Шабекі, што ў выпадку высялення менавіта на ўрадзе ляжыць клопат аб урэгуляванні руху бежанцаў, забеспячэнні іх харчовай і медыцынскай дапамогай, уладкаванні на месцы часовага жыхарства.

Для выканання гэтых мерапрыемстваў І.А. Шабека лічыў неабходным на шляху руху бежанцаў перыядычна ствараць харчовыя і медыцынскія пункты. Было прызнана пажаданым перамяшчаць насельніцтва партыямі па 500–600 чалавек. Рассяляць бежанцаў неабходна ў месцах, дзе можна арганізаваць працоўную, харчовую і медыцынскую дапамогу. Генерал-губернатар І.А. Шабека планаваў усё дарослае працаздольнае насельніцтва адразу пасля прыбыцця накіроўваць на абарончыя работы ў Гродна, Беласток ці Брэст-Літоўск, а астатніх выкарыстоўваць на сельскагаспадарчых работах [88, спр. 9028, арк. 1].

Інструкцыя гродзенскага генерал-губернатара амаль на месяц апярэдзіла аналагічны дакумент, падрыхтаваны генералам М.А. Данілавым, аднак фактычна ўпарадкаваць справу ўладкавання бежанцаў не дапамагла. Прычыны гэтага – непаслядоўныя і супярэчлівыя ўказанні як ваенных улад, так і неспрагназіравана вялікая колькасць бежанцаў (іх партыі дасягалі дзесяткаў тысяч чалавек), а таксама стыхійнасць напрамкаў іх руху.

21 ліпеня 1915 г. генерал М.А. Данілаў загадаў генерал-губернатару І.А. Шабеку прыняць усе меры па ўладкаванні бежанцаў, выселеных з раёнаў дыслакацыі армій, а таксама навесці сярод іх



парадак [118, спр. 131, арк. 4]. 22 ліпеня І.А. Шабека адказаў М.А. Данілаву, што немагчыма прыняць усіх бежанцаў у вызначаных паветах, таму пачынаецца іх накіраванне ў глыб імперыі цераз паветы Мінскай губерні (у якіх, дарэчы, існавала пагроза эпідэміі халеры) [118, спр. 131, арк. 8]. 24 ліпеня І.А. Шабека атрымаў паведамленне, што масавае прымусовае высяленне спынена. Аднак колькасць эвакуіраваных ужо ў Гродзенскую губерню бежанцаў складала сотні тысяч чалавек. Справа ў тым, што камандаванне 3-й і 10-й армій ажыццявіла прымусовае высяленне дзесяткаў тысяч мірных жыхароў, якіх накіравалі ў Кобрынскі і Пружанскі паветы [118, спр. 131, арк. 212].

Для ваенных і цывільных улад у іх спробах вызваліць тыл арміі ад бежанцаў галоўная праблема заключалася ў тым, што руская армія летам 1915 г. адступала хутчэй, чым паспявалі эвакуіраваць бежанцаў у глыб імперыі. Таму бежанцы, выселеныя ў Гродзенскую губерню (як прыфрантавую тэрыторыю), у хуткім часе апынуліся тут у бліжэйшым тыле арміі. 4 жніўня 1915 г. М.А. Данілаў тэлеграмай № 616 паведаміў І.А. Шабеку, што бежанцы ў вялікай колькасці знаходзяцца каля войск. У Беластоку і іншых пунктах фронту адбылося іх скапленне, прычым бежанцы не ведаюць, куды ісці, галадаюць, бо імі ніхто не займаецца. М.А. Данілаў перадаў загад М.В. Аляксеева хутка вызваліць ад бежанцаў бліжэйшы тыл войск. І.А. Шабеку было даручана распрацаваць шляхі руху бежанцаў і забяспечыць іх медыцынскай і харчовай дапамогай, для чаго трэба было прыцягнуць УЗС і УСГ [119, спр. 438, арк. 5–7].

Адзначым, што ўказанні М.А. Данілава, накіраваныя І.А. Шабеку, амаль поўнасцю супадаюць з распрацаванай апошнім «Прыкладнай інструкцыяй». Як сведчаць падзеі, палажэнні гэтага дакумента былі выкладзены на паперы, аднак рэальна выкананы не былі. 5 жніўня І.А. Шабека атрымаў загад ужо мерамі паліцыі вывесці бежанцаў да чыгуначных станцый. Гродзенскі генерал-губернатар у сваю чаргу загадаў усім павятовым прадвадзіцелям дваранства забяспечыць высяленне бежанцаў з армейскіх тылоў. Ключавымі станцыямі, з якіх павінна была ажыццяўляцца адпраўка бежанцаў на ўсход, былі вызначаны Навагрудак, Баранавічы і Русінавічы. Да іх бежанцы накіроўваліся гужавымі шляхамі па вызначаных М.А. Данілавым маршрутах – ад Беластока да Навагрудка, ад Бельска да Баранавіч, ад Кляшчаляў да Баранавіч, ад Брэст-Літоўска да Русінавіч і ад Высока-Літоўска да Русінавіч [116, спр. 75, арк. 168–169].

6 жніўня 1915 г. генерал-губернатар І.А. Шабека асабіста выехаў у Беласток для ўпарадкавання руху бежанцаў. Па выніках гэтай паездкі ён падрыхтаваў даклад для генерала М.А. Данілава, у якім вызначыў хворую і стомленую жывёлу як галоўную пера-

шкоду руху бежанцаў. Таму на іх шляху пачалі ствараць рэквізіцыйныя камісіі для прыёмкі жывёлы і маёмасці. І.А. Шабека адзначыў вялізную колькасць бежанцаў, якой малыя сілы паліцыі не здольны былі кіраваць [119, спр. 438, арк. 22–24].

Далей падзеі разгортваліся пад уплывам пагрозы прарыву праціўнікам рускага фронту. 19 жніўня 1915 г. М.А. Данілаў паведаміў І.А. Шабеку, што жадаючыя пакінуць Гродзенскую губерню павінны зрабіць гэта тэрмінова [118, спр. 131, арк. 215]. Як адзначалася вышэй, у выніку Свянцянскага прарыву ўся Гродзенская губерня была захоплена праціўнікам, а неэвакуіраваныя бежанцы апынуліся пад нямецкай уладай, шмат з іх загінула ў час баёў.

Мінская губерня з-за свайго цэнтральнага месцазнаходжання прыняла асноўную колькасць бежанцаў, з якіх адны рухаліся транзітам у глыб імперыі, а другія пасяліліся тут на часовае жыхарства. Першапачаткова ў нязначнай колькасці бежанцы з'явіліся ў губерні ў першыя месяцы вайны. Пра іх клапаціліся дабрачынныя і грамадскія арганізацыі.

Губернскія ўлады пачалі займацца арганізацыяй дапамогі бежанцам у чэрвені 1915 г. пасля атрымання паведамлення ад армейскага камандавання, што мяркуецца выселіць з губерняў Царства Польскага некалькі соцень тысяч жыхароў [89, спр. 67, арк. 498]. У сувязі з гэтым 21 чэрвеня 1915 г. мінскі губернатар А.Ф. Гірс накіраваў павятовым прадвадзіцелям дваранства і спраўнікам распараджэнні па арганізацыі дапамогі бежанцам. Спраўнікам было загадана высветліць, колькі можа быць размешчана бежанцаў у паветах [88, спр. 9035, арк. 23]. У тэлеграме павятовым прадвадзіцелям дваранства губернатар падкрэсліваў, што ўладкаванне бежанцаў з'яўляецца складанай задачай, для выканання якой спатрэбіцца мабілізацыя ўсіх урадавых і грамадскіх сіл. Таму губернатар загадаў у кожным павеце губерні і ў Мінску стварыць павятовыя камітэты па аказанні дапамогі бежанцам. У састаў гэтых камітэтаў уключаліся прадстаўнікі ўсіх грамадскіх і дабрачынных арганізацый, а таксама паліцэйскія чыны і святары. Старшынёй прызначаліся павятовыя прадвадзіцелі дваранства. На павятовыя камітэты, перш за ўсё Пінскі, Мазырскі, Мінскі і Барысаўскі, быў ускладзены абавязак ствараць харчовыя, медыцынскія і сартавальныя пункты [88, спр. 9035, арк. 25]. Губернатар акцэнтаваў увагу паліцыі на тым, што частка бежанцаў можа быць выкарыстана на сельскіх і лясных работах, таму патрабаваў паведаміць пра колькасць працаздольных бежанцаў.

Спраўнікі аператыўна выканалі заданні і ў хуткім часе паведамілі мінскаму губернатару наступныя звесткі аб магчымых памерах прыёму бежанцаў у сваіх паветах. У Ігумені і мястэчках можна было размясціць 1,5 тыс., у вёсках – да 25 тыс. бежанцаў [88, спр. 9035, арк. 38], Бабруйскім павеце – 15 тыс. [88, спр. 9035,



арк. 40], Мінскім – 7750 [88, спр. 8985, арк. 3], Навагрудскім – 6 тыс. [88, спр. 8986, арк. 13], Мазырскім – 12 тыс. і ў Рэчыцкім – 10 тыс. бежанцаў [88, спр. 8988, арк. 2]. Такім чынам, паводле падлікаў паліцэйскіх чыноў у шасці паветах Мінскай губерні маглі прыняць каля 80 тыс. бежанцаў. Ужо на наступны дзень пасля распараджэння губернатара павятовыя ўлады дакладвалі аб пачатку працы мясцовых камітэтаў па ўладкаванні бежанцаў. Напрыклад, 22 чэрвеня 1915 г. адбылося пасяджэнне Бабруйскага павятовага камітэта, на якім з мэтай выканання распараджэння губернатара былі распрацаваны мерапрыемствы па ўладкаванні бежанцаў, перш за ўсё па пошуку для іх жылля і працы [88, спр. 8989, арк. 3]. 26 чэрвеня мінскі павятовы прадвадзіцель дваранства дакладваў, што на пасяджэнні 15 чэрвеня камітэт дапамогі бежанцам пачаў стварэнне прадуктовага і сартавальнага пунктаў на станцыі Мінск Аляксандраўскай чыгункі [88, спр. 8985, арк. 1].

Аднак дзейнасць па стварэнні мясцовых камітэтаў была прыпынена ў канцы чэрвеня 1915 г. Армейскае камандаванне паведаміла мінскаму губернатару, што масавага прымусовага высялення насельніцтва не адбудзецца [89, спр. 67, арк. 498]. Павятовыя ўлады таксама атрымалі паведамленне, што клопат пра бежанцаў, ускладзены на УЗС, і мясцовыя камітэты, не патрэбны [88, спр. 8985, арк. 2].

Адзначым пры гэтым, што распараджэнні ваенных улад адносна бежанцаў былі непаслядоўныя і супярэчлівыя. Ужо ў пачатку ліпеня 1915 г. камандаванне асобных армій ажыццявіла прымусовае высяленне насельніцтва ў глыб імперыі. Генерал М.А. Данілаў вырашыў накіроўваць на часовае жыхарства ў Мінскую губерню бежанцаў з Сувалкаўскай і Гродзенскай губерняў, а астатнія павінны былі рухацца цераз губерню транзітам. Пра гэта паведамілі мінскаму губернатару [88, спр. 9028, арк. 8].

4 ліпеня 1915 г. міністр унутраных спраў М.Б. Шчарбатаў тэлеграмай № 2044 накіраваў мінскаму губернатару інструкцыі па ўладкаванні бежанцаў з Гродзенскай і Сувалкаўскай губерняў. Па-першае, прапанавалася вызначыць месцы, дзе бежанцы змаглі б знайсці прытулак і працу. Па-другое, губернскай уладзе трэба было дакладна высветліць колькасць вакантных працоўных месцаў. Па-трэцяе, было загадана працягваць стварэнне губернскага і павятовых камітэтаў па аказанні дапамогі бежанцам (аб прычынах спынення гэтага працэсу ўказвалася вышэй). Для старых, дзяцей і маламаёмных бежанцаў трэба было абсталяваць харчовыя пункты. М.Б. Шчарбатаў засяродзіў увагу на тым, што сродкі на ўтрыманне бежанцаў да атрымання імі заробку будуць адпускацца ваеннымі ўладамі.

Адначасова губернатару паведамілі, што распараджэннем Вярхоўнага Галоўнакамандуючага на шляху руху бежанцаў ваенныя

ўлады павінны ўладкаваць пункты дапамогі бежанцам, і да гэтай справы згодна з указаннем Галоўнакамандуючага арміямі фронту будзе прыцягнута не толькі ваенная арганізацыя, але таксама цывільныя ўлады і дабрачынныя арганізацыі [89, спр. 67, арк. 498–499].

7 ліпеня 1915 г. пад старшынствам губернатара адбылася асобая нарада па пытанні аб размяшчэнні бежанцаў у Мінскай губерні. На ёй вызначыўся такі напрамак дзейнасці губернскіх і павятовых улад па аказанні дапамогі бежанцам, як распрацоўка агульных палажэнняў і аб'яднанне дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, што непасрэдна займаліся ўладкаваннем бежанцаў. Усе распрацаваныя на нарадзе мерапрыемствы абапіраліся на інструкцыі МУС. Нарада пастанавіла, што бежанцы могуць быць размешчаны ў наступных паветах: Мінскім, Слуцкім, Ігуменскім, Барысаўскім, Бабруйскім і Навагрудскім (за выключэннем Баранавіч). У сувязі з халерай пасяленне бежанцаў у Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах лічылася немагчымым. На мерапрыемствы па задавальненні патрэб бежанцаў быў зроблены запыт на аванс у 100 тыс. р. [89, спр. 67, арк. 498–499].

Пад старшынствам губернатара (які, дарэчы, адначасова на грамадскіх пачатках узначальваў і мінскае губернскае адзяленне Тацццянінскага камітэта) быў створаны губернскі камітэт, аб'яднаўшы дзейнасць аналагічных павятовых устаноў. Апошнія ў сваю чаргу кіравалі дзейнасцю валасных апякунстваў па пытаннях клопату пра бежанцаў. Згодна з інструкцыяй іх абавязкамі былі: размяшчэнне бежанцаў па вёсках без абмежавання інтарэсаў мясцовага насельніцтва, рэгістрацыя бежанцаў і пошук заробкаў для працаздольных, а таксама грашовая дапамога непрацаздольным [88, спр. 8985, арк. 25].

8 ліпеня 1915 г. у паветах атрымалі тэлеграму губернатара аб накіраванні бежанцаў Сувалкаўскай і Гродзенскай губерняў. 10–11 ліпеня адбылася нарада навагрудскага камітэта [88, спр. 8986, арк. 29–30], 13 ліпеня – пасяджэнне мінскай павятовай камісіі [88, спр. 8985, арк. 12]. На пасяджэннях камітэтаў у гэтых і іншых паветах былі распрацаваны мясцовыя мерапрыемствы па ўладкаванні бежанцаў, адобрана стварэнне валасных апякунстваў. Час паказаў, што мясцовыя камітэты не здолелі як след ўпарадкаваць рух бежанцаў, бо колькасць апошніх у параўнанні з той, што чакалася, аказалася неспрагназіравана вялікай. Як прызнавалі прадстаўнікі дабрачынных устаноў, нават ім не заўсёды было зразумела, дзе і колькі ўладкоўваць харчовых пунктаў для бежанцаў, рух якіх быў зменлівым і непрадказальным. У выніку, на шляху іх руху некалькі пунктаў побач змяняліся дзесяткамі вёрст, дзе не аказвалася ніякай дапамогі. Пры гэтым важнейшым клопатам мясцовых улад заставалася таксама забеспячэнне жыццядзейнасці вялікай колькасці людзей, перш за ўсё мясцовых жыхароў.



Асобна адзначым псіхалагічны аспект узаемаадносін бежанцаў і мясцовага насельніцтва. У стане глыбокага душэўнага дыскамфорту мясцовае насельніцтва пад уплывам ваенных падзей успрыняла рух бежанцаў як навалу зусім чужых людзей. Прытым яно ў большасці выпадкаў чакала сустрэць з боку пацярпеўшых ад вайны пакорлівасць і не магло ці не хацела падзяліць з імі іх гора. Бежанцы ж чакалі спачування і ўвагі да сябе як да людзей, прымусова і хутка выселеных з радзімы ваеннымі ўладамі. Але мясцовае насельніцтва не спяшалася дапамагаць бежанцам, якія злаваліся з-за іх абыякавасці. Вынікам стаў рост сацыяльнай напружанасці ў раёнах руху і часовага жыхарства бежанцаў. Гэта пацвярджаюць рапарты павятовых спраўнікаў [88, спр. 9033, арк. 36–37].

Бежанцы рухаліся цераз Мінскую губерню двума асноўнымі спосабамі – па чыгунцы і Маскоўска-Брэсцкай шашы. Асаблівую заклапочанасць ваенных і цывільных улад выклікаў рух бежанцаў па Маскоўска-Брэсцкай шашы. Пацярпеўшых ад вайны трэба было забяспечыць усім неабходным для жыцця, захаваць парадак у час іх руху і прыпынкаў, не дапусціць злачынстваў супраць мясцовага насельніцтва, якое таксама трэба было стрымліваць ад выпадаў супраць бежанцаў [73].

Па загадзе галоўнага начальніка Мінскай ваеннай акругі назіранне за бежанцамі, якія рухаліся па Маскоўска-Брэсцкай шашы, было ўскладзена на бабруйскага паліцмайстра Арлова. На падначаленай яму тэрыторыі Арлоў падзяліў маршрут руху бежанцаў на дзевяць частак (пунктаў). На кожным вёўся ўлік. Першы пункт – Мілавіды – павінен быў перадаваць інфармацыю пра колькасць бежанцаў на наступныя, каб тыя мелі магчымасць падрыхтавацца да іх прыёму. Апошнім пунктам быў Бабруйск, адкуль бежанцаў накіроўвалі ў Магілёўскую губерню [88, спр. 9028, арк. 3].

З сярэдзіны ліпеня 1915 г. назіраецца значнае павелічэнне колькасці бежанцаў у губерні. Паводле звестак на 27 ліпеня па Маскоўска-Брэсцкай шашы ў межах Мінскай губерні накіроўвалася каля 60 тыс. бежанцаў [88, спр. 9028, арк. 16]. Яны рухаліся пехатой і на падводах, з жывёлай і хатнім скарбам. Бежанцы не маглі знайсці для цяглавай жывёлы патрэбную колькасць фуражу, таму вымушаны былі прадаваць яе за бясцэнак ці кідаць прама на шашы. 24 ліпеня А.Ф. Гірс паведаміў міністру ўнутраных спраў і начальніку Мінскай ваеннай акругі, што згодна з атрыманымі даручэннямі за кошт крэдыту ў 100 тыс. р. арганізаваны харчовыя і ўрачэбныя пункты для бежанцаў Гродзенскай і Сувалкаўскай губерняў [88, спр. 9028, арк. 52]. Генерал М.А. Данілаў пацвердзіў у ліпені перасяленне ў Мінскую губерню толькі жы-

хароў указаных вышэй губерняў [88, спр. 9028, арк. 8]. Але ў выніку неразбярыхі тут асядалі і бежанцы з іншых губерняў. З-за гэтага матэрыяльныя сродкі пачалі размяркоўваць і сярод асеўшых бежанцаў не з Сувалкаўскай і Гродзенскай губерняў пры першапачатковым разліку колькасці грашовых сродкаў толькі на бежанцаў двух губерняў.

Колькасць бежанцаў у жніўні 1915 г. працягвала павялічвацца. Шматлікія павятовыя камітэты па аказанні дапамогі бежанцам звярталіся ў Мінск з просьбай выдзеліць ім дадатковыя сродкі, якіх катастрафічна не хапала. Згодна з паведамленнямі з Бабруйскага павета ў жніўні тут праходзілі дзесяткі тысяч бежанцаў у дзень. Бабруйскі спраўнік паведамляў, што бежанцы «рухаліся дзень і ноч няспынным патокам» [88, спр. 8989, арк. 84, 103].

Падкрэслім, што да выдання заканадаўчых актаў аб забеспячэнні патрэб бежанцаў дзейнасць дзяржаўных цэнтральных і мясцовых улад ажыццяўлялася ва ўмовах недастатковага фінансавання і адсутнасці агульнага кіраўніцтва ў гэтай справе.Ператварэнне бежанства ў агульнадзяржаўную праблему стала нечаканасцю для ўлад Расійскай імперыі, таму закон аб бежанцах выпрацоўваўся паскоранымі тэмпамі. Рыхтаваў яго земскі аддзел МУС пад наглядам міністра, які быў створаны яшчэ пры падрыхтоўцы рэформы 1861 г. і з таго часу займаўся справай перасялення насельніцтва [72].

У тлумачэннях да законапраекта міністр унутраных спраў М.Б. Шчарбатаў адзначыў, што галоўнай мэтай дадзенага дакумента з'яўляецца выяўленне кола асоб, якія прызнаюцца бежанцамі. Міністр таксама падкрэсліў, што кіраваць аказаннем дапамогі бежанцам трэба па прынцыпу адзінаначалля. Гэту справу павінна ўзяць на сябе і несці адказнасць за яе выкананне адна ўлада. Такой уладай М.Б. Шчарбатаў бачыў сваё міністэрства. Пры МУС і пад старшынствам міністра ўнутраных спраў ствараласяя Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў, якая павінна была каардынаваць дзейнасць усіх арганізацый і асоб у гэтай справе [121, спр. 10, арк. 1–3]. Пры МУС быў таксама арганізаваны асобы аддзел па бежанскай справе.

Падрыхтаваны МУС законапраект аб бежанцах быў папярэдне абмеркаваны на спецыяльнай нарадзе пад старшынствам намесніка міністра ўнутраных спраў, у якой удзельнічалі члены Дзяржаўнага Савета і Дзяржаўнай Думы, прадстаўнікі міністэрстваў. У жніўні 1915 г. законапраект аб бежанцах быў перададзены на абмеркаванне ў Дзяржаўную Думу, а потым у Дзяржаўны Савет. У цэлым Дума адобрыла законапраект МУС, аднак палічыла неабходным удакладніць некаторыя артыкулы. Дзяржаўная Дума прыняла закон «Аб забеспячэнні патрэб бежанцаў» 14 жніўня, а яго найвышэйшае зацвярджэнне адбылося 30 жніўня 1915 г.



[25, № 21, с. 9–10]. На падставе закона на патрэбы бежанцаў быў выдадзены крэдыт у 25 млн р. (да сярэдзіны верасня 1915 г. з іх ужо было выкарыстана 23,5 млн р.).

Параўнальны аналіз законапраекта МУС і зацверджанай рэдакцыі закона ад 30 жніўня 1915 г. дае магчымасць акрэсліць пазіцыі міністэрстваў і Дзяржаўнай Думы па справе ўладкавання бежанцаў [75].

Згодна з арт. 1 закона ад 30 жніўня 1915 г. «бежанцамі прызнаюцца асобы, што пакінулі мясцовасці, якім пагражаў праціўнік або ім ужо занятыя, альбо выселеныя распараджэннем ваенных ці цывільных улад з раёна баявых дзеянняў і выхадцы з варожых Расіі дзяржаў». Бежанцамі не лічыліся асобы, высланыя пад нагляд паліцыі, а таксама нямецкія і венгерскія падданыя [41, с. 2–3]. Такім чынам, дзяржава прызнала бежанцамі амаль усе катэгорыі выселенага насельніцтва, а менавіта эвакуіраваных служачых і іх сем'і, дэпарціраваных немцаў-каланістаў і яўрэяў, прымусова выселеных жыхароў заходніх губерняў і тых, хто па ўласнай ініцыятыве накіраваўся ў глыб імперыі.

Артыкулам 2 закона клопат аб забеспячэнні матэрыяльных патрэб і духоўных патрэбнасцей бежанцаў ускладаўся на міністра ўнутраных спраў, Галоўнаўпаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў, на губернатараў і граданачальнікаў, земскія ўстановы і гарадскія грамадскія кіраўніцтвы і мясцовыя камітэты. У арт. 3 асобна адзначалася, што аказанне дапамогі асобам, якія пацярпелі ад ваенных дзеянняў, складае таксама задачу Таццянінскага камітэта [41, с. 2].

Закон ад 30 жніўня 1915 г. сцвярджаў, што ўказаным у арт. 2–3 асобам і арганізацыям прадастаўляецца права заклікаць да супрацоўніцтва ўвогуле ўсе грамадскія сілы [41, с. 2]. Упаўнаважаны УЗС і УСГ М.М. Шчэпкін у перыядычным друку саюзаў пракаменціраваў такую пастаноўку пытання як незвычайную і новую для палітычнага жыцця Расіі [49, № 27–28, с.175]. Закон прадпісваў фінансаваць патрэбы бежанцаў з казны [41, с. 3]. Гэта адкрывала магчымасці ўдзелу ў справе дапамогі бежанцам не толькі дзяржаўным установам, але і шматлікім недзяржаўным арганізацыям, якія да выдання закона не здольны былі аказваць дастатковы ўзровень дапамогі з-за абмежаванасці сваіх фінансавых сродкаў.

Артыкулы 8–18 закона ад 30 жніўня 1915 г. датычалі арганізацыі і функцыяніравання Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў. Яна была створана для абмеркавання і аб'яднання ўсіх мер па забеспячэнні патрэб бежанцаў, а таксама для агульнага назірання за мэтазгодным выкананнем пэўных мер. Старшынёй Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў стаў міністр унутраных спраў (арт. 8). На апошняга ўскладвалася кіраўніцтва ўладкаван-

нем бежанцаў у цэлым і размеркаваннем крэдытаў у прыватнасці (арт. 19) [41, с. 3, 6].

Паўнамоцны састаў Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў згодна з арт. 10 закона быў вызначаны наступны: па сем членаў Дзяржаўнай Думы і Дзяржаўнага Савета, якія выбіраліся гэтымі ўстановамі (у 1916 г. іх колькасць павялічылі да 9, усяго – 18); прадстаўнікі міністэрстваў: ваеннага, замежных спраў, унутраных спраў, фінансаў, народнай асветы, шляхоў зносін, гандлю і прамысловасці, галоўнага ўпраўлення землеўпарадкавання і земляробства – па адным ад кожнага ведамства.

У нараду ўваходзілі таксама па адным прадстаўніку ад Таццянінскага камітэта, Чырвонага Крыжа, упраўлення вярхоўнага начальніка санітарнай і эвакуацыйнай часці, УЗС і УСГ і ад нацыянальных камітэтаў – польскага, армянскага, яўрэйскага, латышскага, літоўскага і грузінскага. Акрамя таго, у склад нарады былі ўключаны Галоўнаўпаўнаважаныя па ўладкаванні бежанцаў і кіраўнік спраў гэтай установы [41, с. 3–4].

У законапраекце МУС прадугледжваўся ўдзел пяці членаў Дзяржаўнай Думы і пяці членаў Дзяржаўнага Савета, якія павінны былі не выбірацца, а запрашацца міністрам унутраных спраў [121, спр. 10, арк. 4]. Пры гэтым у законе захавалася палажэнне (арт. 12), згодна з якім старшыня нарады можа запрашаць на пасяджэнні любых асоб, удзел якіх прызнае карысным [41, с. 4]. Дзякуючы гэтаму на нарадзе заўсёды можна было забяспечыць большасць праўрадава настроеных.

У параўнанні з законапраектам МУС у законе ад 30 жніўня 1915 г. было пашырана кола пытанняў, якія падлягалі абмеркаванню Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў. У першым варыянце – пытанні агульнага размеркавання крэдытаў, клопат аб руху і ўладкаванні бежанцаў, ацэнка маёмасці, пакінутай імі і ўвогуле страт насельніцтва ў сувязі з ваенным становішчам, кампенсацыя за страты, аказанне пазыковай дапамогі [121, спр. 10, арк. 5]. У канчатковую рэдакцыю закона дадаткова ўключаны клопат аб задавальненні духоўных патрэбнасцей бежанцаў, распрацоўка праекта наказу Галоўнаўпаўнаважаным тылу, парадак стварэння і дзейнасці мясцовых камітэтаў, а таксама вызначэння іх кіраўніцтва [41, с. 5].

Пазней вызначэнне дзеяння арт. 22 закона ад 30 жніўня 1915 г. аб парадку ажыццяўлення мясцовага клопату пра бежанцаў стала галоўнай прычынай спрэчак паміж урадам і грамадскімі арганізацыямі, перш за ўсё УЗС і УСГ. У законапраекце МУС забеспячэнне клопату пра бежанцаў на месцах ускладалася перш за ўсё на начальнікаў губерняў і граданачальнікаў, а таксама на земскія і гарадскія самакіраванні. У мясцовасцях, дзе не існавалі земствы і гарадскія самакіраванні, МУС меркавала ўскласці клопат на



абывацельскія камітэты пад старшынствам губернатараў ці павятовых прадвадзіцеляў дваранства [121, спр. 10, арк. 5]. Закон ад 30 жніўня змяшчаў іншую фармулёўку – «мясцовы клопат аб бежанцах і іх далейшым лёсе ўскладаецца на земскія ўстановы і гарадскія грамадскія кіраўніцтвы, з прадастаўленнем ім права... ствараць асобыя камітэты». У мясцовасцях, дзе не былі ўведзены земскія і гарадскія самакіраванні, мясцовы клопат пра бежанцаў ускладаўся на губернскія, павятовыя і гарадскія камітэты дапамогі бежанцам. Гэтыя камітэты ствараліся з прадстаўнікоў зацікаўленых арганізацый і кіраваліся губернскімі ўпаўнаважанымі МУС, астатнімі асобамі, выбранымі губернскімі камітэтамі [41, с. 6].

Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў пачала сваю працу з верасня 1915 г. Міністр унутраных спраў у поўнай меры выкарыстаў свае правы запрашаць на пасяджэнні нарады патрэбных яму асоб, чым, як ужо адзначалася, была забяспечана большасць праўрадава настроеных асоб у час працы нарады. Напрыклад, членаў Дзяржаўнага Савета было 13 (а разам з Галоўнаўпаўнаважанымі па ўладкаванні бежанцаў і старшынёй Таццянінскага камітэта – 16), а па законе – 7; членаў Дзяржаўнай Думы – 15, а па законе – таксама 7; ад МУС – 23 прадстаўнікі плюс 12 раённых галоўнаўпаўнаважаных па бежанцах і кіраўнік спраў МУС, усяго – 36. Пры гэтым у час галасавання не дзялілі на ўваходзячых у састаў нарады (арт. 10) і на запрошаных на пасяджэнні (арт. 12) [49, № 27–28, с. 180–181].

10 верасня 1915 г. пад старшынствам міністра ўнутраных спраў М.Б. Шчарбатава (на ўсіх наступных пасяджэннях былі намеснікі міністра) адбылося першае пасяджэнне Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў. Ва ўступнай прамове старшыня абмінуў праблему прымусовага высялення насельніцтва заходніх губерняў, якое грамадства лічыла асноўнай прычынай масавага руху бежанцаў. Галоўнай прычынай бежанства М.Б. Шчарбатаў назваў дзеянні войск працiўніка, накіраваныя супраць мясцовых жыхароў. Было заўважана, што справу аказання дапамогі бежанцам ускладнілі недасканаласць шляхоў зносін і цяжкія санітарныя ўмовы, якія паслужылі прычынай шматлікіх інфекцыйных захворванняў [121, спр. 1, арк. 1].

Свае меркаванні па пытаннях забеспячэння патрэб бежанцаў выказалі прадстаўнікі як дзяржаўных – Галоўнаўпаўнаважаныя на франтах С.І. Зубчанінаў і М.П. Урусаў, так і грамадскіх арганізацый. Прадстаўнік ЗемГора М.М. Шчэпкін у сваім выступленні закрануў самае вострае пытанне – пра прымусовае высяленне мірных жыхароў. Было адзначана, што гэтая з'ява працягвалася і пасля выдання загада № 523 Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, які такую меру фармальна адмяніў. М.М. Шчэпкін азнаёміў чле-

наў нарады з вывадамі з’езда УСГ, які адбыўся 7–9 верасня ў Маскве, і прызнаў прымусовае высяленне дапушчальным толькі ў выключных выпадках, выкліканых сапраўднай ваеннай неабходнасцю [121, спр. 1, арк. 2].

Сярод удзельнікаў пасяджэння самы радыкальны пункт гледжання выказаў член Дзяржаўнай Думы Л.К. Дымша, які абвясціў прымусовае і пагалоўнае высяленне насельніцтва ўвогуле недапушчальным. У адказ князь С.В. Чацвярцінскі адзначыў, што Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў не павінна выказвацца супраць добраахвотнай ці прымусовай эвакуацыі насельніцтва, а толькі паказаць карціну бежанства перад ваеннымі ўладамі, якія, зыходзячы з ваенных меркаванняў, самі павінны вырашаць што рабіць. Па выніках дыскусіі нарадзе было прапанавана прыняць адну з дзвюх супрацьлеглых рэзалюцый. Першая адлюстроўвала пазіцыю недапушчальнасці прымусовага высялення; другая дазваляла ваенным уладам пры ваеннай і тэхнічнай неабходнасці з асцярожнасцю прымаць рашэнне аб высяленні насельніцтва. Першую рэзалюцыю нарада адхіліла, а другая была зацверджана абсалютнай большасцю [121, спр. 1, арк. 3–4]. Гэтым самым Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў пацвердзіла свой статус як дарадчага органа пры МУС, а найбольш вострыя і небяспечныя пытанні пагадзілася пакінуць на меркаванне ваенных улад. З другога боку, выказаныя на яе пасяджэннях прагрэсіўныя погляды грамадскіх дзеячаў былі накіраваны на абарону інтарэсаў бежанцаў.

Шырокі спектр разглядаемых пытанняў і праблем бежанцаў патрабаваў вызначэння ў дзейнасці нарады асобных напрамкаў. Таму на падставе арт. 17 закона ад 30 жніўня 1915 г. у рамках Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў было створана некалькі камісій. Першая – па агульных пытаннях на чале з князем В.М. Валконскім. Другая – па кампенсацыі страт, выплаце часовых пазык і аказанні грашовай дапамогі бежанцам – пад старшынствам члена Дзяржаўнага Савета А.І. Лыкошына. Трэцяя камісія займалася пытаннямі ўладкавання бежанцаў у тыле і распрацоўкай праекта наказу Галоўнапаўнаважаных тылу. Яна працавала пад старшынствам члена Дзяржаўнага Савета графа А.А. Бобрынскага. Чацвёртая – па размеркаванні крэдытаў на задавальненне патрэб бежанцаў і ўсталяванні парадку адказнасці за выкарыстанне гэтых крэдытаў – дзейнічала пад кіраўніцтвам таварыша міністра ўнутраных спраў М.В. Плеве [121, спр. 1, арк. 5]. У далейшым гэтая камісія выконвала галоўную ролю ў дзейнасці нарады, бо менавіта праз яе праходзілі асноўныя фінансавыя сродкі, што выдаткоўваліся дзяржавай на патрэбы бежанцаў.

Разгледзім асноўныя моманты працы ўказаных вышэй камісій. Трэцяя займалася стварэннем інстытута Галоўнапаўнаважаных



па ўладкаванні бежанцаў у тыле. Галоўнапаўнаважаныя на франтах пачалі працаваць з ліпеня 1915 г., але толькі ў франтавых і прыфрантавых губернях. Рассяленнем і ўладкаваннем бежанцаў у глыб імперыі павінны былі займацца Галоўнапаўнаважаныя ў тыле. Для камісіі галоўным аспектам пры вызначэнні правоў і абавязкаў Галоўнапаўнаважаных у тыле сталі іх суадносіны з паўнамоцтвамі губернатараў. У спецыяльным наказе, распрацаваным камісіяй, абавязкі Галоўнапаўнаважаных у тыле былі акрэслены даволі абстрактнымі фармулёўкамі: «аб’ядноўваць дзейнасць», «азнаёміцца са становішчам», «неаслабна назіраць», «бліжэйшым чынам узгадняць», «падтрымліваць жывую сувязь» і «пастаянна паведамляць» [88, спр. 9028, арк. 546]. Галоўнага – а менавіта распарадчай улады і права распараджацца крэдытамі – Галоўнапаўнаважаным у тыле не прадаставілі. Упаўнаважаны ЗемГора М.М. Шчэпкін у спецыяльным дакладзе, прысвечаным працы Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў, указваў, што ў гэтым выпадку жаданне дзяржаўнай улады захаваць прэстыж мясцовай улады не дазволіла надзяліць Галоўнаўпаўнаважаных у тыле паўнамоцтвамі, неабходнымі для сапраўднага аб’яднання справы аказання дапамогі бежанцам [49, № 27–28, с. 182–183].

Важнае месца ў дзейнасці камісіі па агульных пытаннях працягвала займаць праблема прымусовага і добраахвотнага высялення. Наконт апошняга было справядліва заўважана, што эвакуацыя цывільнай адміністрацыі і духавенства выклікала ўцёкі насельніцтва. Калі ж людзі бачылі арганізаванасць з боку мясцовай улады, то кожны мог спакойна вырашыць, эвакуіравацца яму ці не [121, спр. 1, арк. 13–15]. Шмат заўваг выказвалася ў адрас царквы. Са спецыяльна падрыхтаванага даклада вынікае, што ў многіх мясцінах, якім пагражала нашэсце ворага, клірыкі пакідалі наседжаныя месцы раней за вернікаў. Мясцовыя святары на шляху руху бежанцаў не заўсёды з’яўляліся да іх для духоўнага суцяшэння, выканання сваіх абавязкаў. У некаторых парафіях нават узнікалі перашкоды пры размяшчэнні бежанцаў у манастырах [121, спр. 1, арк. 64–65].

Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў палічыла праблему духоўнага стану пацярпеўшых ад вайны адной з асноўных. Для яе вырашэння ў рамках нарады стварылі яшчэ адну камісію – па задавальненні духоўных патрэбнасцей бежанцаў. На яе пасяджэннях прадстаўнікі царквы азнаёміліся з заўвагамі ў свой адрас і пагадзіліся з папрокамі за асабістую неарганізаванасць і недастатковую энергічнасць, але рашуча адхілілі абвінавачанні ў адсутнасці ўсведамлення пастырскага абавязку. Было вырашана накіраваць святароў і ксяндзоў у вызначаныя па колькасці групы бежанцаў для задавальнення духоўных патрэбнасцей апошніх [121, спр. 1, арк. 65–68].

Камісія па задавальненні духоўных патрэбнасцей бежанцаў таксама была заклікана прыняць меры па аблягчэнні стварэння актаў грамадзянскага стану бежанцаў, усталяванні апекі над малалетнімі бежанцамі, забеспячэнні дзяцей бежанцаў магчымасцю вучыцца, абароне жанчын-бежанак ад прастытуцыі. Яшчэ адной задачай камісіі было забеспячэнне прававой абароны бежанцаў, якія страцілі сваю маёмасць і сталі поўнасцю безабароннымі перад сваволъствам ваенных і цывільных улад [121, спр. 23, арк. 1–10].

Адна з самых чакаемых бежанцамі распрацовак нарады – праект аб пазыковай дапамозе пацярпеўшым ад вайны. Яго падрыхтоўкай у кастрычніку – лістападзе 1915 г. займалася камісія А.І. Лыкошына [121, спр. 24, арк. 1, 14]. Праект часовых правіл па выдачы пазык перадалі для зацвярджэння ў нараду і з нявялікімі змяненнямі прынялі [121, спр. 1, арк. 72–85]. Аднак толькі праз паўгода, 13 мая 1916 г., адбылося найвышэйшае зацвярджэнне «Часовых правілаў аб аказанні пазыковай дапамогі пацярпеўшаму ад вайны насельніцтву».

З-за таго, што менавіта страта бежанцамі маёмасці і сродкаў да існавання не дазваляла ім у поўнай меры аднавіць сваё жыццё на новым месцы жыхарства, пацярпеўшыя ад вайны чакалі пазыковай дапамогі ад дзяржавы. Але «Часовыя правілы аб аказанні пазыковай дапамогі пацярпеўшаму ад вайны насельніцтву» насілі дыскрамінацыйны характар і значна абмяжоўвалі катэгорыі насельніцтва, якія маглі атрымаць пазыку. У заўвазе да арт. 1 указвалася, што гэтыя правілы не распаўсюджваюцца на асоб, якія атрымліваюць казённы бежанскі прадуктовы і кватэрны паёк. А менавіта гэтая катэгорыя бежанцаў была самай неўладкаванай і збяднелай [26, № 40, с. 96].

Згодна з «Часовымі правіламі аб аказанні пазыковай дапамогі пацярпеўшаму ад вайны насельніцтву» пазыкі маглі выдавацца асобам, валодаўшым зямлёй па-за межамі гарадскіх паселішчаў; уладальнікам нерухомасці ў гарадах і іншых гандлёва-прамысловых пунктах; асобам, якія маюць уклады ў крэдытных установах, прыпыніўшых дзейнасць з-за ваеннага становішча (арт. 2); у асобных выпадках – іншым асобам, прызнаным дастаткова добрапрыстойнымі ў адносінах вяртання пазык. Максімальны памер пазыкі не мог перавышаць 6 тыс. р. (арт. 5). Па распараджэнні міністра ўнутраных спраў для выдачы пазык утвараліся камітэты – цэнтральны ў Петраградзе і мясцовыя ў губернях (арт. 24) [26, № 40, с. 96–101].

Пасля выдання закона ад 30 жніўня 1915 г. дзейнасць цэнтральных і мясцовых цывільных улад ажыццяўлялася ў наступных умовах. Перанясенне ваенных дзеянняў непасрэдна ў заходнія губерні стала падставай для далейшага як прымусовага, так і



добраахвотнага высялення насельніцтва. У так званы эвакуацыйны перыяд працы «Поўначдапамогі», які ахопліваў жнівень – кастрычнік 1915 г., было адкрыта каля 300 устаноў па абслугоўванні бежанцаў у час руху (пасадка на чыгуначных станцыях, баракі і начлежкі, ліквідацыйныя камісіі, фуражныя склады, кузні); звыш 340 устаноў па харчаванні бежанцаў (пункты з выдачай гарачай ежы, сухога пайка, гарбаты, хлеба); каля 230 медыка-санітарных устаноў (бальніцы, урачэбныя станы, эпідэміялагічныя атрады, халерныя баракі, аптэкі), а таксама каля 50 устаноў па доглядзе за нямоглымі і па пошуку працы для бежанцаў [38, № 2, с. 10].

Харчовымі пунктамі «Поўначдапамогі» са жніўня па кастрычнік 1915 г. выдадзена каля 40 млн пайкоў, у бальніцах дапамогу атрымалі 200 тыс. чалавек [38, № 2, с. 10]. Прадстаўнікі С.І. Зубчанінава, каб аблегчыць становішча бежанцаў у час руху, імкнуліся аб'яднаць іх у групы. Праз аб'явы ў друку для кіраўніцтва і суправаджэння апошніх запрашаліся людзі так званых інтэлігентных заняткаў, пераважна настаўнікі і студэнты [88, спр. 9028, арк. 264]. У Мінскай губерні С.І. Зубчанінаў звярнуўся да губернатара па садзейнічанне ў пошуку асоб для суправаджэння бежанцаў. 12 жніўня 1915 г. было распаўсюджана паведамленне ад мінскага губернатара, што эвакуіраваныя члены ўрадавых і грамадскіх устаноў, якія жадаюць суправаджаць бежанцаў да месца прызначэння, павінны пісьмова звяртацца ў канцылярыю. У НГАБ у Мінску захаваліся некалькі дзесяткаў такіх зваротаў [88, спр. 9034, арк. 4–10, 23–24].

У лістападзе 1915 г. асноўная ўвага «Поўначдапамогі» была накіравана на забеспячэнне асеўшых бежанцаў. З 1 лістапада 1915 г. па 1 ліпеня 1916 г. агульная колькасць яе ўстаноў узрасла з 891 да 2142 [38, № 2, с. 10]. Бясплатныя пайкі ў гэты перыяд выдаваліся толькі дзецям і старым, а дарослых мужчын і жанчын імкнуліся працаўладкаваць. Колькасць харчовых устаноў да 1 ліпеня 1916 г. дасягнула 456, імі карысталіся 386 063 бежанцы (79,6 % на прыфрантавых тэрыторыях і 20,4 % у тылавых). На казённыя сродкі «Поўначдапамога» набыла для бежанцаў адзення на суму 10 млн р., пацярпеўшым ад вайны было раздадзена звыш 2 млн рэчаў.

Медыцынская дапамога аказвалася ў двух варыянтах – стацыянарным і выязным. Да 1 ліпеня 1916 г. агульная колькасць бальніц дасягнула 80 устаноў з 5 тыс. ложкаў, працавалі таксама 141 урачэбны і фельчарскі пункт з амбулаторнай дапамогай, 21 барак, 10 «лятучых» урачэбна-харчовых станаў. Устаноў па апецы і адукацыі было больш за 940 [38, № 3, с. 9–10]. Значнае месца ў дзейнасці «Поўначдапамогі» займала выдача грашовай дапамогі за рэквізаваную і знішчаную маёмасць. У 1916 г. па рашэнні

ваенных улад спецыяльна для разлікаў з насельніцтвам стварылі ліквідацыйныя камісіі [95, спр. 764, арк. 20].

У канцы 1915 г. для садзейнічання «Поўначдапамозе» на Заходнім фронце ствараліся ў рэгіёнах апекі, палажэнне аб якіх зацверджана 21 снежня 1915 г. Спектр дзейнасці мясцовых апек быў шырокі: пошук жылля і працы для бежанцаў, выдача непрацаздольным пайка, забеспячэнне бежанцаў і (новае ў працы «Поўначдапамогі») мясцовага насельніцтва прадуктамі харчавання і рэчамі першай неабходнасці. Звычайна апекі ствараліся па адной на воласць [97, спр. 7, арк. 28].

Ваенныя ўлады ўважліва назіралі за працай арганізацыі С.І. Зубчанінава. Аб эфектыўнасці дзейнасці апошняй перыядычна цікавіліся ў адпаведных армейскіх начальнікаў. У снежні 1915 г. генерал М.А. Данілаў накіраваў камандуючым 1-й, 2-й, 3-й, 4-й і 10-й армій запыт аб характары дзейнасці ў франтавой паласе шэрагу арганізацый, у тым ліку і «Поўначдапамогі». Армейскае камандаванне неадназначна ацаніла працу апошняй і выказала шмат крытычных заўваг. Камандуючы 1-й арміяй указаў, што дзейнасць «Поўначдапамогі» зусім не заўважаецца, пры гэтым быў вядомы выпадак няўдалай арганізацыі і прыёму бежанцаў на станцыі Навагрудак у верасні 1915 г. Камандуючыя 2-й, 3-й і 4-й арміямі дзейнасць «Поўначдапамогі» адобрылі, аднак адзначылі нескаардынаванасць з працай іншых арганізацый. Камандуючы 10-й арміяй заўважыў, што члены «Поўначдапамогі» жадаюць дапамагчы, але не здольны дзейнічаць эфектыўна з-за адсутнасці ў арганізацыі выканаўчых органаў [119, спр. 447, арк. 2–33]. У канчатковым дакладзе Галоўнакамандуючаму арміямі Заходняга фронту генерал М.А. Данілаў ацаніў дзейнасць «Поўначдапамогі» як малазначную. Такая адзнака перш за ўсё тлумачылася невялікай дапамогай з боку гэтай арганізацыі на карысць арміі [119, спр. 447, арк. 43–44].

Адзначым, што іншыя крыніцы таксама ўказваюць на зняважлівае стаўленне армейскага камандавання да арганізацыі С.І. Зубчанінава. У Стаўцы шмат хто лічыў (аб гэтым узгадваецца ў мемуарах М. Лемке), што ўпаўнаважаныя па справах бежанцаў атрымліваюць і бескантрольна трацяць вялізныя сумы, а афіцэры гаварылі: «Што там творыцца – цяжка сабе ўявіць, асабліва ў «Поўначдапамозе» сляпога С.І. Зубчанінава, празванай «Поўначнемач» ці «Сабепомач» [76, с. 281].

У той жа час дакументы пацвярджаюць, што кіраўніцтва «Поўначдапамогі» старалася сур'ёзна клапаціцца аб рэпутацыі сваёй установы. Калі ў прэсе пачалі з'яўляцца звесткі пра махінацыі ўпаўнаважаных пры скупцы коней у насельніцтва, С.І. Зубчанінаў распарадзіўся даследаваць усе падобныя паведамленні, нават змешчаныя ў друку [38, № 1, с. 12; № 2, с. 13].



Для губернскай і павятовай адміністрацыі рух бежанцаў набыў катастрафічныя памеры ў верасні 1915 г., калі пасля нямецкага прарыву вялікія масы людзей накіраваліся ў глыб імперыі. У сярэдзіне верасня мінскі губернатар А.Ф. Гірс паведаміў у Санкт-Пецярбург, што рух бежанцаў цераз губерню значна пашырыўся. Па некаторых трактах за суткі праходзіла ад 10 да 20 тыс. чалавек [88, спр. 9033, арк. 54]. Маршрут іх руху быў загадзя распрацаваны на паперы, але недастаткова прадуманы. Бежанцам не хапала харчовай і медыцынскай дапамогі. Мала было людзей для іх суправаджэння і аховы. Галоўны недахоп у дзейнасці дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый – адсутнасць каардынацыі. Гэтыя факты выразна характарызуюць вынікі арганізацыйнай працы губернскага і павятовых камітэтаў.

Старшыня камісіі па эвакуацыі Мінска ў справаздачы пра стан станцыі Мінск Любава-Роменскай чыгункі ад 14 верасня 1915 г. паведамляў пра жудасны санітарны стан чыгуначных пуцей, дзе стаялі вагоны з бежанцамі [88, спр. 9028, арк. 266]. 17 верасня мінскі губернатар паведаміў С.І. Зубчанінаву пра знаходжанне на вакзальнай тэрыторыі станцыі Мінск звыш 6 тыс. бежанцаў. 21 верасня іх колькасць дасягнула 8 тыс. На чыгуначных станцыях Старыя Дарогі і Бабруйск згрупавалася каля 60 тыс. А.Ф. Гірс падкрэсліваў у дакладах, што санітарныя ўмовы ўтрымання бежанцаў сур'ёзна пагражаюць гарадскому парадку і грамадскаму спакою [88, спр. 9028, арк. 288]. Начальнік мінскага аддзялення жандарскага паліцэйскага ўпраўлення адзначаў, што стрымліванне руху новых бежанцаў на вакзал і чыгуначныя пуці «дасягаецца неймавернымі намаганнямі ўзмоцненых паліцэйскіх атрадаў» [88, спр. 9028, арк. 352].

Становішча ў паветах Мінскай губерні таксама было складаным. 16 верасня з Ігумена паведамілі, што туды кожны дзень прыбываюць дзесяткі тысяч бежанцаў. На экстранным пасяджэнні Ігуменскага павятовага камітэта па ўладкаванні бежанцаў стан спраў характарызаваўся наступным чынам: «Цераз увесь павет ад Мінска на Ігумен, Беразіно, Магілёў ідуць суцэльнай масай бежанцы, якія са сваімі табарамі ўначы займаюць прастору да пяці вёрст у акружнасці... Бежанцы ідуць у такой каласальнай колькасці, што без разбору знішчаюць на сваім шляху ўсе запасы харчавання мясцовага насельніцтва» [88, спр. 9033, арк. 20].

На 1 верасня 1915 г. у Баранавічах налічвалася каля 60 тыс. бежанцаў. Яны накіроўваліся сюды як на вузлавую станцыю двух чыгуначных шляхоў і амаль не рухаліся далей. Прычынамі гэтага згодна з рапартамі ваенных назіральнікаў былі як надзеі бежанцаў на вяртанне дадому, так і незразумелыя паведамленні ўлад аб далейшым іх руху, а таксама шматлікія захворванні. У рапартах службовых асоб зноў адзначалася адсутнасць узгодненасці ў

працы розных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам [119, спр. 440, арк. 134–138].

15 верасня 1915 г. губернатар склікаў асобую нараду па пытанні ўрэгулявання руху бежанцаў у Мінску і наваколлі. На ёй у чарговы раз разглядалася праблема каардынацыі дзейнасці ўсіх устаноў па аказанні дапамогі бежанцам. Згодна з рэестрам бежанцам у Мінскай губерні дапамагалі наступныя ўстановы і грамадская камітэты: «Поўначдапамога», Таццянінскі камітэт, УЗС, УСГ, Цэнтральны абывацельскі камітэт губерняў Царства Польскага, аддзяленне Літоўскага камітэта па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны, Польскі камітэт, Таварыства дапамогі бедным яўрэям Мінска, суполка «Дабрачыннасць», Яўрэйскі камітэт [88, спр. 9038, арк. 74].

У другой палове верасня 1915 г. губернатар пачаў тэрмінова рассылаць загады аб скліканні асобых нарад мясцовых павятовых камітэтаў. Гэтыя нарады павінны былі падзяліць тракты, па якіх рухаліся бежанцы, на асобныя раёны. Кожны раён замацоўваўся за паліцэйскім чыноўнікам. Праблема захавання парадку працягвала заставацца адной з самых вострых. Нагляд за рухам і прыпынкамі бежанцаў павінны былі ажыццяўляць усе паліцэйскія службовыя асобы. У сувязі з мабілізацыяй чыгункі на ваенныя перавозкі і эвакуацыю прамысловасці бежанцы пэўны час не маглі карыстацца гэтым відам транспарту. Паўстала праблема захавання бежанцамі цяглавай жывёлы, якую скуплялі як прыватныя асобы, так і рэквізіцыйныя камісіі, што патрабавала ад улад вялікай колькасці фуражу і арганізацыі ветэрынарнай дапамогі [88, спр. 9033, арк. 116]. Падкрэслім, што восенню губернскія ўлады ў тэрміновым парадку паведамлялі дырэктывы, якія былі аналагічныя тым, што выдаваліся яшчэ летам і, мяркуючы па іх паўторным паяўленні, фактычна не былі паспяхова выкананы.

Кастрычнік 1915 г. прынёс ваенным і цывільным уладам новыя клопаты. Штаб 4-й арміі паведаміў мінскаму губернатару, што ў шмат якіх месцах цывільныя ўлады не толькі не дапамагаюць, але і перашкаджаюць руху бежанцаў. Апошніх бессістэмна перамяшчалі з месца на месца. Многія бежанцы, якіх накіравала паліцыя, блукалі ў радыусе двух – трох дзесяткаў квадратных вёрст месяцамі. У выніку ваеннае камандаванне Заходняга фронту назірала наступную дзіўную карціну. Бежанцаў, якія ўжо прайшлі Мінск і накіроўваліся ў Смаленск, вярнулі назад нейкія паліцэйскія ўлады. Пры гэтым пастаяннае месцапражыванне бежанцаў было занята праціўнікам. Далей пазіцый арміі яны прасунуцца не маглі, вярнуцца таксама не мелі магчымасці, таму і асядалі каля войска. Ваенныя ўлады хваляваліся, што бядотнае становішча бежанцаў у бліжэйшым тыле дрэнна паўплывае на маральны настрой войска. Здаралася, што салдаты сустракаліся з іх блукаючымі сем'ямі, няшчасны выгляд якіх прыгнятаў вайскоўцаў [88, спр. 9028, арк. 423].

У раёне Замір'я Навагрудскага павета, дзе размяшчаўся грэнадзёрскі корпус, знаходзілася некалькі тысяч бежанцаў. Яны пражывалі ў пакінутых хатах ці лясах. Камандаванне корпуса высяляла бежанцаў у іншыя раёны, дзе таксама знаходзіліся армейскія часці, якія ў сваю чаргу высялялі бежанцаў, і тыя зноў траплялі ў раён дыслакацыі грэнадзёрскага корпуса. Бежанцаў фактычна перамяшчалі па замкнёным коле, а ў гэты час сярод іх павялічвалася колькасць захварэўшых і памерлых [88, спр. 8986, арк. 147].

Праблема зваротнага руху бежанцаў вельмі непакоіла ўлады. Сярод прычын гэтай з'явы трэба адзначыць не толькі неарганізаванасць і няўзгодненасць у дзеяннях мясцовых улад, але і душэўны стан бежанцаў, сумаваўшых па радзіме. Штаб Вярхоўнага Галоўнакамандуючага выдаў спецыяльны загад аб забароне руху назад бежанцаў у заходнія і паўднёва-заходнія губерні. Па загадзе мінскага губернатара былі абследаваны тылы 4-й арміі па тракце Койданава – Стоўбцы – Мір – Гарадзея – Сноў. Як паведаміў мінскі віцэ-губернатар, у гэтым раёне налічвалася каля 35 тыс. бежанцаў, прычым большасць з якіх знаходзілася пад адкрытым небам. Толькі некаторыя з іх знайшлі прытулак у вёсках [88, спр. 8639, арк. 31].

На асобай нарадзе ў Стаўцы армейскае камандаванне запатрабавала ад мясцовых улад тэрмінова эвакуіраваць з тылу арміі ўсіх бежанцаў. 8 кастрычніка 1915 г. у Мінску адбылася нарада, прысвечаная пытанню знаходжання бежанцаў у тыле армій. Было вырашана тэрмінова арганізаваць адпраўку бежанцаў на ўсход па чыгунцы са станцый Гарадзея, Стоўбцы, Негарэлае і Койданава. УЗС і «Поўначдапамозе» даручылі стварыць на станцыях харчова-медыцынскія пункты [88, спр. 8639, арк. 31].

У кастрычніку 1915 г. таксама паўстала пытанне аб арганізацыі дапамогі насельніцтву мясцовасцей Пінскага павета, вызваленых ад праціўніка. 15 кастрычніка адбылася асобая нарада па гэтай праблеме, на якой было вырашана стварыць адзіны павятовы орган на чале з Пінскім прадвадзіцелем дваранства [88, спр. 8639, арк. 42].

У лістападзе 1915 г. да выканання губернатарскіх абавязкаў прыступіў А.Г. Чарняўскі. На тэрыторыі Мінскай губерні на той час знаходзілася каля 100 тыс. бежанцаў [88, спр. 9029, арк. 28]. Каля 20 тыс. з іх жылі ў буданах ці ўвогуле не мелі даху. Мінскі губернатар звярнуўся да ваенных улад па дапамогу для высялення з губерні неўладкаваных бежанцаў. Ваенныя ўлады згадзіліся дапамагчы, але з умовай высялення з губерні ўсіх бежанцаў. С.І. Зубчанінаў падтрымаў мінскага губернатара ў імкненні эва-

куіраваць толькі неўладкаваных беженцаў. У выніку было вырашана высяляць толькі не знайшоўных прытулку ў мясцовага насельніцтва і не меўшых стабільнага заробку. Але з паветаў паступалі звесткі, што паліцэйскія ўлады высяляюць усіх беженцаў без разбору [88, спр. 9029, арк. 1, 3; спр. 9036, арк. 1–3; 119, спр. 435, арк. 73 ].

13 лістапада А.Г. Чарняўскі склікаў губернскую нараду для абмеркавання пытанняў аб'яднання ўсіх арганізацый, якія займаліся харчовай дапамогай насельніцтву і ўладкаваннем беженцаў у Мінскай губерні. Адзначым, што мясцовыя цывільныя ўлады ўжо некалькі месяцаў займаліся аказаннем дапамогі беженцам, а каардынацыя дзейнасці розных арганізацый заставалася ключавой праблемай. А.Г. Чарняўскі, выконваючы ўказанні ваенных і цэнтральных цывільных улад, перыядычна праводзіў нарады на працягу зімы 1915–1916 г., асноўным пытаннем якіх стала вырашэнне праблем забеспячэння асеўшых на часовае жыхарства беженцаў. Галоўным патрабаваннем ваенных улад заставалася высяленне з губерні беженцаў [119, спр. 435, арк. 10–17].

Паводле звестак канцылярыі мінскага губернатара на сярэдзіну снежня 1915 г. у Мінскай губерні асела 107 058 беженцаў. Па паветах яны размеркаваліся наступным чынам: у Мінскім – 33 027, Бабруйскім – 14 960, Барысаўскім – 3636, Ігуменскім – 11 166, Мазырскім – 6858, Навагрудскім – 3932, Пінскім – 6532, Рэчыцкім – 7792, Слуцкім – 19 155 [88, спр. 9032, арк. 108].

На шэрагу пасяджэнняў Асобай нарады па ўладкаванні беженцаў абмяркоўвалася становішча пацярпеўшых ад вайны непасрэдна ў Мінскай губерні. У лістападзе 1915 г. паступілі звесткі, што тут адбывалася высяленне беженцаў, нават атрымаўшых прытулак і працу. Ініцыятарам гэтага быў названы прадстаўнік «Поўначдапамогі». Кіраўнік апошняй С.І. Зубчанінаў даў нарадзе тлумачэнні адносна дзеянняў свайго супрацоўніка і падкрэсліў, што высяленне беженцаў ажыццяўлялася па загадзе ваенных улад [121, спр. 1, арк. 33–38].

У пачатку 1916 г. А.Г. Чарняўскі паведаміў у Петраград пра колькасць беженцаў у губерні з удакладненнем іх полу і нацыянальнасці. Усяго на 1 студзеня 1916 г. у Мінскай губерні налічвалася 116 812 беженцаў, з іх жанчын – 40 595, дзяцей – 47 513, мужчын – 28 704. Беларусаў было 49 872, украінцаў – 119, палякаў – 33 716, літоўцаў – 6917, яўрэяў – 5134, латышоў – 34, татар – 51, эстонцаў – 1. Заробак знайшлі толькі 22 187 беженцаў, а 85 682 жылі ў галечы [88, спр. 9032, арк. 175]. На працягу лютага – красавіка 1916 г. колькасць беженцаў у губерні змянілася нязначна. Толькі з мая 1916 г. яна павялічылася да 129 тыс. чалавек [88, спр. 9032, арк. 207–490].



У 1916 г. расійскае камандаванне планавала здзейсніць шэраг наступальных аперацый. Вынікам павінна было стаць вызваленне значнай тэрыторыі заходніх губерняў. Падобнае развіццё падзей не магло не адбіцца на агульным настроі беженцаў. Апошнія пасля вялікіх маральных і матэрыяльных страт, амаль не кампенсаваных на новым месцы жыхарства, менавіта з вяртаннем на радзіму звязвалі надзею на дастойнае і годнае жыццё. Улады папярэдзілі беженцаў, што па меры вызвалення захопленай праціўнікам тэрыторыі ім будуць паведамляць аб магчымасці вяртання на старое месца жыхарства. Гарантавалася выдача асобага пасведчання, якое дасць права на бясплатны праезд і харчаванне ў дарозе, а таксама садзейнічанне мясцовых улад пры прыбыцці беженцаў. Пры гэтым ім ні ў якім разе не дазвалялася вяртацца да таго часу, пакуль улады не падрыхтуюцца да іх прыбыцця [121, спр. 1, арк. 141].

Заклапочанасць ваенных і цывільных улад магчымым зваротным рухам беженцаў і звязанымі з гэтым праблемамі мела пад сабой рэальную аснову. Пазбаўленыя ўсяго беженцы ў пошуках харчавання для сябе і сваіх сем'яў знаходзіліся на мяжы адчаю і некаторыя з іх былі здольны на злачынствы. Мільённая армія беженцаў уяўляла сабой сур'ёзную пагрозу для дзяржаўнай і прыватнай маёмасці, якая захавалася пасля вызвалення тэрыторыі ад праціўніка. Беженцы маглі палічыць аваладванне маёмасцю на вызваленай тэрыторыі за справядлівую кампенсацыю сваіх страт. Асобая нарада па ўладкаванні беженцаў асноўным выхадам з гэтай сітуацыі бачыла стварэнне спецыяльных ахоўных каманд пры кожным ваенным аб'яднанні [121, спр. 1, арк. 141–147].

Неэфектыўнасць дзеянняў губернскіх улад па каардынацыі дзейнасці дзяржаўных устаноў і дабрачынных арганізацый з'явілася падставай для выдання Галоўнакамандуючым арміямі Заходняга фронту загада ад 20 студзеня 1916 г. № 2921. Апошні распарадзіўся мінскім, магілёўскім, віцебскім і віленскім цывільным уладам стварыць губернскія і павятовыя нарады для аб'яднання дзейнасці ўсіх устаноў па аказанні дапамогі пацярпеўшаму ад вайны насельніцтву. Да працы ў нарадах павінны былі быць запрошаны прадстаўнікі мясцовых земстваў, гарадскіх улад, цывільнай адміністрацыі, Таццянінскага камітэта, УЗС, УСГ, «Поўначдапамогі», Чырвонага Крыжа, нацыянальных арганізацый [119, спр. 446, арк. 40].

З мэтай выканання ўказанага вышэй загада 22 лютага 1916 г. адбылася мінская губернская нарада пад старшынствам А.Г. Чарняўскага. Прысутнічалі прадстаўнікі Мінскага, Бабруйскага, Мазырскага, Барысаўскага, Навагрудскага і Ігуменскага паветаў, а таксама асноўных дзяржаўных, дабрачынных і нацыянальных арганізацый. Важнейшым пытаннем была прызнана правільная

арганізацыя працы беજанцаў. Падкрэслівалася, што галоўная перашкода, якая стрымлівала бежанцаў ад уладкавання на працу, – страх таго, што калі яны пакінуць яе, то іх сем'і зноў выселяць, адпала, таму што ваенныя ўлады спынілі ўсялякае перамяшчэнне насельніцтва. Нарада вызначыла, што спачатку трэба стварыць умовы для добраахвотнай згоды бежанцаў на працу праз заробак і догляд нямоглых. Калі гэтых мер будзе недастаткова, то вырашана прымусова працаўладкоўваць бежанцаў. Агульнае вядзенне справы арганізацыі занятасці іх было ўскладзена на земскія ўправы [119, спр. 446, арк. 106–109].

Звесткі пра дзейнасць губернскіх нарад у іншых губернях носяць абмежаваны характар. Вядома, што 19 лютага 1916 г. згодна з загадам № 2921 адбылася віленская губернская нарада пад старшынствам губернатара А.Н. Талстога. Яна пастанавіла, што з мэтай упарадкавання працэсу аказання дапамогі бежанцам кожная арганізацыя ў гэтай справе павінна скласці спісы асоб, аб якіх яна клапацілася, і далей абменьвацца звесткамі пра іх паміж сабой [119, спр. 446, арк. 102]. У Магілёўскай губерні з-за знаходжання там Стаўкі ўлады імкнуліся не пакідаць бежанцаў на часовае жыхарства. Таму колькасць асеўшых бежанцаў у Магілёўскай губерні была адносна меншая, чым у Мінскай. Звесткі пра дзейнасць губернскага камітэта ў пераліку арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Магілёўскай губерні адсутнічаюць. Галоўнай губернскай арганізацыяй тут лічылася губернскае аддзяленне Тацянінскага камітэта [94, спр. 2111, арк. 38–43]. Дзеянне загада № 2921 было адменена з зацвярджэннем «Кіруючых правілаў па ўладкаванні бежанцаў».

Паколькі ключавую ролю ў дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам адыгрывала пытанне кантролю за фінансавымі сродкамі, што выдаткоўваліся з казны, царскі ўрад пакінуў размеркаванне грошай як сярод дзяржаўных органаў, так і паміж грамадскімі дабрачыннымі ўстановамі за губернскімі і павятовымі ўладамі. Гэтым самым улады засяродзілі ў руках мясцовай адміністрацыі выключныя паўнамоцтвы па кіраванні ўладкаваннем бежанцаў. Такі парадак быў цыркулярна зацверджаны ў «Кіруючых правілах па ўладкаванні бежанцаў» ад 2 сакавіка 1916 г. Праект апошніх распрацаваў асобы аддзел МУС і вынес на разгляд Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў у студзені 1916 г.

Праект з'яўляўся першай спробай асобага аддзела МУС, як спецыяльнага органа міністэрства па бежанскай справе, выказаць свае погляды на арганізацыю дапамогі бежанцам у імперыі [49, № 27–28, с. 201]. Неабходнасць распрацоўкі падобных правілаў стала ў свой час адной з прычын стварэння Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў, аднак праца гэта зацягнулася амаль на паўгода.



«Кіруючыя правілы па ўладкаванні бежанцаў» змяшчалі як агульныя ўказанні арганізацыйнага характару, так і тэхнічныя аспекты аказання дапамогі бежанцам. Гэты дакумент шмат у чым дубліраваў палажэнні закона «Аб забеспячэнні патрэб бежанцаў» ад 30 жніўня 1915 г. і ў той жа час удакладняў і дапаўняў яго артыкулы. Менавіта апошняе выклікала самы актыўны пратэст з боку прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, перш за ўсё УЗС і УСГ, якія палічылі, што дзяржаўная ўлада імкнецца абмежаваць іх дзейнасць.

«Кіруючыя правілы па ўладкаванні бежанцаў» складаліся з 32 пунктаў, першыя з якіх уяўлялі сабой пералік цэнтральных дзяржаўных і дабрачынных арганізацый, што дапамагалі бежанцам пад агульным кіраўніцтвам міністра ўнутраных спраў. Сярод іх – аддзел па ўладкаванні бежанцаў пры МУС, Тацянінскі камітэт, УЗС, УСГ, Усерасійскае таварыства апекі аб бежанцах, а таксама нацыянальныя і абывацельскія камітэты. У «Кіруючых правілах па ўладкаванні бежанцаў» пацвярджалася, што абмеркаванне і каардынацыю дзейнасці ўсіх вышэйпералічаных арганізацый павінна ажыццяўляць Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў пад старшынствам міністра ўнутраных спраў (п. 1–4). Пункты 5–6 клопат аб бежанцах таксама ўскладалі на Галоўнаўпаўнаважаных на франтах і ў глыбі імперыі [42, с. 120–121].

Пункты 7–9 былі прысвечаны мясцовай апецы бежанцаў і прадпісвалі арганізоўваць гэты працэс крыху інакш, чым у законе ад 30 жніўня 1915 г. З аднаго боку, у п. 7 сцвярджалася, што мясцовы клопат пра бежанцаў ускладаецца на земскія і гарадскія грамадскія ўпраўленні з правам ствараць асобыя камітэты. З другога боку, у тым жа п. 7 гэтаму палажэнню папярэднічала ўказаннем, што клопаты па забеспячэнні матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей бежанцаў на месцах ускладаюцца міністрам унутраных спраў і галоўнаўпаўнаважанымі на губернатараў і градначальнікаў, на земскія і гарадскія грамадскія кіраванні.

У п. 8 удакладнялася: урадавы надзор за правільным уладкаваннем бежанцаў належыць губернатарам і граданачальнікам. Для аб'яднання дзейнасці мясцовых устаноў па дапамозе бежанцам пад старшынствам апошніх ствараюцца губернскія, абласныя і гарадскія нарады з прадстаўнікоў земскіх і гарадскіх самакіраванняў, нацыянальных арганізацый. У адпаведнасці з п. 9 менавіта нарады пад старшынствам губернатараў і граданачальнікаў павінны былі разглядаць усе фінансавыя каштарысы для наступнага іх прадастаўлення ў Асобую нараду па ўладкаванні бежанцаў. Фактычна ў руках цывільнай адміністрацыі было засяроджана размеркаванне грашовых сродкаў на месцах [42, с. 121–122]. Упаўнаважаны ЗемГора М.М. Шчэпкін у сваім дакладзе IV з'езду УСГ адзначыў, што намаганнямі МУС кіраўніцтва

справаў мясцовай апекі бежанцаў было засяроджана толькі ў руках дзяржаўных чыноўнікаў [49, № 27–28, с. 234–249].

Шмат пунктаў «Кіруючых правілаў па ўладкаванні бежанцаў» прысвечана тэхнічным аспектам арганізацыі дапамогі бежанцам, прычым некаторыя з іх яўна ўстарэлі. Напрыклад, у п. 14 адзначалася, што ўсе будынкі для бежанцаў павінны насіць часовы характар, а ў перыяд разгляду правілаў (студзень – люты 1916 г.) большасць бежанцаў была ўжо расселена. У п. 15 акрэсліваліся наступныя віды дапамогі бежанцам з боку дзяржавы:

1) бясплатная перавозка па чыгунцы;
2) харчаванне ў дарозе і на новым месцы жыхарства;
3) забеспячэнне прыдатнымі для пражывання памяшканнямі;
4) медыцынская дапамога;
5) задавальненне рэлігійных і адукацыйных патрэбнасцей бежанцаў;
6) догляд дзяцей і нямоглых;
7) дапамога ў пошуках працы, а таксама юрыдычная дапамога;
8) забеспячэнне адзеннем і абуткам;
9) выдача пазык і аказанне грашовай дапамогі;
10) іншая дапамога.

У п. 20 змяшчалася абяцанне з боку ўрада і розных арганізацый прыняць усе меры па пошуку для бежанцаў заробку, які будзе адпавядаць іх ведам і здольнасцям. Згодна з п. 31 губернатары і граданачальнікі павінны былі ў першы дзень кожнага месяца дакладваць міністру ўнутраных спраў аб становішчы бежанцаў на падпарадкаванай ім тэрыторыі [42, с. 120–125].

Пасля кансультацый, разгляду асобных пунктаў і дакумента ў цэлым Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў на пасяджэнні 30 студзеня 1916 г. выказалася за прыняцце гэтага дакумента і перадала яго ў Савет Міністраў [121, спр. 1, арк. 201–208]. З некаторымі паправкамі міністр унутраных спраў А.М. Хвастоў зацвердзіў «Кіруючыя правілы па ўладкаванні бежанцаў» 2 сакавіка 1916 г. (за дзень да сваёй адстаўкі).

З гэтага часу губернскія нарады павінны былі склікацца на падставе гэтага дакумента, які вызначыў губернатарам вельмі шырокія паўнамоцтвы. Аднак паводле меркавання шмат якіх прадстаўнікоў дабрачынных арганізацый губернскія нарады, якія ствараліся на падставе «Кіруючых правілаў па ўладкаванні бежанцаў» ад 2 сакавіка 1916 г., фактычна не разглядалі каштарысы на патрэбы бежанцаў і, такім чынам, не садзейнічалі паспяховаму аб'яднанню дзейнасці ўстаноў у гэтай справе [121, спр. 33, арк. 12 ].

Вясна 1916 г. выявіла востры недахоп рабочай сілы для выканання сельскагаспадарчых работ. Гэта было звязана з прызывам



большай часткі мужчынскага працаздольнага насельніцтва ў рэгулярную армію. Савет Усерасійскай сельскагаспадарчай палаты выказаў пажаданне выкарыстаць працу бежанцаў на веснавых палявых работах. Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў на закрытых пасяджэннях неаднаразова разглядала гэта пытанне [121, спр. 1, арк. 268]. Асноўнай перашкодай для яго вырашэння было тое, што прапанаваныя работадаўцамі заробкі не маглі забяспечыць бежанцаў усім неабходным, а сам факт прыняцця на працу мог пазбавіць права на паёк. Існавала і псіхалагічная перашкода. Бежанцы баяліся атрымаць пастаянную працу на новым месцы жыхарства, паколькі лічылі, што гэта разам з іншымі акалічнасцямі будзе перашкодай для вяртання ў будучым на радзіму. Ваенныя ўлады, каб садзейнічаць прыцягненню ў сельскую гаспадарку працоўнай сілы, часова адмянілі прымусовы заклік на абарончыя работы для бежанцаў і мясцовага насельніцтва (да 15 мая 1916 г.) [88, спр. 9177, арк. 50, 146].

Цэнтральныя цывільныя ўлады таксама акцэнтавалі ўвагу на прыцягванні бежанцаў на сельскагаспадарчыя работы. 18 лютага 1916 г. таварыш міністра ўнутраных спраў М.В. Плеве накіраваў губернатарам цыркуляр аб выкарыстанні працы бежанцаў. Губернскія ўлады павінны былі вызначыць раёны, дзе чакаўся недахоп рабочых рук. Пад кіраўніцтвам губернатараў трэба было выпрацаваць меры па выпраўленні гэтага недахопу. Выказвалася пажаданне заклікаць да гэтай справы земскія ўправы [121, спр. 31, арк. 3–19].

Ад «Поўначдапамогі» былі распаўсюджаны паведамленні аб асобых ільготах для ўладкаваных на працу бежанцаў, а таксама папярэджанні, што ў выпадку адмаўлення ад працы бежанцы могуць быць пазбаўлены ўсялякай дапамогі [97, спр. 7, арк. 47]. У час усяго перыяду сваёй дзейнасці «Поўначдапамога» займалася таксама рэгістрацыяй і ўлікам колькасці працаздольных бежанцаў. Атрыманыя звесткі накіроўваліся ва Усерасійскае бюро па рэгістрацыі бежанцаў [97, спр. 29, арк. 5–14; спр. 34, арк. 27, 45].

Далейшыя інструкцыі па выкарыстанні бежанцаў на сельскагаспадарчых работах былі выкладзены ў «Кіруючых правілах па ўладкаванні бежанцаў» ад 2 сакавіка 1916 г. МУС таксама цыркулярна пацвердзіла ўсім губернатарам аб неабходнасці пазбаўлення пайка тых бежанцаў, якія пазбягаюць працы. Урад меркаваў, што можа быць выкарыстана на работах 700–800 тыс. бежанцаў. Паводле даных па 57 губернях на 1 верасня 1916 г. да працы прыступілі 354 253 бежанцы. Усіх іх МУС загадала зняць з пайка [121, спр. 34, арк. 1–2].

У другой палове 1916 г. урад вырашыў спыніць дзейнасць «Поўначдапамогі» ў франтавых губернях, у тым ліку Віленскай, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай, а яе ўстановы перадаць земс-

кім камітэтам. На пасяджэнні Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў, якое адбылося 3 снежня 1916 г., было ўзнята пытанне аб ліквідацыі «Поўначдапамогі» як выканаўшай сваю задачу. Нарада прыняла рэзалюцыю – прызнаць задачу, ускладзеную на Галоўнаўпаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў на франтах, выкананай, а іх установы расфарміраваць [20, № 42–43, с. 8]. Фактычна ў складаных умовах працяглай вайны ўрад палічыў, што ўтрыманне такой буйной установы, як «Поўначдапамога», выклікае вельмі вялікія выдаткі для казны. Вясной – летам 1917 г. адбылася канчатковая ліквідацыя «Поўначдапамогі». 17 сакавіка 1917 г. Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў пастанавіла: перадаць з 1 красавіка ўсе ўстановы «Поўначдапамогі» ў межах Паўночнага фронту – УСГ, у межах Заходняга фронту – УЗС [120, спр. 99, арк. 35–36 ].

На працягу 1916 г. губернатары захоўвалі статус галоўных каардынатараў дзейнасці розных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам (пасля Лютаўскай рэвалюцыі гэты абавязак быў ускладзены на губернскіх камісараў).

У другой палове 1916 г. агульныя пасяджэнні Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў праводзіліся рэдка (персанальны склад Асобай нарады адлюстраваны ў схеме). Асноўнай працай займалася камісія па размеркаванні крэдытаў, што прадастаўляліся на задавальненне патрэб бежанцаў. Міністр унутраных спраў тлумачыў гэта тым, што за першы год існавання Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў выпрацавала агульныя палажэнні і дзейнічала галоўным чынам у сферы размеркавання фінансаў [121, спр. 3, арк. 443–444]. Праблема фінансаў сапраўды была вельмі вострай. Расійская імперыя знаходзілася ў стане цяжкага эканамічнага крызісу, выкліканага працяглай вайной. Па гэтай прычыне прывычнай з'явай стала несвоечасовая выдача грашовых сродкаў на ўладкаванне бежанцаў. З мэтай вырашэння гэтага пытання старшынствуючы на нарадзе В.П. Энгельгард сустракаўся з міністрам фінансаў [121, спр. 3, арк. 412].

Праца Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў у гэты перыяд працягвала канцэнтравацца ў асобных камісіях. Спецыяльная камісія займалася распрацоўкай праекта правілаў аб кампенсацыі кошту выкарыстаных бежанцамі харчовых запасаў і інш. Камісія на чале з сенатарам Д.Н. Любімавым распрацавала праект правілаў аб вяртанні на былыя пасяленні бежанцаў. Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў працягвала лічыць гэта пытанне актуальным, асабліва пад уплывам паспяховага наступлення арміі генерала А.А. Брусілава [121, спр. 3, арк. 470–471, 577].

У снежні 1916 г. Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў ініцыіравала скарачэнне на 50 % колькасці бежанцаў, якія атрымліваюць паёк. Гэта выклікала пратэсты з боку УЗС, УСГ і нацыянальных



**Схема пасяджэння Асобай нарады**



**па ўладкаванні бежанцаў (красавік** 1916 **г.**)






арганізацый. Сваё рашэнне нарада тлумачыла няправільнай рэгістрацыяй бежанцаў на месцах. Апошняе адзначаецца ў рапарце ўпаўнаважанага І.І. Стэрлігава, які абследаваў бежанскія ўстановы ў Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай і Смаленскай губернях [121, спр. 33, арк. 1]. У рапарце адзначалася, што ў гэтых губернях не існавала агульнага спіса ўсіх бежанцаў, а меліся толькі асобныя ў кожнай арганізацыі. У выніку, як лічыў І.І. Стэрлігаў, назіралася паўтарэнне адных асоб у розных спісах, што давала ім магчымасць атрымліваць дапамогу і ад нацыянальнай арганізацыі, і ад саюзаў, і ад «Поўначдапамогі». У якасці недасканаласці рэгістрацыі прыводзіўся той факт, што ў Мінскай губерні па даным губернскай нарады было 122 332 бежанцы, а «Поўначдапамога» налічвала іх 199 540 [121, спр 3, арк. 582–586]. У тым жа рапарце І.І. Стэрлігаў указваў, што ў заходніх губернях адчуваўся вялікі попыт на працоўных, якім ваенныя ўлады прапанавалі ўстойлівы заробак (у дзень мужчынам – 5 р., жанчынам – 3 р.). Аднак бежанцы ад працы для ваенных патрэб адмаўляліся [121, спр. 3, арк. 587].

У лютым 1917 г. была створана чарговая камісія, якая распрацоўвала меры па прыцягненні бежанцаў да сельскагаспадарчых работ. Ставілася мэта зацікавіць працай у вёсках тых бежанцаў, якія пражывалі ў гарадах. Для гэтага прапаноўвалася выкарыстоўваць любыя меры, нават прымусовы заклік бежанцаў на працы ці пазбаўленне іх пайка [121, спр. 3, арк. 635–636]. Гэты праект адхілілі, і была абрана новая камісія пад старшынствам А.А. Станкевіча. Яна ўважліва пазнаёмілася з вопытам 1916 г. Аналіз становішча паказаў, што ў 1916 г. замест мяркуемых 800 тыс. працавалі 300 тыс. бежанцаў. У 1917 г. умовы працаўладкавання іх чакаліся яшчэ больш складанымі. Сярод прапанаваных камісіяй мер былі патрыятычныя звароты да бежанцаў, заклікі да арганізацыі справы працаўладкавання бежанцаў дзеячаў з саміх бежанскіх колаў [121, спр. 3, арк. 669–678].

Пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі статус Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў фактычна не змяніўся. Яна засталася галоўным дарадчым органам па справе бежанцаў пры МУС. А вось адносіны яе да грамадскіх і дабрачынных арганізацый сталі іншымі. У красавіку 1917 г. у Маскве супрацоўнікі аддзела па ўладкаванні бежанцаў пры УСГ правялі з'езд па пытаннях аказання дапамогі бежанцам. Сярод іншага з'езд прааналізаваў працу як дзяржаўных, так і грамадскіх арганізацый. Былі прызнаны папярэднія заслугі Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў і выказаны спадзяванні, што ў якасці органа Часовага ўрада яна працягне займацца вырашэннем праблем бежанцаў [50, № 43–44, с. 183–191]. Асобая нарада вельмі падрабязна азнаёмілася з пастановамі з'езда і пагадзілася амаль з усімі яго прапановамі. Адзна-

чым, што пры царскай уладзе станоўчых адносін да дакументаў, якія зыходзілі ад УЗС і УСГ, практычна не назіралася.

Важным напрамкам дзейнасці Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў у 1917 г. стала вырашэнне далейшага лёсу арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам. Некаторыя арганізацыі ліквідавалі («Поўначдапамога»), іншыя змянілі назву і склад супрацоўнікаў (Таццянінскі камітэт) [91, спр. 229, арк. 51–56]. Нарада таксама займалася расследаваннем злоўжыванняў пры выкарыстанні казённых грашовых сродкаў у папярэдні час. Пры канчатковай рэвізіі «Поўначдапамогі» былі выяўлены значныя парушэнні пры скупцы коней у бежанцаў, што кваліфікавалася як злачынныя дзеянні. Асноўныя прэтэнзіі ўлад былі ў тым, што адсутнічала дакладная справаздача за сродкі на ўтрыманне жывёлы [121, спр. 11, арк. 216–219]. Нагадаем, што ўвосень 1915 г. скупка жывёлы ў бежанцаў адбывалася ў масавых памерах. Гэта дае падставу меркаваць аб шматмільённых стратах казны пры правядзенні падобных мерапрыемстваў. Адным з самых значных расследаванняў стаў разгляд дзейнасці Гродзенскага абывацельскага камітэта, членаў якога абвінавацілі ў буйных растратах [121, спр. 1, арк. 291–292; спр. 4, арк. 241–256].

Пад націскам грамадскіх і нацыянальных арганізацый Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў разгледзела пытанне аб павелічэнні памераў дапамогі бежанцам. 28 красавіка 1917 г. харчовы паёк быў устаноўлены у 6 р. у месяц, кватэрны – ад 2 да 4 р., на адзенне і абутак – 15 р. на паўгода. Улетку харчовы паёк павялічылі да 7,5 р. [121, спр. 3, арк. 794].

У маі 1917 г. адбыўся пераход дабрачынных арганізацый у падначаленне Міністэрства дзяржаўнай апекі. Адным з апошніх пытанняў, якое разгледзела нарада, стала распрацоўка палажэння аб зваротным руху бежанцаў. Дзяржаўная ўлада прыняла рашэнне, што рух і ўладкаванне бежанцаў на новым месцы трэба пакінуць за Асобай нарадай па ўладкаванні іх, а клопат за асеўшымі бежанцамі замацаваць за Міністэрствам дзяржаўнай апекі [121, спр. 4, арк. 257–269]. Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў была ліквідавана разам з іншымі ўстановамі Часовага ўрада [67].

Падсумоўваючы сказанае, можна зрабіць наступныя высновы. Да лета 1915 г. бежанства не выклікала заклапочанасці ўлад Расійскай імперыі, паколькі разглядалася як уласцівая ваеннаму часу з'ява. У гэты перыяд органы дзяржаўнай улады лічылі, што яны здольны кантраляваць тую колькасць мірных жыхароў, якія прымусова ці добраахвотна станавіліся бежанцамі. Павелічэнне летам – восенню 1915 г. колькасці іх да некалькіх мільёнаў стала нечаканым для цэнтральных і мясцовых цывільных улад і



прымусіла органы дзяржаўнай улады звярнуць пільную ўвагу на забеспячэнне патрэб гэтай катэгорыі пацярпеўшых ад вайны.

Даследаванне паказала, што летам 1915 г. дзейнасць цэнтральных і мясцовых улад па забеспячэнні патрэб бежанцаў у Беларусі адбывалася ва ўмовах недахопу фінансавых сродкаў і адсутнасці адзінага кіраўніцтва гэтай справай. Гэта перш за ўсё тлумачыцца адсутнасцю адпаведных заканадаўчых актаў, якія б на той час рэгламентавалі дзейнасць па аказанні дапамогі бежанцам.

МУС выступіла ў якасці галоўнага кіруючага органа справай і распрацавала закон «Аб забеспячэнні патрэб бежанцаў» ад 30 жніўня 1915 г. Закон прызнаваў бежанцамі амаль усе катэгорыі насельніцтва, якія прымусова ці добраахвотна высяляліся ва ўнутраныя рэгіёны імперыі, за выключэннем падданых ваюючых з Расіяй дзяржаў і палітычна ненадзейных грамадзян.

Адзначым, што распрацоўка закона аб бежанцах адбывалася ў час найбольшай актуальнасці бежанскай праблемы. Таму царскі ўрад у гэтым дакуменце вымушаны быў задзейнічаць для аказання дапамогі бежанцам як дзяржаўныя ўстановы, так і тыя грамадскія арганізацыі, якія жадалі і былі здольныя плённа працаваць на карысць справы.

Актывізацыі дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам садзейнічала рашэнне дзяржавы фінансаваць гэтую справу сродкамі з казны. Гэта дало магчымасць удзельнічаць у аказанні дапамогі бежанцам і грамадскім арганізацыям, якія да выдання закона ад 30 жніўня не маглі забяспечваць патрэбы бежанцаў на дастатковым ўзроўні з-за абмежаванасці сваіх фінансавых сродкаў. МУС разлічвала падпарадкаваць арганізацыю мясцовага клопату пра бежанцаў толькі губернскім уладам. Але згодна з законам ад 30 жніўня 1915 г. гэта справа была даручана і органам земскага і гарадскога самакіравання. Прытым праца ўсіх арганізацый была падначалена МУС, якое кіравала бежанскай справай праз Асобую нараду па ўладкаванні бежанцаў.

Паступова дзейнасць арганізацый, якія крытыкавалі палітыку царскага ўрада, стала значна абмяжоўвацца, прычым без уліку карыснасці іх дабрачыннай дзейнасці. МУС здолела падначаліць мясцовы клопат пра бежанцаў губернскім і павятовым уладам, даручыўшы ім кантроль за размеркаваннем і выкарыстаннем фінансавых сродкаў, што было замацавана ў «Кіруючых правілах па ўладкаванні бежанцаў». Дзяржава імкнулася поўнасцю кантраляваць дзейнасць па аказанні дапамогі бежанцам на ўсіх узроўнях, таму што ўрад разлічваў выкарыстаць гэту дапамогу як адзін са стымулаў для прыцягвання бежанцаў да працы. Аднак памер дапамогі з боку дзяржавы быў недастатковы для аднаўлення працаздольнасці бежанцаў, і гэтыя спадзяванні не спраўдзіліся.

Быў таксама спецыяльна створаны інстытут Галоўнаўпаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў на франтах. Беларусь увайшла ў сферу паўнамоцтваў Галоўнаўпаўнаважанага па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронту С.І. Зубчанінава, які ўзначальваў арганізацыю «Поўначдапамога». Апошняя дзейнічала на ўсёй не акупіраванай тэрыторыі Беларусі са жніўня 1915 г. па восень 1916 г. Аналіз дакументальных матэрыялаў і перыядычных выданняў дае падставу лічыць «Поўначдапамогу» буйнейшай урадавай арганізацыяй па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі. Аднак яе ўстановы маглі гарантаваць толькі мінімальны аб'ём дапамогі і таму былі няздольныя садзейнічаць бежанцам у аднаўленні паўнацэннага жыцця. Дапамогу бежанцам аказвалі губернскія, гарадскія і павятовыя ўлады.

Перад мясцовымі цывільнымі ўладамі стаяла задача скаардынаваць і накіраваць дзейнасць розных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам, якую яны не здолелі выканаць пасляхова. Сярод прычын гэтага – складаныя ўмовы ваеннага перыяду і недастатковая ўвага да справы аказання дапамогі бежанцам з боку губернскіх, гарадскіх і павятовых улад.

Адна з галоўных задач, якія стаялі перад органамі дзяржаўнай улады, – папаўненне за кошт бежанцаў недахопу рабочых рук. Гэтай мэты не дасягнулі, бо, па-першае, спачатку колькасць працаздольных бежанцаў была нязначнай і, па-другое, характар і памеры дзяржаўнай дапамогі бежанцам не маглі аднавіць іх працаздольнасць і кампенсаваць страты.



# ГЛАВА 4 УДЗЕЛ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У АКАЗАННІ ДАПАМОГІ БЕЖАНЦАМ

З пачаткам Першай сусветнай вайны патрыятычна настроеныя колы расійскага грамадства палічылі сваім абавязкам дапамагчы Радзіме ў барацьбе за перамогу. Дзеячы земскіх і гарадскіх устаноў, прадстаўнікі інтэлігенцыі, дваранства і духавенства, іншых колаў грамадства пачалі працу па нарыхтоўцы неабходных для арміі сродкаў і запасаў, па аказанні дапамогі хворым, параненым воінам і ўсяму пацярпеўшаму ад вайны насельніцтву. Для гэтага ствараліся грамадскія саюзы і дабрачынныя камітэты. Як адзначалася ў папярэдняй главе, органы дзяржаўнай улады пачалі прымаць непасрэдны ўдзел у аказанні дапамогі бежанцам пасля пачатку масавага руху бежанцаў, а менавіта з лета 1915 г. Дабрачынныя ўстановы ў сваю чаргу аказвалі дапамогу розным катэгорыям пацярпеўшага насельніцтва, у тым ліку і бежанцам, з першых дзён вайны. Але да выдання закона аб бежанцах магчымасці грамадскіх арганізацый былі ў большасці выпадкаў абмежаваны добраахвотнымі ахвяраваннямі, памеры якіх у складаных умовах вайны былі нязначныя [74].

У гады Першай сусветнай вайны ў Беларусі дзейнічала шмат арганізацый, заснаваных на грамадскіх і дабрачынных пачатках. Працаваць яны пачалі ўжо ў верасні 1914 г. [87, спр. 3639, арк. 800]. Межы магчымасцей дабрачынных і грамадскіх устаноў, а таксама памеры дапамогі, якую яны здольны былі аказваць пацярпеўшым ад вайны, залежалі шмат ад якіх акалічнасцей. Меў значэнне афіцыйны статус устаноў, іх арганізацыйная структура, а таксама крыніцы і спосабы фінансавання. У перыяд праўлення царскага ўрада дзейнасць грамадскіх арганізацый ажыццяўлялася ніжэйапісаным чынам.

Цэнтрам каардынацыі дабрачыннай дзейнасці земстваў і ўстаноў гарадскіх самакіраванняў стала Масква. 30 ліпеня і 8–9 жніўня 1914 г. адбыліся адпаведна з'езд упаўнаважаных губернскіх земстваў і з'езд прадстаўнікоў гарадскіх самакіраванняў. Вынікам стала аб'яднанне прадстаўнікоў земскіх і гарадскіх самакіраванняў у недзяржаўныя арганізацыі – Усерасійскі земскі саюз [24, № 1, с. 1–11] і Усерасійскі саюз гарадоў [47, № 1, с. 3–13]. Для ажыццяўлення агульнага кураўніцтва і каардынацыі ўсёй працы ў кожным з саюзаў былі створаны галоўныя камітэты. Галоўнаўпаўнаважаным УЗС быў абраны князь Г.Я. Львоў, а кіраўніком УСГ спачатку выбралі В.Д. Бранскага, а потым яго на гэтай пасадзе змяніў М.В. Чалнакоў.

Першапачаткова дзейнасць УЗС і УСГ у Беларусі і ўвогуле ў Расійскай губерні была найвышэйшым царскім дазволам абмежавана клопатам пра хворых і параненых воінаў [3]. На франтавой і прыфрантавой тэрыторыі працавалі медыцынскія лятучыя атрады і санітарныя цягнікі. Саюзамі была створана шырокая сетка харчовых і медыцынскіх пунктаў для забеспячэння патрэб арміі, адкрыліся бальніцы і амбулаторыі. Усю гэту працу фінансавала казна.

Увосень 1914 г. дзеячамі саюзаў было прызнана, што дапамога арміі знаходзіцца ў непарыўнай сувязі з клопатам аб ахвярах вайны – мясцовым насельніцтве і бежанцах. У кастрычніку 1914 г. галоўны камітэт УЗС вырашыў стварыць камісію па зборы ахвяраванняў для пацярпеўшага насельніцтва Царства Польскага [24, № 2, стр. 17]. У лютым 1915 г. УСГ пастанавіў стварыць Віленскі камітэт па аказанні дапамогі бежанцам [48, № 9, с. 76–77]. Саюзы палічылі мэтазгодным размеркаваць задачы: УЗС павінен быў засяродзіць увагу на дапамозе насельніцтву, УСГ – на ўладкаванні бежанцаў [24, № 2, стр. 17]. Уся гэта дзейнасць ажыццяўлялася ў параўнанні з дапамогай арміі як другарадная. Акрамя таго, да пастановы Саўміна ад 1 ліпеня 1915 г. дзяржава выдзяляла сродкі на забеспячэнне толькі пэўных катэгорый бежанцаў. Дапамога астатнім пацярпеўшым ад вайны залежала ад добраахвотных ахвяраванняў. Памеры апошніх былі нязначныя, што абмяжоўвала дапамогу бежанцам з боку саюзаў.

Летам 1915 г. галоўныя камітэты УЗС і УСГ вырашылі павялічыць дапамогу бежанцам, нягледзячы на тое, што гэта не ўваходзіла ў прамыя абавязкі названых арганізацый. У сваіх перыядычных выданнях самі прадстаўнікі саюзаў тлумачылі свой клопат пра бежанцаў наступнымі прычынамі. З аднаго боку, непадрыхтаванасцю мясцовых цывільных улад да з'яўлення вялікай колькасці бежанцаў і ў выніку няздольнасцю ўлад аказаць ім дапамогу на дастатковым узроўні. У пачатку чэрвеня 1915 г. галоўны камітэт УЗС атрымаў ад шэрагу губернатараў прыгранічных тэрыторый просьбы аб арганізацыі харчовай і медыцынскай дапамогі бежанцам [25, № 28, стр. 59]. Звароты ў галоўны камітэт УСГ з заклікам аб арганізацыі дапамогі бежанцам пачалі паступаць у другой палове чэрвеня. Мясцовыя земствы і гарадскія самакіраванні, якія непасрэдна сутыкнуліся з бежанскім рухам, таксама звярталіся ў галоўныя камітэты УЗС і УСГ па інструкцыі і грашовыя сродкі [25, № 21, с. 9–12].

З іншага боку, з улікам вопыту арганізацыі харчовай і медыцынскай дапамогі, які саюзы атрымалі на франтах, менавіта да іх летам 1915 г. звярнуліся ваенныя ўлады з загадам забяспечыць патрэбы насельніцтва, якое высялялася ў глыб імперыі. 21 чэрвеня 1915 г. генерал М.А. Данілаў паведаміў франтавым упаўнаважаным УЗС і УСГ, што патрабуецца тэрміновая дапамога бежанцам, якіх армейскае камандаванне выселіла з пастаяннага месца жыхарства і накіравала ў Кобрынскі і Пружанскі паветы. М.А. Данілаў загадаў саюзам на шляху руху бежанцаў і ў месцах іх часовых стаянак уладкаваць харчовыя і медыцынскія пункты [118, спр. 131, арк. 211–212; 25, № 28, с. 59–60]. 28 чэрвеня генерал М.А. Данілаў патрабаваў ад упаўнаважаным УЗС і УСГ падрыхтаваць у межах Магілёўскай і Смаленскай губерній харчовыя пункты і чайныя, арганізаваць санітарны агляд бежанцаў і ўладкаваць заразныя баракі [117, спр. 42, арк. 174]. 4 ліпеня і 4 жніўня 1915 г. ад генерала М.А. Данілава зноў паследавалі загады для УЗС і УСГ павялічыць колькасць харчовых і медыцынскіх пунктаў на шляху руху бежанцаў ад фронту на ўсход [48, № 17, с. 5–6; 117, спр. 42, арк. 175–179; 120, спр. 97, арк. 27–28].

Падкрэслім важную акалічнасць – цывільныя і ваенныя ўлады заклікалі саюзы аказаць дапамогу бежанцам у франтавых і прыфрантавых губернях, прычым выключна ў якасці дапаможных органаў. Галоўныя камітэты УЗС і УСГ у сваю чаргу імкнуліся актыўна ўдзельнічаць у гэтай справе на ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі і нават спрабавалі ўзяць яе ў свае рукі. Ужо летам 1915 г. дзеячам саюзаў стала зразумела, што вырашэнне бежанскага пытання запатрабуе вялікіх чалавечых рэсурсаў і значных грашовых сродкаў. У паведамленнях афіцыйнага друку галоўных камітэтаў УЗС і УСГ аказанне дапамогі бежанцам з іх боку перш за ўсё тлумачыцца дабрачыннымі і патрыятычнымі матывамі. Не адвяргаючы гэта палажэнне, адзначым, што грамадскія арганізацыі імкнуліся праз вырашэнне важнай і сур'ёзнай праблемы бежанства пашырыць межы сваёй дзейнасці, павялічыць аўтарытэт у грамадстве і атрымаць значныя асігнаванні з казны.

Таму галоўныя камітэты саюзаў рызыкнулі актыўна дапамагаць бежанцам, не атрымаўшы ніякіх інструкцый з боку цэнтральнай улады і не маючы спецыяльных крэдытаў на такую справу. Каб вырашыць гэта пытанне і атрымаць сродкі непасрэдна на ўладкаванне бежанцаў, Галоўнаўпаўнаважаны УЗС князь Г.Я. Львоў распачаў настойлівую, аднак спачатку безвыніковую перапіску з дзяржаўнымі ўстановамі. Тэлеграмамі ад 24 ліпеня і 7 жніўня 1915 г. ён паведаміў міністру ўнутраных спраў аб дзейнасці УЗС па дапамозе бежанцам. У тэлеграмах міністру Г.Я. Львоў падкрэсліваў, што з-за адсутнасці своечасовых указанняў аб парадку ўладкавання бежанцаў і аб органах дзяржаўнай улады, адказных за гэту справу, УЗС узяў на сябе ўладкаванне харчовых і медыцынскіх пунктаў. Князь паведамляў таксама, што асобныя мясцовыя камітэты выказалі пажаданне аб'яднаць працу земскіх і гарадскіх самакіраванняў па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны пад кіраўніцтвам УЗС і УСГ [25, № 21, с. 11–12].

Узгаданыя вышэй звароты Галоўнаўпаўнаважанага УЗС засталіся без адказу. Толькі на трэцюю тэлеграму Г.Я. Львова ад 12 жніўня 1915 г. было атрымана паведамленне ад чыноўніка МУС, што да зацвярджэння закона аб беажнцах вылучэнне саюзам сродкаў немагчыма, а арганізацыя дапамогі бежанцам на месцах даручаецца губернатарам [25, № 21, с. 12; 48, № 19, с. 81]. Прадстаўнікі саюзаў лічылі, што такая пазіцыя ўлады не можа як след забяспечыць патрэбы бежанцаў. Адзін з дзеячаў УСГ падкрэсліваў: «Тое, што мы робім для бежанцаў, падобна толькі на міласціну жабраку» [48, № 17, с. 8].

У жніўні 1915 г. Галоўнаўпаўнаважаны УСГ М.В. Чалнакоў у сваю чаргу накіраваў міністру ўнутраных спраў дакладную запіску аб надзвычайным становішчы бежанцаў. Прыводзіліся такія лічбы – у Віленскай губерні яшчэ 18 чэрвеня сабралася больш за 70 тыс. бежанцаў, у Гомель штодзённа прыбывала да 5 тыс. чалавек. Стан бежанцаў характарызаваўся як крытычны, ім патрабавалася тэрміновая дапамога [48, № 17, с. 19–21].

Пры галоўным камітэце УСГ 30 ліпеня 1915 г. быў сфарміраваны спецыяльны аддзел па бежанцах пад старшынствам М.М. Шчэпкіна [48, № 17, с. 15]. Гэтага дзеяча УСГ адзначым асобна. На працягу 1915–1916 гг. ён рашуча і бескампрамісна адстойваў інтарэсы бежанцаў і сваёй арганізацыі на розных пасадах ва ўстановах па аказанні дапамогі бежанцам, перш за ўсё ў Асобай нарадзе па іх уладкаванні, а таксама ў перыядычным друку. Менавіта пры яго актыўным удзеле і дапамозе ў акрэслены перыяд ажыццяўляліся асноўныя мерапрыемствы УЗС і УСГ па забеспячэнні патрэб бежанцаў.

8 жніўня 1915 г. пры Галоўным камітэце УСГ і пры ўдзеле членаў УЗС адбылася нарада па пытаннях дапамогі бежанцам. На ёй было заяўлена, што ва ўсіх дзеяннях дзяржаўнай улады ў справе ўладкавання бежанцаў адсутнічае планамернасць, крытыкавалася праца Галоўнаўпаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў на франтах, мясцовых аддзяленняў Таццянінскага камітэта. Галоўнай праблемай у справе ўладкавання бежанцаў палічылі недахоп грашовых сродкаў.

Нарада УСГ ад 8 жніўня распрацавала планы эвакуацыі насельніцтва, вызначыла мерапрыемствы па забеспячэнні патрэб бежанцаў. На шляху руху бежанцаў меркавалася стварыць тры лініі пунктаў: франтавыя (уздоўж зоны ваенных дзеянняў прадугледжваўся медыцынскі агляд і харчаванне бежанцаў), заслоны (фільтраванне бежанцаў, затрыманне заразных), размеркавальнікі (накіраванне бежанцаў у месцы часовага жыхарства). Франтавыя пункты былі запланаваны ў Беластоку, Кобрыне, Влодаве, Сарнах і Лунінцы [48, № 17, с. 24–28]. На падставе крытыкі ўрадавых чыноўнікаў нарада ад 8 жніўня зрабіла выснову, што



кіруючую ролю ў аказанні дапамогі бежанцам трэба перадаць грамадскім арганізацыям, гэта значыць саюзам [48, № 17, с. 31].

Пад уплывам трагічных падзей на германа-рускім фронце ў 1915 г. галоўныя камітэты УЗС і УСГ вырашылі аб'яднаць сваю дзейнасць па шэрагу найбольш важных накірункаў. Аб'яднаныя ўстановы саюзаў атрымалі назву ЗемГор. Справу аказання дапамогі бежанцам галоўныя камітэты УЗС і УСГ палічылі адной з самых значных, таму ў сувязі з гэтым вырашылі аб'яднаць свае намаганні. З гэтай мэтай пачалася арганізацыя Аб'яднанага аддзела па ўладкаванні бежанцаў земскага і гарадскога саюза (ці ЗемГора) [25, № 21, с. 81].

У другой палове жніўня 1915 г. міністр унутраных спраў распарадзіўся перавесці УЗС і УСГ усяго 1 млн р. на аказанне дапамогі бежанцам, па 500 тыс. кожнаму (князь Г.Я. Львоў прасіў як мінімум 3,5 млн р.), а далей саюзы павінны былі звяртацца па сродкі да Галоўнаўпаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў на франтах [25, № 22–23, с. 48]. Такім чынам, у справе аказання дапамогі бежанцам саюзы былі пастаўлены ў залежнасць ад урадавых чыноўнікаў.

Непасрэдна ў Беларусі летам 1915 г. мерапрыемствы па аказанні дапамогі бежанцам ажыццяўлялі губернскія і франтавыя камітэты УЗС і УСГ.

У сувязі з тым, што ў час стварэння УЗС была пастаўлена мэта рэалізаваць дэмакратычныя прынцыпы, кіраўніцтва саюза прапанавала арганізаваць губернскія і павятовыя камітэты ў формах, зручных для мясцовых земстваў. У адных выпадках губернскім камітэтам УЗС з'яўлялася ўся земская ўправа, у другіх – з членаў управы спецыяльна выбіраўся камітэт. Дзейнасць франтавых камітэтаў УЗС ахоплівала некалькі губерняў [24, № 1, с. 6].

У Беларусі поле дзейнасці УСГ у параўнанні з УЗС было вузейшае. Гэта звязана перш за ўсё з тым, што колькасць бежанцаў у гарадах была меншай, чым у паветах. Мясцовыя камітэты УСГ дзейнічалі ў губернскіх гарадах – Вільні, Віцебску, Гродне, Магілёве і Мінску, а таксама ў павятовых – Брэст-Літоўску, Гомелі, Лепелі, Оршы, Полацку і Рагачове [48, № 11–12, с. 168–172].

У Гродзенскай губерні да яе захопу праціўнікам бежанцам з боку УЗС дапамогу аказвалі франтавыя камітэты. Камітэт Паўночна-Заходняга фронту, створаны для гарантавання супрацьэпідэмічнай бяспекі арміі, ужо ў першыя месяцы вайны палічыў неабходным праводзіць санітарна-медыцынскія мерапрыемствы і для бежанцаў. Справа ў тым, што сярод бежанцаў у выніку іх бядотнага становішча і адсутнасці санітарных мер шырока распаўсюдзіліся інфекцыйныя захворванні, перш за ўсё халера. З пачаткам масавага руху бежанцаў камітэт Паўночна-Заходняга фронту УЗС адкрыў харчовыя і медыцынскія пункты ў Косаве, Любошыне,

Мілавідах, Слоніме, Ваўкавыску, Зэльве і інш. У Гродзенскай губерні дзейнічалі таксама некалькі медыцынскіх «лятучых» атрадаў [120, спр. 98, арк. 16].

Урачэбна-харчовы пункт УСГ пры Брэсцкай крэпасці стаў абслугоўваць бежанцаў з чэрвеня 1915 г. У пачатку ліпеня з Гродзенскай губерні ў галоўны камітэт УСГ накіравалі паведамленне, што на шляху з Влодава ў Кобрын праходзяць дзесяткі тысяч бежанцаў. Іх становішча характарызавалася як надзвычай цяжкае, прынятыя ўладай меры ацэньваліся як недастатковыя ў параўнанні з маштабамі бедства [120, спр. 96, арк. 6].

У другой палове ліпеня 1915 г. адбылося пасяджэнне мясцовага камітэта ўпаўнаважаных УСГ у Брэсце. На ім прааналізавалі становішча бежанцаў, разгледзелі напрамкі іх руху. Бежанцы з Польшчы рухаліся чатырма асноўнымі шляхамі: цераз Влодаў на Кобрын, адтуль на Пінск і Мінск (налічвалася каля 400 тыс. чалавек), з Ломжынскай губерні цераз Беласток на Мінск (дзесяткі тысяч бежанцаў), з Роўна на Сарны (каля 30 тыс. бежанцаў), з Вільні – на Мінск і Полацк (дзесяткі тысяч бежанцаў). Упаўнаважаныя УСГ канстатавалі, што адсутнічала вызначаная і правільная арганізацыя руху і рассялення бежанцаў. Іх раздзялілі на дзве вялікія нацыянальныя групы – палякі і яўрэі. На пасяджэнні ў Брэсце распрацавалі мерапрыемствы для бежанцаў, практычная рэалізацыя якіх патрабавала значных сродкаў [120, спр. 96, арк. 10–15].

Віленскі камітэт УСГ узначальваў гарадскі галава М. Венслаўскі. Бежанцы ў Віленскую губерню перыядычна траплялі на працягу ўсяго першага года вайны, іх апякалі нацыянальныя арганізацыі. Віленскі камітэт УСГ абмяркоўваў становішча бежанцаў на пасяджэнні 26 мая 1915 г. Згодна са спецыяльным дакладам вялікая частка высяленцаў з прыбалтыйскага краю шукала прытулку ў сваіх аднаверцаў у Віленскай губерні. Віленскі камітэт вырашыў прасіць галоўны камітэт УСГ аб аказанні грашовай падтрымкі нацыянальным арганізацыям. У ліпені 1915 г. колькасць бежанцаў у губерні перавысіла 70 тыс. чалавек. Гарадская выканаўчая камісія УСГ аказвала дапамогу (харчаванне, прадастаўленне памяшканняў, адзенне, працаўладкаванне) 2854 бежанцам. Асноўную частку бежанцаў (звыш 62 тыс.) апекавалі нацыянальныя камітэты [120, спр. 112, арк. 5–9].

У Мінскай губерні дапамогу бежанцам аказвалі некалькі земскіх устаноў і камітэтаў УЗС. Камітэт Паўночна-Заходняга фронту УЗС займаўся ўладкаваннем харчовых і медыцынскіх пунктаў на чыгуначным шляху руху бежанцаў. Мінскі губернскі камітэт УЗС сумяшчаў летам 1915 г. клопат аб параненых воінах з правядзеннем медыка-санітарных мерапрыемстваў для бежанцаў, якія рухаліся гужавымі дарогамі і па чыгунцы. Камітэт Паўднёва-Заходняга фронту УЗС, жадаючы прыйсці на дапамогу «напалоханай і



збянтэжанай масе людзей», вырашыў накіроўваць у пункты з найбольшай колькасцю бежанцаў сваіх агентаў-праваднікоў. Апошнія вербаваліся з ліку студэнтаў, святароў і саміх бежанцаў. Гэта простая і элементарная форма дапамогі аказалася вельмі запатрабаванай, аб чым сведчылі як самі бежанцы, так і справаздачы агентаў-праваднікоў [25, № 26, с. 99–122].

Агенты-праваднікі сведчылі, што амаль заўсёды рух бежанцаў па чыгунцы быў цяжкі, бо чынілі перашкоды ваенныя і цывільныя ўлады. Таму праваднікам даваліся наступныя інструкцыі: больш уважліва ставіцца да кожнай новай партыі бежанцаў, рэгістраваць іх, карміць і абараняць. Фактычна агенты-праваднікі выступалі пасрэднікамі паміж бежанцамі і мясцовай адміністрацыяй [25, № 26, с. 96–98].

Распрацоўваць мерапрыемствы па ўладкаванні бежанцаў у Магілёўскай губерні губернскі камітэт УЗС пачаў на спецыяльным пасяджэнні 1 ліпеня 1915 г. На ім была абмеркавана прапанова Галоўнаўпаўнаважанага УЗС аб усталяванні харчовых пунктаў, чайных, амбулаторый і заразных баракаў у раёнах, указаных ваеннымі ўладамі. Перш за ўсё Магілёўскі губернскі камітэт звярнуў увагу на станцыі транзітнага руху бежанцаў – Жлобін, Рагачоў, Магілёў і Оршу (у Гомелі дзейнічала самастойная арганізацыя). Было вырашана выкарыстаць для забеспячэння патрэб бежанцаў як ужо існуючыя харчова-медыцынскія пункты, так і стварыць шэраг новых. Клопат пра бежанцаў на месцах даручылі павятовым камітэтам УЗС, на гэта былі адпушчаны сродкі [96, спр. 71, арк. 8–9; 21, № 24, с. 64–66].

Масавы рух бежанцаў у Магілёўскай губерні пачаўся ў канцы ліпеня 1915 г. Губернскі камітэт УЗС забяспечваў у асноўным бежанцаў, якія перамяшчаліся па чыгунцы. Напрыклад, цераз харчова-сартавальны пункт на станцыі Жлобін з 25 па 31 ліпеня прайшло 14 689 зарэгістраваных бежанцаў, з іх ад УЗС дапамогу атрымалі 12 700, з 1 па 15 жніўня – 45 тыс. Цераз станцыю Орша з 13 ліпеня па 7 жніўня прайшло 24 900 бежанцаў, станцыю Магілёў з 7 па 12 жніўня – 2 тыс., з 12 па 25 жніўня – 12 тыс. бежанцаў [25, № 22–23, с. 98–99].

З павелічэннем колькасці бежанцаў Магілёўскі губернскі камітэт УЗС вырашыў пашырыць сферу сваёй дзейнасці. Ён прыняў удзел у арганізацыі дапамогі бежанцам на паўднёвых шашэйных, грунтавых і прасёлачных дарогах, што праходзілі цераз Рагачоўскі, Быхаўскі, Чэрыкаўскі і Клімавіцкі паветы. У той жа час камітэт тэрмінова ствараў харчова-медыцынскія пункты на паўночных шляхах цераз Сенненскі, Аршанскі і Горацкі паветы. 26 жніўня 1915 г. адбылося сумеснае пасяджэнне губернскага камітэта УЗС і прадстаўнікоў мясцовых земстваў, а таксама павятовых прадвадзіцеляў дваранства. Гэтая аб'яднаная нарада прызнала неабход-

ным стварыць агульнагубернскую гаспадарчую арганізацыю для аказання дапамогі беженцам і мясцоваму насельніцтву [96, спр. 71, арк. 8–9].

На буйных чыгуначных станцыях Магілёўскай губерні дзейнічалі агенты-праваднікі, накіраваныя камітэтам Паўднёва-Заходняга фронту УЗС. У справаздачы праваднікa Х. Спектра адлюстравана пастаноўка справы ў Гомелі. Калі ён прыбыў у горад, прадстаўнікі ўлад паведамілі, што беженцаў на станцыі няма. Агент-праваднік асабіста наведаў сартавальны пункт на станцыі і знайшоў там тры цягнікі з беженцамі. Стан апошніх быў жудасны: на платформе ляжалі хворыя, беженцы ўвесь дзень нічога не елі і не выходзілі з вагона, бо баяліся адстаць ад цягніка. Толькі пасля ўмяшання агента-праваднікa (з яго слоў) беженцам аказалі харчовую і медыцынскую дапамогу [25, № 26, с. 106–107].

Увага УСГ у Магілёўскай губерні таксама была засяроджана на чыгуначных станцыях найбольш інтэнсіўнага руху беженцаў і перш за ўсё на Гомелі. З мэтай стварэння аддзялення УСГ сюды з Масквы ў жніўні 1915 г. быў камандзіраваны ўпаўнаважаны Т. Дынесман. У горадзе было шмат эвакуіраваных устаноў і вайсковых часцей. У дакладной запісцы Т. Дынесман паведамляў аб становішчы ў горадзе: «...цягнікі прыбываюць з галоднымі і халоднымі людзьмі. У кожным цягніку налічваюць некалькі дзесяткаў трупаў, якія знаходзіліся ў вагонах па некалькі дзён. Трупы знімаць не дазваляюць, таму беженцы стараюцца скінуць іх на палатно, але ўлады, знайшоўшы труп, зноў кладуць яго ў першы папаўшы вагон,назіраючы, каб там былі халерныя» [7, с. 80]. Пад кіраўніцтвам Гомельскага гарадскога галавы Ф.М. Раеўскага былі створаны два харчовыя пункты – на Палескай і Лібава-Роменскай чыгунках.

Магілёўскі гарадскі камітэт УСГ быў здольны аказваць дапамогу беженцам у абмежаваных памерах, што тлумачыцца, з аднаго боку, яго невялікімі фінансавымі і арганізацыйнымі магчымасцямі, а з другога – імкненнем улад накіроўваць рух беженцаў, мінаючы Магілёў, дзе знаходзілася Стаўка. Праца гарадскога камітэта заключалася ў сумесных дзеяннях з польскімі і яўрэйскімі камітэтамі па аказанні дапамогі беженцам, а канкрэтна – ва ўладкаванні танных сталовых [120, спр. 189, арк. 3–36]. Дапамога беженцам Мінскім гарадскім камітэтам УСГ таксама была недастаткова дзейснай [120, спр. 185, арк. 3–6].

У Віцебскай губерні праблема аказання дапамогі беженцам узнікла яшчэ зімой 1914–1915 гг. У лютым 1915 г. выканаўчае бюро УСГ выдзеліла 500 р. на дапамогу беженцам [99, спр. 38, арк. 4–5]. Вясной – летам 1915 г. асноўны клопат пра беженцаў узялі на сябе Таццянінскі камітэт і нацыянальныя арганізацыі. У гэты перыяд гарадскі камітэт УСГ актыўна займаўся зборам ахвяраванняў [99, спр. 27, арк. 13, 64, 72].



Для праверкі таго, як аказваецца дапамога беженцам, галоўны камітэт УСГ накіраваў у Віцебскую губерню ўпаўнаважанага Б.С. Шпалянскага. Апошні ахарактарызаваў дзейнасць нацыянальных і дабрачынных арганізацый як здавальняючую. У той жа час ён адзначыў, што ў Віцебску сутыкнуўся з цяжкасцямі «ў выніку вастрыні нацыянальнага пытання, а з іншага боку – моцнага антыграмадскага настрою, якім прасякнуты некаторыя прадстаўнікі земскага і гарадскога самакіраванняў» [6, с. 351]. Магчыма, па гэтай прычыне апошнія не адразу прынялі ўдзел у аказанні дапамогі беженцам. Пры гэтым з-за недахопу мясцовых сродкаў, дрэннага медыцынскага абслугоўвання было рэкамендавана земскім і гарадскім самакіраваннім сумесна ўдзельнічаць у забеспячэнні патрэб беженцаў. У выніку праведзенай работы стала магчымым стварэнне Віцебскага губернскага аб'яднанага камітэта дапамогі беженцам пры Усерасійскіх земскіх і гарадскіх саюзах [120, спр. 114, арк. 38]. Летам 1915 г. аб'яднаны камітэт прыступіў да арганізацыі медыцынскай дапамогі беженцам праз сетку ўрачэбных устаноў. Важным накірункам яго дзейнасці стала і аказанне юрыдычнай дапамогі беженцам [99, спр. 65, арк. 33, 38].

Доўгачаканы закон ад 30 жніўня 1915 г. «Аб забеспячэнні патрэб беженцаў» даў багатую глебу для розных, нават супрацьлеглых, тлумачэнняў яго артыкулаў з боку дзяржаўных чыноўнікаў і грамадскіх дзеячаў у гэтай справе [75]. Дзеячы УСГ і УЗС перш за ўсё звярнулі ўвагу на арт. 2, у якім гаварылася аб тым, што сярод іншых клапаціцца пра беженцаў павінны земскія і гарадскія самакіраванні. У арт. 4 заклікаліся да супрацоўніцтва на карысць справы беженцаў «усе грамадскія сілы», а ў арт. 22 адзначалася, што на месцах апека беженцаў ускладалася на земскія, гарадскія самакіраванні з правам ствараць асобыя камітэты [41, с. 2–6]. Шмат якія дзеячы саюзаў успрынялі гэтыя артыкулы закона ад 30 жніўня 1915 г. як дазвол дзяржавы ўзяць справу ўладкавання беженцаў у рукі ўказаных самакіраванняў [49, № 27–28, с. 175–184].

Падобныя настроі назіраліся на чарговых з'ездах УСГ і УЗС, якія адначасова адбыліся 7–9 верасня 1915 г. у Маскве. Неабходнасць іх склікання была выклікана надзвычай цяжкім становішчам у краіне. Улічваючы вастрыню беженскага пытання, вырашылі правесці сумеснае пасяджэнне земскіх і гарадскіх з'ездаў [25, № 24, с. 12]. На пасяджэннях з'ездаў УСГ і УЗС прагучала шмат эмацыянальных выступленняў, чуліся заклікі мабілізаваць сілы для перамогі праціўніка [25, № 22–23, с. 15–21], а дасягненне перамогі звязвалася з вырашэннем палітычных пытанняў [48, № 19, с. 23–32]. Па пытаннях аказання дапамогі беженцам на аб'яднаным пасяджэнні былі прыняты ніжэйпададзеныя пастановы.

З'езды пастанавілі, што ў сувязі з паграджальным для дабрабыту дзяржавы характарам руху бежанцаў прымусовае высяленне мірных жыхароў павінна ажыццяўляцца толькі ў выключных выпадках. Дэлегаты земскіх і гарадскіх з'ездаў заявілі, што дапамагаць бежанцам нельга выключна на дабрачынных пачатках, гэта павінна стаць агульнадзяржаўнай справай. На іх погляд, паспяховае ўладкаванне бежанцаў можа адбыцца толькі дзякуючы ўзгодненым намаганням усіх грамадскіх сіл краіны, прычым пад агульным кіраўніцтвам УЗС і УСГ. Удзельнікі з'ездаў вырашылі, што дзейнасць земскіх і гарадскіх самакіраванняў па аказанні дапамогі бежанцам павінна быць аб'яднана пад непасрэдным кіраўніцтвам УЗС і УСГ. Было таксама прызнана пажаданым, каб сродкі на забеспячэнне патрэб бежанцаў мясцовым камітэтам выдзяляліся праз галоўныя камітэты саюзаў [25, № 24, с. 12–17; 48, № 19, с. 33–56].

На з'ездах зацверджаны планы медыка-санітарных мерапрыемстваў для бежанцаў, значная ўвага ўдзялялася клопату аб дзецях бежанцаў. З'езды УСГ і УЗС адобрылі стварэнне Аб'яднанага аддзела па ўладкаванні бежанцаў (ААБЕЖ). У так званы эвакуацыйны перыяд бежанства праца аддзела была сканцэнтравана ў наступных пададдзелах: эвакуацыйным (забеспячэнне бежанцаў у час руху), статыстычным (улік бежанцаў), даведачным (пошук згубленых сваякоў), праваднікоў (забеспячэнне бежанцаў кваліфікаваным суправаджэннем). У рамках ААБЕЖа стварылі таксама ўсерасійскае бюро працы [25, № 24, с. 87–98].

Адзначым, што галоўныя камітэты УЗС і УСГ працягвалі прэтэндаваць на аб'яднанне пад сваім кіраўніцтвам справы дапамогі бежанцам, прычым па ўсёй тэрыторыі імперыі. Такая ініцыятыва адразу сустрэла супрацьдзеянні з боку МУС, Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў і лаяльных да ўрада дабрачынных арганізацый, перш за ўсё Таццянінскага камітэта. Пачынаюцца сур'ёзныя абмежаванні дзейнасці саюзаў у справе ўладкавання бежанцаў у асноўных сферах – фінансавай і арганізацыйнай [49, № 27–28, с. 175–193].

Да 25 верасня 1915 г. перарасход сродкаў, якія галоўны камітэт УЗС выдзеліў са свайго фонду на дапамогу бежанцам, складаў 1 732 625 р. 17 верасня князь Г.Я. Львоў звярнуўся ў Асобую нараду па ўладкаванні бежанцаў з пасланнем, у якім адзначаліся дасягненні саюзаў у справе дапамогі бежанцам, паведамлялася пра рашэнні земскага і гарадскога з'ездаў аб'яднаць гэтую справу пад кіраўніцтвам галоўных камітэтаў УЗС і УСГ і менавіта апошнім адпускаць грашовыя сродкі з казны [25, № 24, с. 85]. Аднак адказу не было. 1 кастрычніка 1915 г. Галоўнаўпаўнаважаны УЗС фактычна прад'явіў МУС, як кіруючай установе ў справе бежанцаў, ультыматум – князь Г.Я. Львоў у чарговы раз прасіў выдзеліць патрэбныя на справу ўладкавання бежанцаў грашовыя сродкі, у адваротным выпадку паведаміў аб магчымасці спынення працы галоўнага камітэта УЗС у гэтай справе [25, № 24, с. 86–87].



Толькі 10 кастрычніка 1915 г. Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў пакрыла УЗС перарасход сродкаў і выдзеліла аванс у 3 млн р. [25, № 25, с. 33–35]. Галоўнае для саюзаў пытанне, а менавіта аб аб'яднанні дзейнасці земскіх і гарадскіх самакіраванняў пад кіраўніцтвам галоўных камітэтаў УЗС і УСГ, нарада ігнаравала. З мэтай папярэдняга і, як аказалася, апошняга абмеркавання гэтага пытання 10 кастрычніка адбылося пасяджэнне крэдытнай камісіі. На ім А.Б. Нейдгарт, старшыня канкуруючай установы – Таццянінскага камітэта, прапанаваў вызначыць ролю саюзаў у аказанні дапамогі бежанцам. У прыватнасці, ён адзначыў, што не трэба прадастаўляць саюзам ролі аб'яднальнікаў мясцовых земстваў і гарадскіх самакіраванняў, таму што гэта можа «звесці на нішто» працу Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў як аб'яднальнай установы. Крэдытная камісія пастанавіла: лічыць дзейнасць саюзаў у аказанні дапамогі бежанцам карыснай і мэтазгоднай, але прызнаць, што аб'яднанне земстваў і гарадоў у гэтай справе супярэчыць закону ад 30 жніўня 1915 г. [49, № 27–28, с. 185–187].

Такім чынам, намаганнямі МУС і лаяльных да ўрада дабрачынных арганізацый мэтазгоднасць аб'яднання земскіх і гарадскіх самакіраванняў у справе ўладкавання бежанцаў пад кіраўніцтвам УЗС і УСГ была адхілена. 13 кастрычніка 1915 г. гэта пытанне разглядаў Савет Міністраў. Было вырашана «не перашкаджаць названым установам у абмеркаванні і распрацоўцы сумеснага агульнага плана», аднак падкрэслівалася, што «нагляд за ходам справы апекі пра бежанцаў у межах губерні павінен заставацца прэрагатывай губернатара» [25, № 24, с. 64–65; 49, № 27–28, с. 188].

16 лістапада 1915 г. Галоўнаўпаўнаважаны УЗС Г.Я. Львоў накіраваў у Асобую нараду па ўладкаванні бежанцаў паведамленне № 12 389. У ім адзначалася, што ні МУС, ні Асобая нарада не прызнаюць, што галоўны камітэт УЗС стане органам, які зможа аб'яднаць дзейнасць мясцовых земстваў у справе ўладкавання бежанцаў. Таму галоўны камітэт УЗС афіцыйна здымае ўскладзеныя на яго Земскім з'ездам абавязкі па аб'яднанні дзейнасці земстваў у важнай справе [25, № 28, с. 59–67]. Пры гэтым УЗС збіраўся ў супрацоўніцтве з ваеннымі ўладамі працягваць дапамагаць бежанцам у франтавых і прыфрантавых губернях.

УСГ вырашыў зрабіць акцэнт на двух асноўных накірунках, а менавіта на аказанні юрыдычнай дапамогі бежанцам і працаўладкаванні. З гэтай мэтай у рамках юрыдычнага аддзела УСГ стварыў спецыяльную падкамісію. Апошняя назвала першачарговымі наступныя віды юрыдычнай дапамогі бежанцам: рэгістра-

цыю знішчанай маёмасці, стварэнне актаў грамадзянскага стану, расследаванне абмежавання асабістай свабоды бежанцаў, кантроль за рэквізіцыйнымі квітанцыямі [48, № 18, с. 66–68].

Актуальнасць гэтых праблем была пацверджана на сумесным пасяджэнні ў Маскве 21 кастрычніка 1915 г. выканаўчага бюро УСГ, ААБЕЖа і камісіі па аказанні юрыдычнай дапамогі бежанцам. Асноўныя пытанні абмеркавання – юрыдычны статус бежанцаў і сітуацыя з гарантаваннем ім асабістых і грамадзянскіх правоў. Упаўнаважаныя УСГ зрабілі даклады па выніках сваіх камандзіровак у заходнія губерні. Усе аднагалосна заявілі, што з'ява бежанства адбываецца ў надзвычай цяжкіх умовах – «бежанцы туляцца ў лясах, буданах, пазбаўлены самых істотных чалавечых правоў, людзі абязлічаны». Акцэнтавалася ўвага на адсутнасці рэгістрацыі нараджэння і смерці бежанцаў. Паводле вынікаў абследавання Віцебска, Полацка і Смаленска ўпаўнаважаныя УСГ пацвердзілі, што акты аб грамадзянскім стане бежанцаў амаль нікім не складаліся. Было заўважана шмат злоўжыванняў па пытаннях абмежавання асабістай свабоды бежанцаў [86, спр. 6423, арк. 117–118].

Упаўнаважаны УСГ, які абследаваў Мінск, Гомель, Смаленск, Рагачоў і Оршу, адзначыў, што бежанцам чыняць вялікія перашкоды пры імкненні атрымаць кампенсацыю за страчаную і знішчаную маёмасць, а гэта затрымлівае іх у бліжэйшым тыле арміі і не дае магчымасці палепшыць сваё матэрыяльнае становішча [86, спр. 6423, арк. 119]. Юрыдычны аддзел УСГ распрацаваў праграму аказання адпаведнай дапамогі бежанцам.

Іншым важным накірункам дзейнасці саюзаў стала працаўладкаванне бежанцаў. З гэтай мэтай пры ААБЕЖы стварылі Усерасійскае бюро працы, аб'яднаўшае дзейнасць мясцовых бюро працы. Згодна з інструкцыяй апошніх іх асноўнай задачай было пасрэдніцтва паміж работадаўцамі і бежанцамі [25, № 26, с. 69–70]. У адпаведнасці са звесткамі афіцыйных выданняў саюзаў усе бюро працы ў залежнасці ад заснавальніка падзяляліся на наступныя групы: земскія бюро – 51, гарадскія – 52, бюро ЗемГора – 16, астатнія – 34 [26, № 34, с. 110–113]. У Беларусі бюро працы ад саюзаў з'явіліся ў Віцебску, Магілёве і Мінску, а таксама ў шэрагу павятовых гарадоў.

У Беларусі восенню 1915 г. дзейнасць мясцовых камітэтаў УЗС і УСГ па дапамозе бежанцам у час эвакуацыі змянялася апекай над асеўшымі бежанцамі. У 1916 г. асноўныя намаганні губернскіх і павятовых камітэтаў саюзаў былі сканцэнтраваны на забеспячэнні патрэб бежанцаў, якія знаходзіліся на часовым месцы жыхарства.

Пасля захопу праціўнікам Гродзенскай губерні кіраўніцтва камітэта Заходняга фронту УЗС (утварыўся пасля падзелу Паўночна-Заходняга фронту) пераехала ў Мінск. Пачынаючы з кастрычніка 1915 г. тут па ініцыятыве ўпаўнаважаных гэтага камітэта сталі рэгулярна праводзіцца пасяджэнні, мэта якіх – аб'яднанне ўсіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам на Заходнім фронце. Аб'яднаная нарада звычайна збіралася два разы на тыдні, у якасці яе выканаўчага органа дзейнічаў камітэт [120, спр. 98, арк. 40]. На пасаду старшыні пасяджэнняў аб'яднанай нарады па чарзе выбіраліся прадстаўнікі асноўных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам. У лістападзе 1915 г. на пасяджэннях аб'яднанай нарады абмяркоўвалася ажыццяўленне эвакуацыі бежанцаў з Мінскай губерні, на чым настойвалі ваенныя ўлады.

У Мінскай губерні ўпаўнаважаныя УЗС, УСГ і прадстаўнікі дабрачынных арганізацый імкнуліся не дапусціць пагалоўнай эвакуацыі бежанцаў, таму што ні дзяржаўныя, ні грамадскія і дабрачынныя арганізацыі не былі падрыхтаваны да забеспячэння такой вялікай колькасці людзей (больш за 100 тыс.) у час руху ў глыб імперыі. У гэтым пытанні аб'яднаная нарада цесна супрацоўнічала з губернскай нарадай на чале з губернатарам, на іх сумесным пасяджэнні былі выпрацаваны мерапрыемствы па ажыццяўленні добраахвотнай эвакуацыі бежанцаў з Мінскай губерні як бліжэйшага тылу арміі. Пры гэтым ваенныя ўлады папярэдзілі: калі не адбудзецца добраахвотная эвакуацыя, будзе праведзена прымусовае высяленне [120, спр. 84, арк. 9–23]. У снежні 1915 г. галоўнакамандуючы Заходнім фронтам з улікам акалічнасцей і цяжкасцей магчымага руху бежанцаў вырашыў прыпыніць высяленне бежанцаў з Мінскай губерні.

Адзначым, што аб'яднаная нарада ў Мінску толькі размяркоўвала працу па аказанні дапамогі бежанцам паміж яе арганізацыямі-ўдзельніцамі. Апошнія павінны былі выконваць узятую на сябе частку працы. Як адзначалася ў папярэднім главе, дзяржаўным наглядам за аб'яднаннем справы дапамогі бежанцам і, галоўнае, размеркаваннем грашовых сродкаў займалася губернская нарада на чале з губернатарам.

У Віцебску таксама дзейнічала нарада з мэтай аб'яднання арганізацый па ўладкаванні бежанцаў, ініцыятар склікання якой – губернскі камітэт ЗемГора. У працы гэтай нарады прымалі ўдзел Віцебскае аддзяленне Тацццянінскага камітэта, гарадская апека аб бежанцах, Таварыства дапамогі пацярпеўшаму ад вайны насельніцтву Польшы, Яўрэйскае таварыства дапамогі ахвярам вайны, Латышскае дабрачыннае таварыства, Рымска-каталіцкае дабрачыннае таварыства і гарадская бальнічная каса віцебскіх фабрычных рабочых [6, с. 350–351].

У сувязі з тым, што ваенныя ўлады прызналі магчымым пражыванне бежанцаў у Мінскай губерні, перад грамадскімі і даб-

рачыннымі арганізацыямі была пастаўлена задача ўладкаваць пацярпеўшых ад вайны на месцы часовага пражывання. Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам, а таксама генерал М.А. Данілаў паставілі ў снежні 1915 г. перад аб'яднанай нарадай у Мінску новыя задачы – падрыхтаваць уладкаванне бежанцаў на працу, для чаго неабходна было правесці іх падлік і ўстанавіць колькасць працаздольных [120, спр. 84, арк. 24–27].

На падставе атрыманых у час рэгістрацыі даных канцылярыя галоўнага начальніка забеспячэння армій Заходняга фронту вызначыла колькасць бежанцаў на тэрыторыі, падлягаючай камандаванню Заходняга фронту, у 300 230 чалавек (таб. 2) [119, спр. 435, арк. 102].

*Табліца 2*

***Колькасць бежанцаў, якія ў пачатку 1916 г. знаходзіліся на тэрыторыі, падпарадкаванай камандаванню Заходняга фронту***

| Паўнамоцтва | Колькасць зарэгістраваных бежанцаў | Працаздольныя бежанцы | |
|---|---|---|---|
| | | колькасць | % |
| Дзісненскае | 18820 | 3389 | 18,01 |
| Вілейскае | 25200 | 5544 | 22,00 |
| Заслаўскае | 22100 | 4420 | 20,00 |
| Навагрудскае | 20320 | 4064 | 20,00 |
| Мінска-Магілёўскае | 61060 | 10990 | 18,00 |
| Смаленскае | 50680 | 8615 | 17,00 |
| Слуцкае | 26810 | 4094 | 15,27 |
| Пінскае | 16160 | 2748 | 17,00 |
| Сарнскае | 18250 | 2930 | 16,05 |
| Бабруйскае | 21485 | 3437 | 16,00 |
| Гомельскае | 19345 | 3482 | 18,00 |
| Усяго па паўнамоцтвах | 300230 | 53717 | 17,89 |

Самая значная колькасць бежанцаў, больш чым па 50 тыс. чалавек, знаходзілася ў Мінска-Магілёўскім і Смаленскім паўнамоцтвах. У астатніх месцах бежанцы размеркаваліся прыкладна аднолькава – ад 16 да 26 тыс. на паўнамоцтва. Працаздольнымі вызначылі 53 717 чалавек, што складала не больш за 18 % ад агульнай колькасці зарэгістраваных бежанцаў.

У студзені 1916 г. франтавыя камітэты саюзаў паведамілі генералу М.А. Данілаву аб колькасці даглядаемых бежанцаў. Згодна з данымі камітэта Заходняга фронту УСГ, яго харчовымі



пунктамі ў межах фронту карысталіся 35 418 бежанцаў, з іх мужчын – 15 726 (працаздольных – 5667), жанчын – 19 692. У Мінскай губерні харчовымі пунктамі камітэта карысталіся 25 155 бежанцаў, у Віленскай – 2075 і ў Магілёўскай – 8188 [119, спр. 435, арк. 103].

Паводле даных Камітэта Заходняга фронту УЗС, яго ўстановы аказвалі дапамогу 140 933 бежанцам, з іх працаздольных мужчын ад 17 да 55 гадоў было 21 835, што складала каля 15 % ад агульнай колькасці зарэгістраваных (табл. 3) [119, спр. 435, арк. 104–105].

*Табліца 3*

***Колькасць бежанцаў, якія знаходзіліся пад апекай мясцовых камітэтаў УЗС у пачатку 1916 г.***

| Павет і раён дыслакацыі армій | Колькасць зарэгістраваных бежанцаў | Працаздольныя бежанцы | |
|---|---|---|---|
| | | колькасць | % |
| Гомельскі | 37966 | 5315 | 14,00 |
| Бабруйскі | 12814 | 1615 | 12,60 |
| Аршанскі | 8911 | 1310 | 14,70 |
| Барысаўскі | 2908 | 497 | 17,09 |
| Полацкі | 2411 | 258 | 10,70 |
| Смаленскі | 19152 | 3141 | 16,40 |
| Мінскі | 21556 | 3557 | 16,50 |
| Усяго па паветах | 105718 | 15693 | 14,84 |
| 1-й арміі | 1305 | 200 | 15,33 |
| 2-й арміі | 172 | 48 | 27,91 |
| 3-й арміі | 12126 | 1646 | 13,57 |
| 4-й арміі | 1789 | 343 | 19,17 |
| 10-й арміі | 19823 | 3905 | 19,70 |
| Усяго па раёнах дыслакацыі армій | 35215 | 6142 | 17,44 |
| **Па ўсіх тэрыторыях** | 140933 | 21835 | 15,49 |

У паветах камітэт клапаціўся пра 105 718, а ў раёнах дзеяння армій – пра 35 215 бежанцаў. Найбольшай колькасці апошніх камітэт Заходняга фронту УЗС аказваў дапамогу ў Гомельскім і Мінскім паветах і ў раёне дзеяння 10-й арміі. З 1 лютага УЗС меркаваў спыніць выдачу прадуктаў харчавання працаздольным мужчынам [119, спр. 435, арк. 104–105].

Ваенныя ўлады ўважліва сачылі за працай франтавых камітэтаў УЗС і УСГ, бо часткова фінансавалі іх дзейнасць. Зімой 1915–1916 гг. генерал М.А. Данілаў зрабіў спецыяльны запыт камандуючым арміямі Заходняга фронту, каб высветліць эфектыўнасць працы саюзаў. Армейскае камандаванне перш за ўсё адзначыла дзейнасць УЗС на карысць войскаў, адзначаліся таксама поспехі гэтай арганізацыі ва ўладкаванні бежанцаў. Працу УСГ таксама атэставалі добра, але адзначаліся вузкія рамкі дзейнасці, недастатковасць санітарных мерапрыемстваў.

Камандучы 2-й арміяй адзначыў, што ў арганізацыях, якія аказваюць дапамогу бежанцам, адсутнічае салідарнасць з калегамі, не вядзецца планамерная сумесная праца, назіраецца канкурэнцыя [119, спр. 447, арк. 2–44].

Падкрэслім, што, нягледзячы на існаванне некалькіх нарад па аб'яднанню дзейнасці арганізацый, якія дапамагаюць бежанцам, праблема каардынацыі дзеянняў дзяржаўных, грамадскіх і дабрачынных устаноў заставалася нявырашанай. Гэта тлумачыцца супярэчлівымі ўмовамі палітычнага, эканамічнага і грамадскага жыцця Расійскай імперыі, у якіх вымушаны былі працаваць арганізацыі па аказанні дапамогі бежанцам.

У лютым 1916 г. аб'яднаная нарада арганізацый дапамогі бежанцам у Мінску прызнала неабходнасць тэрміновых дзеянняў па паляпшэнні становішча гэтай катэгорыі пацярпеўшых ад вайны. Крытычны стан справы ўладкавання бежанцаў стаў падставай для прыняцця аб'яднанай нарадай 9 лютага дакладной запіскі ў Дзяржаўную Думу. У распрацоўцы і прыняцці гэтага дакумента прынялі ўдзел прадстаўнікі асноўных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам на Заходнім фронце, у тым ліку франтавога і губернскага камітэта УЗС, УСГ, мінскага губернскага земства, аддзела па ўладкаванні бежанцаў ЗемГора, Рускага таварыства дапамогі яўрэям – ахвярам вайны, мінскіх аддзелаў Беларускага, Літоўскага, Польскага камітэтаў, а таксама Цэнтральнага абывацельскага камітэта губерняў Царства Польскага [120, спр. 84, арк. 33].

У пастанове аб'яднанай нарады, накіраванай у Дзяржаўную Думу, былі прааналізаваны існуючыя ўмовы дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам і прапанаваны меры па паляпшэнні становішча апошніх. Было прызнана, што існуючыя правілы кампенсацыі страт неаднолькава ўлічваюць інтарэсы розных катэгорый бежанцаў. Прыводзіліся факты дыскрымінацыі ў адносінах да бежанцаў некаторых нацыянальнасцей. Члены аб'яднанай нарады крытыкавалі існуючую практыку аказання дапамогі бежанцам, у аснову якой, па іх меркаванню, дзяржава паклала прынцып «падтрымкі толькі фізічнага існавання насельніцтва, што ператварыла іх у пенсіянераў казны». Таму ў пастанове



аб'яднаная нарада абвясціла аб неабходнасці павелічэння матэрыяльнай дапамогі бежанцам і абавязковым іх працаўладкаванні.

Было прызнана неабходным тэрмінова выдаць у заканадаўчым парадку правілы часовай папярэдняй дапамогі пацярпеўшаму ад вайны насельніцтву. Правілы павінны былі будавацца на такіх прынцыпах дапамогі, якія б мелі сваёй канчатковай мэтай узнаўленне гаспадарчай і прафесійнай дзеяздольнасці насельніцтва. Прычым дапамогу трэба ажыццяўляць праз адпаведныя арганізацыі пры ўмове ўсебаковага грамадскага кантролю. У выніковай пастанове аб'яднанай нарады падкрэслівалася, што дзяржава павінна дапамагаць усяму насельніцтву, незалежна ад нацыянальнасці, маёмаснага становішча, а таксама прафесіі [86, спр. 6423, арк. 71–74]. Адзначым, што ўказаны дакумент з'явіўся праз паўгода пасля зацвярджэння закона «Аб забеспячэнні патрэб бежанцаў», што ўказвае на пэўную незадаволенасць грамадскіх і нацыянальных арганізацый рэалізацыяй гэтага заканадаўчага акта.

Пра даклад аб'яднанай нарады ў Мінску паведамілі некаторыя перыядычныя выданні, напрыклад часопіс «Жизнь беженцев». Яго крытычныя палажэнні выклікалі пэўны грамадскі рэзананс. Аднак ад афіцыйнай улады ніякай рэакцыі не паследавала.

У сакавіку 1916 г. у Маскве адбыўся IV з'езд УСГ, у рамках якога працавала секцыя дапамогі бежанцам. Упаўнаважаныя УСГ рэзка крытыкавалі дзейнасць МУС і Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў. Перад бежанскай секцыяй паставілі пытанне: у якіх напрамках павінна разгортвацца праца ААБЕЖа ў складаных умовах супрацьстаяння грамадскіх арганізацый і дзяржаўнай улады? Большасць выступаючых характарызавалі справу ўладкавання бежанцаў як бязладную, што стала вынікам нескаардынаванай працы розных арганізацый [49, № 29–30, с. 7, 8, 92].

Адчуваючы супрацьдзеянне з боку дзяржаўнай улады, саюзы паступова скарацілі дзейнасць па аказанні дапамогі бежанцам, нягледзячы на бясспрэчныя дасягненні ў гэтай справе. Аб адносінах вярхоўнай улады да працы саюзаў яскрава сведчыць наступны факт. У сваіх мемуарах М. Лемке працытаваў размову цара Мікалая II з генералам М.В. Аляксеевым аб мэтазгоднасці накіравання прывітальных тэлеграм чарговым з'ездам УСГ і УЗС у сакавіку 1916 г. Тэлеграмы цар накіраваў, аднак аб Земскім і Гарадскім саюзах заўважыў: «Уся гэта праца – сістэматычны падкоп пад мяне і маё кіраўніцтва... Арыштаваць бы іх усіх замест удзячнасці» [76, с. 631].

На пасяджэнні галоўнага камітэта УСГ у ліпені 1916 г. разглядалася пытанне аб рэарганізацыі ААБЕЖа ў сувязі з тым, што Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў адпускала сродкі непасрэдна земскім і гарадскім самакіраванням, мінуючы саюзы [49, № 34, с. 238].

На працягу 1916 г. мясцовыя камітэты УЗС і УСГ у Беларусі займаліся ўладкаваннем бежанцаў на месцах часовага жыхарства. Гэта дзейнасць ажыццяўлялася ў супрацоўніцтве з мясцовымі земскімі ўправамі і гарадскімі самакіраваннямі. У сельскагаспадарчы сезон 1916 г. дзяржаўная ўлада вызначыла галоўную задачу для ўсіх арганізацый. Гэта – прыцягненне бежанцаў да працы. У выніку мабілізацыі ў гаспадарцы адчуваўся значны недахоп рабочых рук. 4 лютага 1916 г. міністр земляробства звярнуўся да губернскіх і земскіх управ з цыркулярам аб папаўненні страты працоўных у сельскай гаспадарцы. Адным з галоўных мерапрыемстваў назвалі выкарыстанне працы бежанцаў [121, спр. 31, арк. 19–20]. Але гэтыя разлікі ўлады не спраўдзіліся. У шэрагу перыядычных выданняў (напрыклад, у газеце «Земщина») з'явіліся абвінавачванні бежанцаў у дармаедстве [20, № 8–9, с. 12].

Усерасійскае бюро працы, створанае саюзамі, падышло да праблемы ўхілення бежанцаў ад працы з іншых пазіцый. Былі даследаваны прычыны гэтага на падставе вопыту мясцовых бюро працы. Усяго апрацавалі 87 анкет. Мясцовыя бюро працы сярод галоўных прычын, па якіх працаздольныя бежанцы ўхіляліся ад працы, назвалі наступныя: маральнае ўзрушэнне, страх страціць сямейныя і сяброўскія сувязі, непасільнасць прапануемай работы, неадпаведнасць яе прафесійным навыкам бежанцаў, нязвыклае бытавое і геаграфічнае асяроддзе, недахоп адзення і абутку, няведанне мовы, уплыў пайка на адмаўленне ад работы, эксплуатацыя працы бежанцаў [49, № 27–28, с. 250–268].

Восенню 1916 г. ваенныя ўлады палічылі неабходным сканцэнтраваць усю працу франтавых камітэтаў УЗС і УСГ на забеспячэнні патрэб арміі. Таму адбыўся працэс перадачы бежанскіх установ, колькасць якіх адначасова скарачалася, ад франтавых камітэтаў саюзаў губернскім камітэтам. Нягледзячы на значнае скарачэнне памераў дапамогі бежанцам у 1916 г., мясцовыя камітэты УЗС у Магілёўскай і Мінскай губернях працягвалі апекаваць значную колькасць бежанцаў. У Мінскай губерні губернскія і павятовыя камітэты УЗС, якія спецыялізаваліся на аказанні медыцынскай дапамогі, пасля атрымання ўстаноў ад франтавога камітэта пачалі ажыццяўляць і медыцынскую, і харчовую дапамогу [60, с. 1–4]. У снежні 1917 г. у падпарадкаванні Мінскага губернскага камітэта УЗС было каля 50 бежанскіх устаноў, сярод іх – прытулкі, лазні, школы, медыцынскія і харчовыя ўстановы [91, спр. 42, арк. 509].

Згодна са звесткамі канцылярыі Магілёўскага губернатара ў 1916 г. у губерні дзейнічалі губернскі камітэт УЗС і яго павятовыя аддзяленні ў Оршы, Рагачове, Чавусах, Чэрыкаве. Гарадскія камітэты УСГ апекавалі нязначную колькасць бежанцаў. Гарадскія аддзяленні УСГ працавалі ў Магілёве, Гомелі, Оршы і Чэрыкаве



[94, спр. 2111, арк. 38–43]. У 1916 г. асноўным і амаль адзіным напрамкам дзейнасці Магілёўскага губернскага камітэта застаўся клопат пра дзяцей бежанцаў [91, спр. 25, арк. 8]. Летам 1916 г. у падпарадкаванні камітэта былі два прытулкі ў Магілёўскім, адзін у Рагачоўскім і адзін у Горацкім паветах [120, спр. 418, арк. 61].

4 снежня 1916 г. галоўны камітэт УСГ пастанавіў ліквідаваць ААБЕЖ ЗемГора і адначасова стварыць уласны орган дапамогі бежанцам, які захавае агульнае кіраўніцтва дзіцячымі прытулкамі. У такіх абставінах шмат якія мясцовыя земствы і гарадскія самакіраванні аказвалі дапамогу бежанцам, зыходзячы з указанняў і загадаў ваенных і цывільных улад без непасрэднага ўдзелу саюзаў.

Галоўным канкурэнтам УЗС і УСГ у справе аказання дапамогі бежанцам з'яўляўся Таццянінскі камітэт. Менавіта канкурэнцыяй, а не супрацоўніцтвам характарызуюцца ўзаемаадносіны гэтых буйнейшых арганізацый па дапамозе бежанцам. Барацьба ішла за крэдыты з казны, права рэгістраваць бежанцаў, колькасць даглядаемых бежанцаў [69]. У перыяд праўлення царскага ўрада перавагу меў Таццянінскі камітэт, які заўсёды падтрымліваў дзеянні ўлады і фактычна з'яўляўся праўрадавай арганізацыяй. Інакш не магло быць, бо называўся камітэт у гонар вялікай князёўны Таццяны Мікалаеўны – адной з царскіх дачок і працаваў пад яе ганаровым кіраўніцтвам. Узначальваў Таццянінскі камітэт член Дзяржаўнага Савета А.Б. Нейдгард, а ў губернях яго супрацоўнікамі былі на грамадскіх пачатках дзяржаўныя чыноўнікі і служачыя. У шэрагу афіцыйных дакументаў дарэвалюцыйнага часу [121, спр. 1, арк. 1], а таксама ў артыкулах сучасных аўтараў [65, с. 99] Таццянінскі камітэт названы буйнейшай дабрачыннай установай, якая з першага года вайны ўзяла на сябе асноўны цяжар клопату пра бежанцаў. Гэтыя палажэнні патрабуюць удакладнення.

Асноўныя напрамкі дзейнасці Таццянінскага камітэта былі вызначаны спецыяльным палажэннем аб гэтай установе, зацверджаным 14 верасня 1914 г. Згодна з Палажэннем аб Камітэце Яе Імператарскай Высокасці Вялікай Княжны Таццяны Мікалаеўны для аказання часовай дапамогі пацярпелым ад ваенных бедстваў камітэт знаходзіўся, як ужо адзначалася, пад ганаровым кіраўніцтвам вялікай князёўны Таццяны Мікалаеўны. У яго ўваходзілі старшыня, віцэ-старшыня і прызначаныя члены. У пасяджэннях камітэта маглі прымаць удзел прадстаўнікі міністэрстваў: унутраных спраў, ваеннага, шляхоў зносін, фінансаў [41, с. 9–10].

У п. 6 Палажэння аб Таццянінскім камітэце сцвярджалася, што гэта ўстанова аказвае часовую дапамогу асобам, якія збяднелі ў выніку бедстваў, выкліканых ваенным становішчам. Гэта дапамога распаўсюджвалася як на тых, хто застаўся на месцы

свайго жыхарства, так і на пакінуўшых яго па патрабаванні ваенных улад ці па іншых прычынах, звязаных з ваенным часам.

У п. 7 удакладняліся наступныя віды дапамогі пацярпеўшым ад вайны, з мэтай аказання якіх быў створаны Таццянінскі камітэт. Гэта – выдача аднаразовай матэрыяльнай дапамогі; садзейнічанне ў вяртанні на радзіму ці месца пастаяннага жыхарства; пошук заняткаў для працаздольных; садзейнічанне ў размяшчэнні ў прытулках ці іншых дабрачынных установах непрацаздольных; выдача апошнім дапамогі; садзейнічанне ў атрыманні ўзнагароды за панесеныя з-за ваеннага становішча страты; а таксама прыём ахвяраванняў [41, с. 10–11].

Сродкі, якімі да лета 1915 г. распараджаўся Таццянінскі камітэт, у асноўным складаліся з ахвяраванняў і часткова – з асігнаванняў з казны. Пасля выдання закона ад 30 жніўня 1915 г. амаль усе сродкі камітэту вылучаліся з казны.

Палажэнне аб Таццянінскім камітэце можна вызначыць як першы афіцыйны дакумент аб бежанцах. Прама яны тут не ўзгадваюцца, аднак у далейшым указаныя ў «Палажэнні» катэгорыі пацярпеўшага ад вайны насельніцтва будуць лічыцца менавіта бежанцамі. Звяртае на сябе ўвагу сціплы характар вызначанай дапамогі для пацярпеўшых з-за ваеннага становішча ў першы год вайны. Прапанавалася не пастаянная, а разавая дапамога ў выглядзе невялікай сумы грошай.

Больш таго, аддзяленні Таццянінскага камітэта пры разглядзе прашэнняў аб аказанні дапамогі павінны былі ўлічваць маёмасны і сацыяльны стан пацярпеўшага. Гэта пацвярджае службовая перапіска паміж цэнтральным і мясцовымі камітэтамі. У кастрычніку 1914 г. А.Б. Нейдгард накіраваў старшыні Мінскага аддзялення Таццянінскага камітэта паведамленне аб накіраванні 5 тыс. р., за кошт якіх, як было падкрэслена, дапамога можа прадастаўляцца не ўсім пацярпеўшым, а толькі тым, хто аказаўся ў бядотным становішчы з-за вайны. Сам старшыня Таццянінскага камітэта тлумачыў сціплую дапамогу абмежаванасцю памераў добраахвотных ахвяраванняў, з якіх у той перыяд складаліся асноўныя сродкі гэтай установы [88, спр. 8577, арк. 2, 8].

Восенню 1914 г. адбывалася станаўленне арганізацыйнай структуры Таццянінскага камітэта. У паветах ствараліся мясцовыя аддзяленні, якія падпарадкоўваліся губернскім камітэтам. За першы год вайны дзякуючы падтрымцы дзяржаўнай улады і пры непасрэдным удзеле яе прадстаўнікоў мясцовыя аддзяленні Таццянінскага камітэта былі створаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Установамі Таццянінскага камітэта ў Мінскай губерні з'яўляліся губернскае, гарадское і дзевяць павятовых аддзяленняў. Губернскае працавала пад кіраўніцтвам мінскага губернатара, гарадское – віцэ-губернатара, а павятовыя – пад старшынствам



павятовых прадвадзіцеляў дваранства. Сярод розных відаў дзейнасці па апекаванні пацярпеўшых з-за ваеннага становішча пераважалі выдача аднаразовых грашовых дапамог, забеспячэнне праязнымі пасведчаннямі, а таксама субсідзіраванне іншых дабрачынных арганізацый [88, спр. 9028, арк. 397].

Адзначым апошні від дапамогі, бо менавіта ён вызначае асобы статус Таццянінскага камітэта. Справа ў тым, што ў першы год вайны да выдання спецыяльных дакументаў аб бежанцах, якія ўстанавілі фінансаванне іх патрэб сродкамі з казны, сярод дабрачынных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам менавіта Таццянінскаму камітэту выдзяляліся дзяржаўныя субсідыі. Асноўная частка грамадскіх і нацыянальных арганізацый была абмежавана толькі добраахвотнымі ахвяраваннямі. Таму ўказаныя арганізацыі перыядычна звярталіся ў аддзяленні Таццянінскага камітэта па грашовы аванс.

Зімой – вясной 1915 г. мясцовыя аддзяленні Таццянінскага камітэта актыўна займаліся зборам ахвяраванняў, разглядалі заявы бежанцаў аб прадастаўленні матэрыяльнай дапамогі. Напрыклад, Мазырскае павятовае аддзяленне Таццянінскага камітэта наладжвала дабрачынныя канцэрты, праводзіла святы, прызначыла пенсіі некалькім бежанцам [88, спр. 8578, арк. 1].

Пашырэнне сферы дзейнасці Таццянінскага камітэта адбылося летам 1915 г. Перыядычна сталі праводзіцца пасяджэнні мінскага губернскага аддзялення, на якіх старшынстваваў А.Ф. Гірс (адначасова ён узначальваў губернскі камітэт). З пачаткам масавага руху насельніцтва заходніх губерняў аддзяленні Таццянінскага камітэта атрымлівалі ад нацыянальных арганізацый (яўрэйскіх ці польскіх) запыты на сродкі. На пасяджэнні мінскага губернскага аддзялення Таццянінскага камітэта 8 жніўня 1915 г. было выдзелена: мінскаму таварыству дапамогі бедным яўрэям – 5 тыс. р., мінскаму аддзелу таварыства дапамогі бедным сем'ям палякаў – 4 тыс. р. [88, спр. 8639, арк. 4–5].

Да распрацоўкі закона «Аб забеспячэнні патрэб бежанцаў» ад 30 жніўня 1915 г. дзяржаўная ўлада не выдавала зразумелых інструкцый, дзе было запісана, на кім ляжыць каардынацыя справы мясцовай апекі аб бежанцах, таму арганізацыі імкнуліся вырашыць гэта пытанне самастойна. Як адзначалася вышэй, справу ўладкавання бежанцаў спрабавалі ўзяць у свае рукі УЗС і УСГ. Падобныя імкненні ўласцівы былі і шэрагу дзеячаў Таццянінскага камітэта. Мінскі губернатар А.Ф. Гірс, які быў адначасова старшынёй губернскага камітэта і губернскага аддзялення Таццянінскага камітэта, выступіў з ініцыятывай поўнага зліцця гэтых устаноў. А.Ф. Гірс прызнаў пажаданым сканцэнтраваць менавіта ў аддзяленнях Таццянінскага камітэта справу ўладкавання бежанцаў у губерні, аб чым было паведамлена А.Б. Нейдгарду [88, спр. 8639, арк. 5; 90, спр. 7, арк. 207–217].

Мінскае гарадское аддзяленне Таццянінскага камітэта займалася ўладкаваннем беженцаў у цесным кантакце з іншымі дабрачыннымі арганізацыямі. Так, 3 жніўня 1915 г. адбылося сумеснае пасяджэнне з удзелам упаўнаважаных саюза гарадоў. Пастанавілі пабудаваць у горадзе баракі з кухняй, лазняй і пральняй. Прычым два баракі для хрысціян, два – для яўрэяў і адзін агульны. Было вырашана часова выкарыстаць для размяшчэння беженцаў 19 школьных будынкаў. Удзельнічаў у аказанні дапамогі і гарадскі камітэт. Прыбыўшых беженцаў дзяжурныя паліцэйскія чыноўнікі накіроўвалі ў паліцэйскі ўчастак, потым – у прытулкі. Адтуль у гарадскі камітэт дасылаліся спісы з указаннем колькасці пацярпеўшых, якія мелі патрэбу ў бясплатным харчаванні і іншай дапамозе [90, спр. 7, арк. 213–215].

Актыўна дзейнічалі павятовыя аддзяленні Таццянінскага камітэта. Так, у ліпені 1915 г. на пасяджэннях Бабруйскага аддзялення абмяркоўваліся пытанні дапамогі чакаемым беженцам з Сувалкаўскай і Гродзенскай губерняў, збіраліся ахвяраванні [88, спр. 8989, арк. 33].

У Магілёўскай губерні ўстановамі Таццянінскага камітэта былі губернскае і 11 павятовых аддзяленняў [94, спр. 2111, арк. 38–42]. Спектр аказваемай дапамогі быў самы шырокі. Яе ажыццяўлялі харчовы пункт, 4 сталовыя і 5 прытулкаў у Магілёве; у паветах – амбулаторыі, бальніцы, баракі, прытулкі, а таксама бюро працы [94, спр. 2111, арк. 44–48]. Перыядычны часопіс Таццянінскага камітэта паведамляў аб вялікіх заслугах Магілёўскага губернскага аддзялення ў справе ўладкавання беженцаў у губерні [51, № 4, с. 15].

Магілёўскае губернскае аддзяленне Таццянінскага камітэта пакінула за сабой каардынацыю справы, а практычную рэалізацыю мерапрыемстваў даручыла павятовым аддзяленням. У 1915 г. Таццянінскі камітэт асігнаваў Магілёўскаму аддзяленню 998 тыс. р., у 1916 г. – 512 тыс. р. Сродкі былі выкарыстаны на арганізацыю харчавання транзітных беженцаў, на будаўніцтва баракаў, набыццё фуражу для жывёлы. Так, Рагачоўскае павятовае аддзяленне адкрыла сталовыя ў Доўску, Гадзілавічах і Дварцы. У Рагачове са жніўня па кастрычнік 1915 г. было выдадзена 660 тыс. порцый ежы [7, с. 82].

У Віцебскай губерні дзейнічалі губернскі камітэт і яго аддзелы ў паветах, а таксама гарадскія камісіі ў Дзвінску і Віцебску. Першая партыя беженцаў прыбыла ў Дзвінск яшчэ ў кастрычніку 1914 г., Таццянінскі камітэт усім аказаў грашовую дапамогу. Клопат пра беженцаў, якія прыбылі ў губерню зімой 1914–1915 гг., таксама ўзялі на сябе павятовыя аддзяленні, арганізаваныя яшчэ восенню 1914 г. 26 чэрвеня 1915 г. утварыўся Віцебскі губернскі камітэт, які аб'яднаў дзейнасць павятовых і гарадскіх аддзяленняў [51, № 4, с. 14].



Са жніўня па кастрычнік 1915 г. аддзяленні Таццянінскага камітэта адкрылі пяць харчовых пунктаў, на якіх беженцам выдалі каля 200 тыс. абедзенных порцый. Яшчэ адзін пункт на вакзале Віцебска выдаў з 7 ліпеня па 1 кастрычніка 173 849 порцый гарачай ежы і 6106 порцый хлеба і гарбаты. Для беженцаў, якія засталіся ў губерні на часовае жыхарства, былі абсталяваны шэсць пунктаў і пабудавана шэсць баракаў. Медыцынская дапамога аказвалася на чатырох гарадскіх участках, якія прынялі ў ліпені – верасні 1915 г. 6 тыс. хворых. Па ініцыятыве прадстаўнікоў Таццянінскага камітэта ў верасні 1915 г. арганізавалі Віцебскае цэнтральнае бюро працы, якое павінна было на бязвыплатнай аснове аказваць пасрэдніцкія паслугі беженцам [98, спр. 307, арк. 1–2]. У цэлым у 1915 г. Таццянінскі камітэт асігнаваў Віцебскаму аддзяленню на ўладкаванне беженцаў 241 тыс. р., а ў 1916 – 160 тыс. р. [6, с. 350].

Пасля прыняцця закона «Аб забеспячэнні патрэб беженцаў» ад 30 жніўня 1915 г., які асобным артыкулам адзначыў дзейнасць Таццянінскага камітэта ў справе ўладкавання беженцаў, статус гэтай арганізацыі не змяніўся. Яна заставалася дабрачыннай арганізацыяй, якая займала праўрадавую пазіцыю па спрэчных пытаннях у беженскай справе і ў выніку мела асаблівую падтрымку з боку дзяржавы.

З восені 1915 г. адным з галоўных напрамкаў дзейнасці Таццянінскага камітэта стаў улік і рэгістрацыя колькасці беженцаў, пошук іх згубленых сваякоў. Пытанне гэта – адно з важнейшых ва ўсёй беженскай справе, прычым цікавіла яно як органы ўлады, так і саміх беженцаў. Дзяржаўная ўлада была зацікаўлена ў правільнай рэгістрацыі беженцаў, каб ведаць дакладную колькасць працаздольных, а дабрачынным арганізацыям звесткі пра беженцаў патрэбны былі для правільнай арганізацыі справы. Таму па ўласнай ініцыятыве ўлік беженцаў праводзілі «Поўначдапамога», УЗС і УСГ, Таццянінскі камітэт. Кожная арганізацыя сцвярджала, што менавіта яе падлікі з'яўляюцца самымі дакладнымі і аб'ектыўнымі.

Канчатковае рашэнне па гэтаму пытанню прынята на пасяджэнні Асобай нарады па ўладкаванні беженцаў 26 лістапада 1915 г. Было вырашана, што гэтай справай павінна займацца адно цэнтральнае бюро. Такім Асобая нарада прызнала з фармулёўкай «з нагоды паспяховай дзейнасці» Цэнтральнае ўсерасійскае бюро па рэгістрацыі беженцаў пры Таццянінскім камітэце. 29 лістапада гэта рашэнне зацвердзіў міністр унутраных спраў, аб чым ён паведаміў кіраўніцтву УЗС і УСГ, якія прэтэндавалі на гэтую сферу дзейнасці. Было заяўлена, што паралельная рэгістрацыя з'яўляецца марнатраўствам казённых сродкаў, і таму саюзы павінны спыніць улік беженцаў [49, № 27–28, с. 193–206, 209].

Таццянінскі камітэт адначасова займаўся рэгістрацыяй бежанцаў і пошукамі іх сваякоў. Для гэтага рассылаліся анкеты, у якіх былі прыкладна такія пункты: імя, імя па бацьку, прозвішча, саслоўе ці званне, пасада ці занятак, сямейнае становішча, месца пастаяннага жыхарства і часовага знаходжання, памеры гадавога заробку, неабходная дапамога. Пошук згубленых сваякоў меў пэўнае ідэалагічнае значэнне: бежанцы былі вельмі ўдзячны за любыя звесткі пра сваіх блізкіх і накіроўвалі пісьмы з падзякай за станоўчыя вынікі непасрэдна вялікай князёўне Таццяне.

Восенню 1915 г. дзяржаўная ўлада паставіла задачу правесці падрабязны ўлік бежанцаў, аднак гэта справа зацягнулася да канца 1916 г. Перад пачаткам веснавых сельскагаспадарчых работ 1916 г. цывільныя і ваенныя падрадчыкі па найме працоўных пасылалі ў аддзяленні Таццянінскага камітэта запыты аб колькасці працаздольных бежанцаў у пэўнай мясцовасці, іх спецыялізацыі і заробках.

У 1916 г. функцыя губернскіх і павятовых аддзяленняў Таццянінскага камітэта заключалася ў выдзяленні грашовай дапамогі асобным бежанцам і мясцовым арганізацыям, ва ўтрыманні баракаў, бальніц і прытулкаў [90, спр.14, арк. 39–41].

У лістападзе 1916 г. асобы аддзел Таццянінскага камітэта паведаміў, што ў асноўным завершаны агульны перапіс бежанцаў, якіх на той момант налічылі 3 039 956 чалавек. Пазней гэтыя лічбы будуць неаднаразова ўдакладняцца. Камітэт пачаў збіраць матэрыялы для стварэння гісторыі бежанскага руху, планавалася правесці бежанскую выстаўку. З такімі планамі Таццянінскі камітэт падышоў да 1917 г.

Шэраг дабрачынных арганізацый аказвалі дапамогу бежанцам па тэрытарыяльных і нацыянальных прыметах. Справа ў тым, што некаторыя катэгорыі насельніцтва заходніх губерняў (перш за ўсё палякі і яўрэі) пасля высялення і накіравання на ўсход апынуліся ў нязвыклых палітычных і сацыяльных умовах. Кантактам бежанцаў з мясцовым насельніцтвам перашкаджалі моўныя і рэлігійныя бар'еры. Таму былі створаны абывацельскія і нацыянальныя камітэты, каб дапамагчы бежанцам адаптавацца на новым месцы.

Абывацельскія камітэты ствараліся па тэрытарыяльнай прыналежнасці ў мясцовасцях, дзе не было земскіх і гарадскіх самакіраванняў. У гады вайны ў заходніх губернях дзейнічалі абывацельскі камітэт губерняў Царства Польскага, Віленска-Ковенскі, Сувалкаўскі і Гродзенскі абывацельскія камітэты.

Згодна са статутам Віленска-Ковенскага абывацельскага камітэта ён быў створаны з мэтай дапамогі жыхарам гэтых губерняў. Сярод іншых абавязкаў камітэта – збор звестак аб патрэбах насельніцтва і аб асобах, якія пазбаўлены прытулку, сродкаў да жыцця, арганізацыя працы, клопат аб хворых і параненых [42, с. 1–2 ].

Гродзенскі абывацельскі камітэт меў аналагічныя абавязкі. Расследаванне яго дзейнасці выявіла шмат злоўжыванняў супрацоўнікаў гэтай установы.



Гродзенскі абывацельскі камітэт, які павінен быў клапаціцца пра пацярпеўшых ад вайны бежанцаў, што паходзілі з Гродзенскай губерні, быў створаны ў верасні 1915 г. Згодна са сваім статутам задачамі гэтага камітэта з'яўляліся: збіранне звестак пра патрэбы насельніцтва Гродзенскай губерні, а таксама пра колькасць бежанцаў; аказанне дапамогі пацярпеўшым ад вайны шляхам арганізацыі працы і прадастаўлення сродкаў на жыццё; пасрэдніцтва ў набыцці рэчаў першай неабходнасці [121, спр. 1, арк. 291–292]. Кіраўніком камітэта стаў І.В. Красіцкі. Камісія па размеркаванні крэдытаў на патрэбы бежанцаў пры Асобай нарадзе па ўладкаванні іх упершыню зацікавілася справаздачамі Гродзенскага абывацельскага камітэта на пасяджэнні 26 сакавіка 1916 г., калі азнаёмілася з яго дзейнасцю. Вынікі разгляду выкарыстання Гродзенскім абывацельскім камітэтам сродкаў з казны сталі падставай для больш падрабязнага расследавання, для чаго была створана спецыяльная падкамісія.

Па выніках праведзенага 2 красавіка 1916 г. расследавання падкамісія па вывучэнню справы Гродзенскага абывацельскага камітэта прад'явіла абвінавачанні кіраўніцтву апошняга. Гэты камітэт запрасіў суму ў 291 590 р., з якой расходы на ўтрыманне адміністрацыі склалі 140 490 р. пры мяркуемай дапамозе бежанцам у 150 тыс. р. Акрамя таго, Галоўнаўпаўнаважаны па Сібіры і Арэнбургскай губерні П.П. Меер паведамляў, што зімой 1916 г. у Чэлябінску з мэтай рэгістрацыі бежанцаў Гродзенскай губерні з'явіліся тры прадстаўнікі Гродзенскага абывацельскага камітэта, якім камітэт плаціў штомесяц 300 р. аднаму і па 135 р. двум іншымі, плюс 2000 р. на дарожныя расходы. Заробак упаўнаважаных Гродзенскага абывацельскага камітэта ў параўнанні з грашовай дапамогай самім бежанцам выглядаў астранамічна вялікім [121, спр. 1, арк. 292–293].

На пасяджэнні 31 сакавіка 1916 г. падкамісія па вывучэнні справы Гродзенскага абывацельскага камітэта запрасіла членаў Дзяржаўнай Думы ад Гродзенскай губерні, каб выслухаць меркаванні людзей, знаёмых з сітуацыяй. Было высветлена, што не ўсе прадстаўнікі Гродзенскай губерні ў Дзяржаўнай Думе былі запрошаны на першае пасяджэнне Гродзенскага абывацельскага камітэта і таму не маглі працаваць над стварэннем яго статута і паўплываць на яго рашэнні. Многія пасяджэнні камітэта праводзіліся тайна. Члены Дзяржаўнай Думы заявілі, што яны не могуць дакладна ўказаць, у чым заключаецца дзейнасць камітэта ў аказанні дапамогі бежанцам, бо галоўная ўвага гэтай арганізацыі скіравана на асігнаванне грашовых сродкаў для ўтрымання адміністрацыі. У доказ сваіх слоў яны прадставілі заявы гродзенскіх бежанцаў пра сваё жабрацкае становішча [121, спр. 1, арк. 293–294].

Вывады падкамісіі па вывучэнні справы Гродзенскага абывацельскага камітэта былі адназначныя: тэрмінова спыніць яго дзейнасць, назначыць рэвізіі для расследавання знікнення казённых сродкаў [121, спр. 1, арк. 295].

Нягледзячы на відавочнасць злоўжыванняў і злачынстваў кіраўніцтва Гродзенскага камітэта, працэс расследавання і ліквідацыі апошняга зацягнуўся больш чым на год. На 48-м пасяджэнні Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў, якое адбылося 22 чэрвеня 1917 г., кіраўнік спраў нарады Б.А. Булгакаў вымушаны быў прызнаць, што ліквідацыйная камісія па справах былога Гродзенскага камітэта сустрэла шэраг значных перашкод. З самага пачатку разгляду справы камітэта і да моманту даклада А.Б. Булгакава прыкметна змянілася агульнае палітычнае становішча ў краіне – адбылася Лютаўская рэвалюцыя, пасля якой нарада з органа царскага ўрада ператварылася ў орган Часовага ўрада, а давесці справу да лагічнага канца і прыцягнуць злачынцаў да адказнасці не ўяўлялася магчымым.

Каб зрушыць справу з месца, на пасадзе кіраўніка ліквідацыйнай камісіі былога Гродзенскага губернатара замяніў член савета міністра ўнутраных спраў В.А. Смірноў, які адразу пасля прызначэння пачаў інтэнсіўна працаваць. Аднак, калі 30 мая 1917 г. ліквідацыйная камісія з'явілася для прыняцця спраў у памяшканне былога Гродзенскага абывацельскага камітэта, дакументы ўжо былі пераведзены ў Гродзенскі аддзел Тацціянінскага камітэта. У сувязі з гэтым зрабілі заўвагу, і пры наступным наведванні ўсе дакументы былі на месцы, але не ўпарадкаваны [121, спр. 4, арк. 245].

Расследаванне працягвалася яшчэ некалькі месяцаў. В.А. Смірноў у сваім выніковым дакладзе нарадзе бездапаможна прызнаў, што ліквідацыйная камісія пад яго кіраўніцтвам не здольна выканаць пастаўленыя перад ёй мэты з-за аказанага супрацьдзеяння [121, спр. 4, арк. 248]. На адным з апошніх пасяджэнняў Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў, якое адбылося ў пачатку верасня 1917 г., справа была завершана наступнай рэзалюцыяй: маёмасць былога Гродзенскага камітэта перадавалася дзяржаве і з-за бездапаможнасці перад карупцыяй і бюракратызмам справаздача за выкарыстаныя сумы, якую прадставіла кіраўніцтва камітэта, прызнавалася здавальняючай [121, спр. 4, арк. 256].

У Беларусі дзейнічаў шэраг дабрачынных арганізацый, якія аказвалі дапамогу бежанцам па нацыянальных прыметах. Акрамя беларусаў, рускіх і ўкраінцаў тут у якасці бежанцаў аказалася значная частка палякаў і яўрэяў, а таксама літоўцы, латышы, эстонцы, немцы і іншыя [14].

Згодна з данымі Тацціянінскага камітэта (табл. 4) [121, спр. 10, арк. 119] самай вялікай этнічнай групай бежанцаў у Мінскай, Віленскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях былі палякі. Беларусаў-католікаў рэгістравалі як палякаў. Іх налічвалася 106 198 чалавек, што складала каля 37 % ад агульнай колькасці зарэгістраваных бежанцаў у чатырох губернях.



***Нацыянальны састаў бежанцаў у канцы** 1916 – **пачатку** 1917 г.*

| Губерні | Мужчыны | Жанчыны | Усяго | Сярод іх: праваслаўныя беларускі групы – мужчыны | жанчыны | усяго | % | каталікі-беларусы і палякі – мужчыны | жанчыны | усяго | % |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленская | [illegible] | [illegible] | [illegible] | 5014 | 5540 | [illegible] | [illegible] | 638 | 717 | 1355 | [illegible] |
| Віцебская | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | 5592 | 9810 | [illegible] | 4337 | [illegible] | 10171 | 18,76 |
| Мінская | 55169 | 71327 | 126496 | 19077 | 26921 | 45998 | 36,36 | 26534 | 31525 | 58059 | 45,90 |
| Магілёўская | 41706 | 49957 | 91663 | 15890 | 19026 | 34916 | 38,10 | 16854 | 19759 | 36613 | 39,95 |
| Усяго | [illegible] | [illegible] | 285442 | [illegible] | [illegible] | 101587 | [illegible] | [illegible] | [illegible] | 106198 | [illegible] |

Найбольшая колькасць католікаў-беларусаў і палякаў была ў Мінскай (58 059 бежанцаў) і Магілёўскай (36 613) губернях. Наступную па колькасці групу бежанцаў складалі рускія, праваслаўныя беларусы і ўкраінцы (іх усіх запісвалі рускімі) – 101 587 чалавек, што складала каля 36 % ад агульнай колькасці зарэгістраваных. Найбольшая колькасць іх таксама была ў Мінскай (45 998) і Магілёўскай (34 916) губернях. Яўрэяў-бежанцаў у чатырох указаных губернях было 48 895, што складала каля 17 % ад агульнай колькасці. Астатнія бежанцы, сярод якіх літоўцаў – 7598, латышоў – 1859, немцаў, эстонцаў і іншых – 19 305 чалавек, складалі каля 10 % ад агульнай колькасці зарэгістраваных бежанцаў.

Першымі з нацыянальных арганізацый з'явіліся яўрэйскія камітэты. Калі яўрэям беларускіх гарадоў і мястэчак стала вядома аб высяленні іх аднаверцаў з Польшчы і Прыбалтыкі, яны пачалі звяртацца да губернскіх і павятовых улад, каб ім дазволілі арганізаваць камітэты дапамогі бежанцам. Матывамі такой дзейнасці былі старажытныя яўрэйскія традыцыі (гемілуд хасадзім – аказанне літасці), якія абавязвалі яўрэяў аказваць сваім аднаверцам матэрыяльную і маральную падтрымку [134, с. 43].

Губернатары, атрымаўшы просьбы аб адкрыцці камітэтаў дапамогі, спачатку звярталіся да паліцэйскіх улад з мэтай высвятліць дабранадзейнасць яўрэяў. Калі мясцовыя цывільныя ўлады атрымлівалі станоўчы адказ аб дабранадзейнасці іх, апошнім дазвалялася арганізоўваць камітэты. Як вынікае са службовай перапіскі, прадвадзіцелі дваранства часта выступалі супраць дазволу яўрэям аб'ядноўвацца ў арганізацыі і камітэты, бо лічылі, што гэта можа быць прыкрыццём антыўрадавай дзейнасці. Пазіцыя Мінскага губернатара была наступнай – ён пагаджаўся з недаверлівым стаўленнем да дзейнасці яўрэяў, аднак указваў, што з'яўленне значнай колькасці бежанцаў патрабуе аказання ім дапамогі з боку любых арганізацый.

*Табліца 4*

(***апрацаваны даныя аб** 3 113 372 **бежанцах***)

| [illegible] | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| [illegible] | | | | [illegible] | | | | | [illegible] | | | [illegible] | | | |
| [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] |
| 62 | 68 | 130 | 0,99 | 7 | 8 | 15 | 0,11 | 318 | 300 | 618 | 172 | 46 | 55 | 101 | 0,77 |
| 135 | 191 | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] |
| [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] |
| 1728 | 2060 | 3788 | [illegible] | 589 | 936 | 1525 | 1,66 | 3965 | 7327 | 13092 | 1450 | 676 | 839 | 1505 | 1,61 |
| [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] | [illegible] |

У Мінску дзейнічалі таварыствы дапамогі бедным яўрэям і Яўрэйскі камітэт. У стварэнні гэтых установ прынялі ўдзел яўрэйскія грамадскія дзеячы на чале з рабінам горада Л. Рабіновічам. Ім актыўна садзейнічалі сіяністцкія арганізацыі. Непасрэдная арганізацыя апекавання беженцаў была ўскладзена на М. Рудзенскага, які займаўся забеспячэннем іх працай, харчаваннем і начлегам. Для размяшчэння яўрэяў-беженцаў выкарыстоўваліся сінагогі і малітвеныя дамы [134, с. 46–47]. Восенню 1915 г. старасты малітвеных дамоў паведамлялі, што апошнія перапоўнены бежанцамі [89, спр. 96, арк. 40, 294, 583].

Згодна з рэестрам мясцовых бежанскіх арганізацый Магілёўскай губерні ў кожным павеце дзейнічаў яўрэйскі камітэт, у некаторых – два. Сярод іх – аддзяленні Яўрэйскага таварыства дапамогі ахвярам вайны (Магілёўскі, Аршанскі, Рагачоўскі паветы), аддзяленні Таварыства дапамогі бедным яўрэям (Быхаўскі, Гомельскі, Горацкі і Клімавіцкі паветы), аддзяленні Яўрэйскага камітэта дапамогі беженцам (Мсціслаўскі і Чавускі паветы) [94, спр. 2111, арк. 39–43].

У Віцебскай губерні Яўрэйскае таварыства дапамогі ахвярам вайны пачало працаваць з вясны 1915 г. Згодна з уставам таварыства, зацверджанага ў красавіку 1915 г., мэтай дзейнасці названай арганізацыі была дапамога яўрэям-беженцам і ўсім пацярпеўшым ад вайны. Для ажыццяўлення гэтага таварыства магло адкрываць лазарэты, выдаваць грашовую дапамогу, шукаць працу для беженцаў. Асноўныя сродкі таварыства складаліся з членскіх узносаў, ахвяраванняў і збораў [99, спр. 38, арк. 11].

Шырокі рэзананс у друку атрымалі ўзаемаадносіны паміж яўрэйскай арганізацыяй і Віцебскім аддзяленнем Таццянінскага камітэта. Нагадаем, што апошні мог размяркоўваць сродкі нацыянальным установам. Адносна яўрэйскага таварыства прадстаўнікі Таццянінскага камітэта заявілі: «Мы іх не ведаем, яны нас не ведаюць». Маўляў, яўрэі ўжо сабралі ў сваім асяроддзі 52 тыс. р. і дапамога ім не патрэбна. Такое стаўленне Віцебскага аддзялення Таццянінскага камітэта было раскрытыкавана іншымі дабрачыннымі ўстановамі, перш за ўсё УСГ [48, № 17, с. 64–69].



У Віленскай губерні дзейнічаў Камітэт яўрэйскага таварыства. Гэта ўстанова даглядала больш за 25 тыс. яўрэяў-беженцаў, пераважна з Сувалкаўскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў [120, спр. 112, арк. 8–9].

Прымусовае высяленне яўрэяў з месцаў пастаяннага жыхарства, якое ператварыліся ў сапраўдную катастрофу, нечакана адкрыла для іх новыя магчымасці, звязаныя з парушэннем рысы аседласці. 19 жніўня 1915 г. было афіцыйна абвешчана згодна з рашэннем Савета Міністраў ад 4 жніўня аб дазволе яўрэям пражываць у гарадскіх паселішчах па-за межамі іх аседласці [41, с. 103]. Утварылася парадаксальная сітуацыя, калі меры, якія ўлада задумала як рэпрэсіўныя, у канчатковым выніку пашырылі свабоду яўрэйскага насельніцтва і дазволілі ім рассяліцца па ўсёй імперыі.

Пытанне аб аказанні дапамогі польскаму насельніцтву паўстала ў першыя месяцы вайны. Першапачаткова ўрад вырашыў аказваць дапамогу толькі некаторым катэгорыям насельніцтва Царства Польскага, якія адрозніваліся высокім маёмасным і сацыяльным статусам. У зацверджаным 28 лютага 1915 г. палажэнні Савета Міністраў аб аказанні пазыковай дапамогі пацярпеўшаму ад ваенных дзеянняў насельніцтву губерняў Царства Польскага і прылягаючых мясцовасцей указвалася, што пазыкі могуць выдавацца толькі землеўладальнікам, арандатарам маёнткаў у сельскіх мясцовасцях, уладальнікам гарадской нерухомай маёмасці, гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў і рамесных устаноў (усе павінны быць рускімі падданымі) [41, с. 24–31]. Выдача пазык суправаджалася складанай і працяглай па часе працэдурай. З некаторымі змяненнямі палажэнні ад 28 лютага 1915 г. былі распаўсюджаны на насельніцтва Ковенскай, Гродзенскай і Сувалкаўскай губерній.

Для польскіх камітэтаў па аказанні дапамогі беженцам асноўнай праблемай было пераадоленне перашкод у арганізацыі жыцця беженцаў-палякаў, якія чыніла ім расійскае заканадаўства. Напрыклад, каб вырашыць пытанне аб адкрыцці пачатковых школ для дзяцей беженцаў-палякаў, мінскі губернатар звяртаўся па інструкцыі да міністра народнай асветы. Апошні дазваляў адкрываць такія школы, аднак пры ўмове выканання ўсіх фармальных патрабаванняў [88, спр. 8960, арк. 63, 125].

Шмат мясцовых польскіх камітэтаў дзейнічалі ў Магілёўскай губерні. Гэта Польскае таварыства дапамогі ахвярам вайны (Магілёў, Гомельскі, Аршанскі і Рагачоўскі паветы), Рымска-каталіцкае дабрачыннае таварыства (Магілёў), аддзяленні Цэнтральнага абывацельскага камітэта губерняў Царства Польскага (Рагачоўскі і Чэрыкаўскі паветы) [94, спр. 2111, арк. 39–43]. У Мінскай

губерні дапамогу бежанцам-палякам аказвалі Цэнтральны абывацельскі камітэт губерняў Царства Польскага і Польскі камітэт [88, спр. 9038, арк. 74]. У Віленскай губерні працаваў камітэт Польскага таварыства. Ён апекаваў бежанцаў, выдаючы аднаразовыя дапамогі, адзенне, утрымліваючы танныя сталовыя, ствараючы прадуктовыя склады [120, спр. 112, арк. 5–9]. Ёсць звесткі аб дзейнасці ў Віцебскай губерні Таварыства па аказанні дапамогі насельніцтву, якое пацярпела ад вайны ў Польшчы [48, № 17, с. 64].

Цэнтрам, вакол якога групаваліся шматлікія літоўскія ўстановы, стала Цэнтральнае літоўскае таварыства для аказання дапамогі пацярпеўшым ад вайны, ці Літоўскі камітэт. Гэта таварыства ўзнікла ў першыя месяцы вайны. На тэрыторыі рассялення бежанцаў-літоўцаў было арганізавана больш за 50 мясцовых арганізацый [38, № 2, с. 9]. Аддзяленні Літоўскага камітэта дзейнічалі ў Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай (у Мінску), Магілёўскай (у Магілёве, Аршанскім і Сенненскім паветах) і Віленскай губернях. У апошнім выпадку Віленскае аддзяленне Літоўскага камітэта апекавала больш за 34 тыс. бежанцаў [120, спр. 112, арк. 8–9].

Усерасійскае таварыства апекі бежанцаў было створана з мэтай аказання дапамогі пераважна рускаму насельніцтву. Пад ім разумеліся, як узгадвалася вышэй, праваслаўныя ўкраінцы і беларусы. Статут таварыства быў прыняты 15 верасня 1915 г., яго старшынёй стаў член Дзяржаўнага Савета А.А. Рымскі-Корсакаў [19, № 1, с. 1]. Таварыства з моманту заснавання актыўна адкрывала мясцовыя аддзяленні, у чым атрымала поўную падтрымку з боку мясцовых цывільных улад. Ужо восенню 1915 г. у Расійскай імперыі былі заснаваны 32 мясцовыя аддзелы, з іх тры – у Беларусі. Гомельскі аддзел узначальваў протаіерэй А.Я. Зыкаў, магілёўскі – архіепіскап Канстанцін, мінскі – віцэ-губернатар М.А. Афанасьеў [19, № 1, с. 8].

Згодна са статутам таварыства ажыццяўляла наступныя віды дзейнасці: стварэнне танных і бясплатных сталовых, будаўніцтва баракаў ці размяшчэнне бежанцаў у арандаваных памяшканнях, арганізацыя біржаў працы, запрашэнне праваслаўнага святарства для задавальнення духоўных патрэбнасцей бежанцаў, уладкаванне прытулкаў, аказанне юрыдычнай дапамогі [20, № 5, с. 3]. Дзякуючы актыўнай падтрымцы дзяржаўнай улады ўжо ў пачатку 1916 г. у Расійскай імперыі налічваліся 52 аддзяленні таварыства. У Беларусі акрамя ўказаных вышэй яшчэ былі створаны Вілейскае, Полацкае і Барысаўскае павятовыя аддзяленні [20, № 28–29, с. 4–9]. У склад аддзелаў уваходзіла дваранства, святарства, земскія дзеячы і інтэлігенцыя. Усерасійскае таварыства апекі бежанцаў актыўна прапагандавала абарону самаўладдзя, праваслаўя і супрацьпастаўляла сябе іншым нацыянальным арганізацыям.



З аналагічных пазіцый падыходзіла да справы апекі бежанцаў Заходнерускае таварыства. У канцы верасня 1915 г. пры ім быў створаны цэнтральны камітэт для аказання дапамогі рускім бежанцам [19, № 1, с. 9].

Беларускае таварыства па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны было заснавана вясной 1915 г. у Вільні. Як адзначалася ў спецыяльным звароце, які на трох мовах (беларускай, рускай і польскай) распаўсюдзіла Беларускае таварыства, мэтамі яго дзейнасці былі, па-першае, апекаванне, харчаванне, прадастаўленне прытулкаў і аказанне медыцынскай дапамогі выселенаму насельніцтву і, па-другое, садзейнічанне ў аднаўленні жыцця ў мясцовасцях, якія пацярпелі ад вайны [120, спр. 113, арк. 9].

Праца таварыства была пабудавана на дэмакратычных прынцыпах, аб чым сярод іншага сведчыць і змест статута аб парадку дзейнасці гэтай арганізацыі. Згодна з § 1 статута Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны гэтая арганізацыя імкнулася аказваць дапамогу бежанцам наступным шляхамі:

а) ствараючы харчовыя пункты, інтэрнаты і сталовыя ўцекачам і выдаючы цёплае адзенне і паліва;

б) усталёўваючы гэтыя ж пункты і сталовыя ў мясцовасцях, пацярпеўшых ад вайны;

в) аказваючы медыцынскую дапамогу хворым і параненым;

г) выдаючы аднаразовыя субсідыі на прадукты і для абмену;

д) падтрымліваючы асобныя гаспадаркі, дзеля чаго Таварыства пасылала сваіх упаўнаважаных асоб і агентаў для агляду мясцовасцей, што пацярпелі ад вайны, з мэтай высвятлення страт і набыцця для мэт таварыства маёмасці [141, с. 1–3].

Таварыства (§ 2) знаходзілася ў Вільні, а раёны дзейнасці ахоплівалі этнічныя межы рассялення беларусаў: Віленскую, Гродзенскую, Віцебскую, Мінскую і Магілёўскую губерні.

У § 3 і 4 удакладняўся састаў таварыства. Яго членамі маглі быць асобы абаіх полаў, рознай нацыянальнасці і веры, спачуваючыя мэтам таварыства і меўшыя права па законе ад 4 сакавіка 1906 г. устанаўліваць і ўступаць у таварыствы, якія створаны парадкам дзеяння гэтага закона («Временные правила об обществах и союзах» – гэта прававы акт, які вызначаў афіцыйнае паняцце таварыства, саюза ці прафесійнага таварыства, усталёўваў парадак іх стварэння; вызначаў патрабаванні да ўстаноўчых дакументаў, асаблівасці дзейнасці ў залежнасці ад удзелу ў цывільна-прававых адносінах).

Таварыства складалася з ганаровых і сапраўдных членаў. Апошнія павінны былі ўносіць у касу таварыства, пад квітанцыі скарбніка, адразу 3 р. Тыя, хто ўнёс 100 р., або ўзяў на сябе абавязацельства ўносіць штомесячна па 15 р. на працягу існавання таварыства, лічацца ганаровымі членамі. Уступленне ў

члены таварыства і выбыццё з яго (§ 5) павінна было адбывацца па заявах, пададзеных у камітэт таварыства, ад якога залежалі прыём і выключэнне членаў таварыства. Пры гэтым удакладнялася, што камітэт можа прымаць у члены арганізацыі асоб, якія могуць быць карыснымі сваёй працай і без грашовага ахвяравання. Камітэт таксама мог прызначаць для стасункаў з цэнтральнымі ўстановамі і ўладамі сваіх упаўнаважаных асоб і па-за межамі тэрыторыі сваёй дзейнасці.

Згодна з вызначэннем § 6 статута, сродкі таварыства павінны былі складацца:

1) з узносаў ганаровых і сапраўдных членаў;

2) ахвяраванняў;

3) узносаў на квітковых кніжках і падпісных лістах, што распаўсюджваюцца толькі паміж членаў таварыства;

4) даходаў з канцэртаў, лекцый, чытанняў, навуковых гутарак, спектакляў і г. д., якія праводзяцца з адпаведнага дазволу;

5) са сродкаў ад правядзення аднадзённых скарбоначных і іншых збораў з дазволу мясцовых улад.

Кіравалі ўсімі справамі і распараджаліся сродкамі (§ 7) агульны сход і камітэт таварыства, які знаходзіўся ў Вільні і павінен быў складацца з не менш чым 9 і не больш за 27 членаў, якія са свайго асяроддзя выбіралі большасцю галасоў старшыню, двух намеснікаў яго, двух пісараў і скарбніка. Акрамя членаў камітэта выбіралі трох кандыдатаў на той жа тэрмін, якія замянілі б выбыўшых па розных прычынах членаў камітэта. Камітэт таварыства (§ 8) павінен быў выбірацца на ўвесь час існавання таварыства, на месца выбыўшых па якіх-небудзь прычынах членаў камітэта агульны сход у выпадку неабходнасці мог выбіраць новых.

Згодна з § 9 у кампетэнцыю камітэта таварыства як кіруючага органа ўваходзіла:

1) распараджэнне капіталамі;

2) правядзенне з адпаведнага дазволу збору ахвяраванняў;

3) прыём ахвяраванняў;

4) складанне справаздач;

5) скліканне агульных сходаў;

6) правядзенне ўзгаданых у § 6 канцэртаў, лекцый, чытанняў, навуковых гутарак, спектакляў і г. д., аднадзённых скарбоначных збораў;

7) уладкаванне харчовых і медыцынскіх пунктаў, адкрыццё сталовых і інтэрнатаў;

8) выбар упаўнаважаных асоб для кіравання мясцовымі арганізацыямі таварыства, а таксама ўрачоў і асабовага складу да іх, вызначэнне заробку гэтым катэгорыям;

9) наогул кіраванне ўсімі справамі таварыства па гэтым статуце.



Агульныя сходы ў сваю чаргу павінны былі збірацца камітэтам (§ 10) па яго пастанове або пры неабходнасці і па пісьмовай заяве аб гэтым не менш чым $^{1}/_{5}$ часткі ўсіх членаў таварыства. На агульным сходзе старшынёй выбіралася кожны раз іншая асоба з ліку членаў таварыства. У статуте адзначалася, што на першым агульным сходзе павінны былі прысутнічаць фундатары і асобы, імі запрошаныя. На сходзе выбіраўся першапачатковы састаў камітэта таварыства і рэвізійная камісія. Пра час і месца агульнага сходу (§ 11) камітэт павінен паведамляць асобнымі павесткамі членам таварыства, якія пакінулі камітэту свае адрасы. Агульны сход меркавалася склікаць не менш чым адзін раз у год. У § 12 удакладнялася, што калі на агульны сход не збярэцца пэўная частка ўсіх членаў, якія жывуць у Вільні, неабходная для таго, каб той мог лічыцца правамоцным, назначаецца праз тыдзень другі сход, які будзе прызнаны правамоцным незалежна ад колькасці прысутных членаў таварыства.

За праверку касы, капіталаў, маёмасці і дакументаў таварыства адказвала рэвізійная камісія, якая выбіралася спосабам, узгаданым у § 10, 13, і паведамляла агульнаму сходу аб выніках сваёй рэвізіі.

У кожнай мясцовасці, дзе пастаянна пражывала не менш чым пяць членаў таварыства (§ 19), з дазволу камітэта можна было ствараць мясцовыя яго аддзелы. У арганізацыі і рабоце аддзелы павінны былі кіравацца статутам таварыства і інструкцыяй камітэта. Аб адкрыцці кожнага аддзела камітэт таварыства паведамляў віленскаму губернатару. Адзначалася, што мясцовыя аддзелы не маюць права набываць нерухомасць, а ўсе сродкі, якія паступаюць у касу аддзела, лічацца ўласнасцю таварыства. Пры арганізацыі мерапрыемстваў, літаратурных вечароў, мастацкіх і тэатральных выставак, аднадзённых скарбоначных збораў і г. д. аддзелы павінны кіравацца ўсімі існуючымі на гэты конт законамі і пастановамі. Калі ж мясцовы аддзел захоча набыць статус юрыдычнай асобы, то ён павінен са згоды камітэта зарэгістраваць асобны статут аддзела па законе ад 4 сакавіка 1906 г. Кожны мясцовы аддзел таварыства мог для дасягнення сваіх мэт (§ 20) выбіраць са сваіх членаў мясцовы камітэт, у які павінна ўваходзіць не менш чым тры чалавекі.

У § 21 сцвярджалася, што таварыства згортвае сваю дзейнасць пасля заканчэння вайны і калі няма патрэбы ў яго аддзяленнях. Момант ліквідацыі ўстанаўліваецца Агульным сходам. Калі пасля ліквідацыі таварыства застануцца грашовыя сродкі і інвентар, то пасля выплаты даўгоў яны павінны дзяліцца агульным сходам і выдавацца як аднаразовая дапамога пацярпеўшым ад вайны, а калі такіх не будзе, – перадавацца іншым дабрачынным арганізацыям [141, с. 4–15].

Кола асоб, падпісаўшых статут, паказвае, наколькі разнастайным быў сацыяльны састаў стваральнікаў і ўдзельнікаў гэтай арганізацыі. Так, сярод іх былі: інжынер-тэхнолаг Вацлаў Іваноўскі, надворны саветнік Павел Радкевіч, студэнт Петраградскага ўніверсітэта Павел Аляксюк, селянін Ігнацій Біндзюк, мешчанін Вацлаў Ластоўскі, загадчык рахункаводчых курсаў Мікалай Мохаў [141, с. 15–16.].

Старшынёй таварыства стаў В.Л. Іваноўскі, яго намеснікамі – А.І. Луцкевіч і В.Ю. Ластоўскі.

Упаўнаважаныя Беларускага таварыства знаёміліся са становішчам бежанцаў, перыядычна абследуючы пацярпеўшыя мясцовасці. Упаўнаважаны П.П. Аляксюк азнаёміўся з палажэннем бежанцаў у Гродзенскай губерні, В.Ю. Ластоўскі абследаваў Віленскую і Віцебскую губерні. У час камандзіроўкі ён адзначыў, што з пачаткам вайны сталі прыбываць сем'і чыноўнікаў і заможных людзей, таму павялічыўся кошт жылля і ежы. З нарастаннем хвалі бежанцаў, сярод якіх былі вялікія групы яўрэяў, літоўцаў і латышоў, узнікла неабходнасць павелічэння магчымых сродкаў дапамогі [120, спр. 113, арк. 4–5].

На працягу лета 1915 г. Беларускае таварыства стварыла шэраг мясцовых камітэтаў – два ў Гродзенскай губерні, тры ў Віленскай, а таксама аддзелы ў Полацку і Мінску.

У выніку паспяховага наступлення нямецкай арміі ў 1915 г. значная частка Заходняй Беларусі аказалася акупіраванай. Таму Беларускае таварыства раскалолася на два цэнтры – Віленскі, які дзейнічаў ва ўмовах нямецкай акупацыі, і Мінскі аддзел, што працягваў працаваць на не акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Ва ўмовах акупацыі дзейнасці сфера Віленскага аддзела была вельмі абмежаванай. Фактычна адзіны накірунак, які не сустракаў прамога супраціўлення акупацыйных улад, – развіццё адукацыі. На працягу 1917–1918 гг. супрацоўнікі Віленскага аддзела адкрылі некалькі дзесяткаў беларускіх пачатковых школ, распрацоўваўся праект нацыянальнай настаўніцкай семінарыі [16, спр. 124, арк. 3–25; спр. 247, арк.11].

Мінскі аддзел Беларускага таварыства аб'ядноўваў каля 50 вядомых пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў. Сярод іх: Ядвігін Ш. (А.І. Лявіцкі), У. Галубок (У.І. Голуб), А. Зязюля (А.С. Астрамовіч). Старшынёй аддзела быў адвакат В.І. Чавусаў [126, с. 141–147]. У канцы верасня 1915 г. аддзел адкрыў першыя тры бясплатныя прытулкі, праз некаторы час – яшчэ тры. У іх знаходзілася прыкладна 150–200 чалавек. Адначасова пачалі працаваць дзве бясплатныя сталовыя і адна платная пад назвай «Беларуская хатка».

З-за недахопу фінансавых сродкаў вясной 1916 г. бясплатныя сталовыя былі закрыты, засталася толькі платная. Усяго да гэтага часу сталовыя выдалі 16 тыс. бясплатных і 10 тыс. платных



абедаў. Мінскі аддзел Беларускага таварыства таксама праводзіў культурныя і асветніцкія мерапрыемствы для бежанцаў, імкнуўся дапамагчы ім у пошуках працы. Ёсць звесткі аб актыўнай дапамозе Максіма Багдановіча Мінскаму аддзелу Беларускага таварыства. Менавіта агляду дзейнасці аддзела прысвечана апошняя прыжыццёвая публікацыя паэта ў беларускім друку [10].

Адзначым, што члены таварыства не толькі займаліся непасрэдна дабрачыннай дзейнасцю, але вельмі цікавіліся праблемамі дзяржаўнага, нацыянальнага і культурнага развіцця Беларусі. Шмат якія ўдзельнікі Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны прынялі ўдзел у стварэнні беларускай дзяржаўнасці ў найноўшы час.

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. карэнным чынам змяніла палітычнае становішча Расійскай імперыі. Аднак цяжкае эканамічнае становішча ў краіне толькі пагоршылася [11; 17; 23; 46; 84; 85; 102; 136]. У гэтых умовах, калі дзейнасці грамадскіх і дабрачынных арганізацый не перашкаджала дзяржаўная ўлада і ў той жа час актуальным заставалася пытанне дапамогі пацярпеўшым ад вайны, былыя супрацоўнікі ААБЕЖа пры ЗемГоры ўзнавілі дзейнасць сваёй арганізацыі. Па ініцыятыве ААБЕЖа 7–10 красавіка 1917 г. у Маскве адбыўся з'езд дзеячаў грамадскіх і нацыянальных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам. На ім, акрамя ўстановы-арганізатара, прынялі ўдзел прадстаўнікі цэнтральнага і некаторых мясцовых аддзяленняў Таццянінскага камітэта, цэнтральных камітэтаў польскай, латышскай, літоўскай, яўрэйскай і мусульманскай нацыянальных арганізацый, франтавых камітэтаў Земскага і Гарадскога саюзаў і іншых аналагічных устаноў. Былі прыняты пастановы па пытаннях дапамогі бежанцам, у якіх удзельнікі з'езда вызначалі свой погляд на развіццё гэтай справы ў новых умовах [50, № 43–44, с. 191–193].

Агульныя палажэнні пастаноў з'езда 7–10 красавіка пачыналіся з тэзіса, што бежанскія арганізацыі павінны быць пабудаваны на дэмакратычных пачатках, заклікаючы саміх бежанцаў прымаць удзел у дабрачыннай дзейнасці. У сувязі з гэтым з'езд выказаўся за ліквідацыю ўсіх арганізацый дапамогі бежанцам, якія «маюць яўна антыграмадскі характар і створаны былой уладай з палітычнымі мэтамі». Як вынік былой барацьбы і супрацьстаяння саюзаў і Таццянінскага камітэта менавіта апошні быў прызнаны антыграмадскай установай, дзеянне якой неабходна тэрмінова спыніць. У агульных палажэннях зноў змяшчаўся тэзіс, што «дапамога бежанцам з'яўляецца абавязкам дзяржавы» [50, № 43–44, с. 183].

Асобныя пункты пастановы былі прысвечаны нацыянальным арганізацыям (яны абвяшчаліся аўтаномнымі ў сваёй дзейнасці), цэнтральнаму органу (ім заставалася Асобая нарада па ўладка-

ванні бежанцаў), а таксама мясцовым установам [50, № 43–44, с. 184–186]. Адносна памеру грашовай дапамогі было прынята рашэнне аб неабходнасці яго тэрміновага павелічэння, прычым не толькі на харчаванне, але і на медыцынскае абслугоўванне, адукацыю і г. д. Шмат увагі з'езд удзяліў апецы і клопату пра дзяцей-бежанцаў [50, № 43–44, с. 184–186].

Большасць палажэнняў, распрацаваных з'ездам, які адбыўся 7–10 красавіка, так і не рэалізавалася. Таццянінскі камітэт не ліквідавалі, а рэфармавалі. Часовы ўрад выказаўся за яго захаванне і выдзеліў сродкі на ўтрыманне. Царская дачка Таццяна Мікалаеўна была пазбаўлена ў ім ганаровага кіраўніцтва. Арганізацыю перайменавалі ва Усерасійскі камітэт дапамогі пацярпеўшым ад вайны, а старшынёй яго застаўся А.Б. Нейдгард. Дзейнасць мясцовых аддзяленняў Таццянінскага камітэта была прывязана да губернскіх і гарадскіх нарад. Значна скарацілася фінансаванне камітэта, закрылі некаторыя мясцовыя аддзяленні, што прывяло да зніжэння эфектыўнасці працы. Канчаткова Таццянінскі камітэт быў ліквідаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У 1917 г. апекаванне бежанцаў амаль цалкам ажыццяўлялі мясцовыя земскія, гарадскія і нацыянальныя арганізацыі. Назіраўся таксама працэс «саветызацыі» і «дэмакратызацыі» бежанскай справы, калі саміх бежанцаў заклікалі арганізоўваць камітэты дапамогі [21; 27].

Згодна з данымі «Вестника комитета Западного фронта ВЗС» у 1917 г. дапамогу бежанцам на Заходнім фронце аказвалі ўстановы «Поўначдапамогі», якія былі перададзены УЗС; мінскі губернскі камітэт УЗС; Цэнтральны абывацельскі камітэт губерняў Царства Польскага; мінскае аддзяленне Польскага таварыства ахвярам вайны; санітарна-харчовы аддзел Польскага таварыства; Польскі санітарны аддзел дапамогі ахвярам вайны; Літоўскі камітэт; Яўрэйскае таварыства аховы здароўя сельскага беднага насельніцтва; Рускае таварыства дапамогі яўрэям; Яўрэйскае таварыства дапамогі ахвярам вайны; УСГ; Таццянінскі камітэт; мінскае аддзяленне Усерасійскага таварыства дапамогі ахвярам вайны; Беларускае таварыства [91, спр. 121, арк. 184].

У Мінскай губерні ў 1917 г. пра бежанцаў клапаціўся ў асноўным губернскі камітэт УЗС. Менавіта пад яго кіраўніцтвам сканцэнтраваліся бежанскія ўстановы, перададзеныя ў канцы 1916 г. камітэтам Заходняга фронту УЗС. У 1917 г. працягвалася скарачэнне грашовых пазык на аказанне дапамогі бежанцам, што значна ўскладняла гэту справу. Міністэрства харчавання паведаміла галоўнаму камітэту УЗС, што з-за харчовага крызісу не можа адпускаць прадукты яго мясцовым установам. У маі 1917 г. у Стаўцы вырашылі, што прыфрантавыя ўстановы УЗС будуць атрымліваць харчаванне ад інтэнданцтва, а ў тыле харчовыя ўправы павінны забяспечваць бежанцаў нароўні з мясцовым насельніцтвам [91, спр. 255, арк. 18].



Летам – восенню 1917 г. установы «Поўначдапамогі» перадалі мінскаму губернскаму камітэту УЗС. Усяго пад апеку апошняй установы перайшлі 21 242 бежанцы, якія атрымлівалі паёк. З іх 14 002 пражывалі ў вёсках і атрымлівалі па 1 р. 20 к. у месяц, а 7240 – у горадзе, атрымліваючы па 2 р. у месяц. Перададзеныя ад «Поўначдапамогі» харчовыя пункты знаходзіліся ў 22 гарадах і мястэчках [92, спр. 4, арк. 2–3]. У жніўні 1917 г. новы загадчык бежанскага аддзела Н.І. Папоў пасля знаёмства з пастаноўкай справы дапамогі бежанцам у Мінскім губернскім камітэце УЗС у першай палове 1917 г. накіраваў старшыні апошняга пісьмо са шматлікімі крытычнымі заўвагамі. Н.І. Папоў «быў уражаны хваравітай нярвовасцю бежанцаў, выкліканай маральнымі ўзрушэннямі… слязамі на тварах, калі гаворка ішла пра іх родныя краі, іх жабрацтвам і тымі немагчымымі ўмовамі, у якіх яны існуюць». Бежанцы, пра якіх павінен быў клапаціцца губернскі камітэт, пакутавалі ад нястачы, былі раздзетыя і разутыя. Быў адзначаны такі факт – бежанцы, якіх апякала «Поўначдапамога», былі супраць пераходу пад апеку Мінскага губернскага камітэта з-за абыякавага стаўлення шэрагу дзеячаў апошняга да іх праблем. Больш таго, загадчыку матэрыяльна-нарыхтоўчага аддзела Мінскага губернскага камітэта пры пайку ў 20 к. і росце цэн удалося зэканоміць на харчаванні бежанцаў некалькі дзесяткаў тысяч рублёў [91, спр. 260, арк. 15–16].

У такіх умовах бежанцы самі імкнуліся забяспечваць свае патрэбы. Летам 1917 г. у Мінску адбыўся з'езд сялянскіх дэпутатаў, у рамках якога працавала бежанская секцыя. Апошняя пастанавіла, што бежанцы, як і мясцовае насельніцтва, павінны ўдзельнічаць у выбарах ва ўсе ствараемыя на месцах камітэты. Для абароны выключна сваіх інтарэсаў у некаторых выпадках (напрыклад, у населеных пунктах з вялікай колькасцю бежанцаў) прадстаўнікі гэтага сацыяльнага слоя маюць права выбіраць мясцовыя бежанскія камітэты. Для аб'яднання іх працы ў раёнах ствараюцца мясцовыя камітэты. Пры губернскім савеце сялянскіх дэпутатаў быў арганізаваны (на правах камісіі) бежанскі выканаўчы камітэт [91, спр. 228, арк. 60]. Яго старшынёй стаў С. Ушкевіч.

Згодна з палажэннем аб мясцовых бежанскіх камітэтах яны ствараліся асобна ад валасных камітэтаў (устаноў УЗС) з мэтай абароны выключна бежанскіх інтарэсаў. Бежанцы самі выбіралі склад камітэта (тры – пяць чалавек), без адрознення саслоўя і нацыянальнасцей. Выбары былі двухступеньчатыя (спачатку – выбаршчыкаў) тэрмінам на тры месяцы. Для мясцовых бежанскіх камітэтаў былі вызначаны наступныя абавязкі: ліквідацыя злоўжыванняў пры атрыманні пайкоў, адзення і грошай; вырашэнне

пытанняў унутранага быту бежанцаў; назіранне за парадкам сярод іх; урэгуляванне адносін з мясцовым насельніцтвам [91, спр. 227, арк. 26–28].

Сродкі на забеспячэнне патрэб бежанцаў мясцовыя камітэты атрымлівалі ад бежанскага выканаўчага камітэта. Апошні ў сваю чаргу ад губернскага камітэта УЗС ці Упраўлення дапамогі насельніцтву. Бежанскія камітэты былі створаны ў Барысаве, Бабруйску, Беразіно, Ігумені, Калінкавічах, Караміцэвічах, Капцэвічах, Лахве, Муляроўцы, Мікашэвічах, Астрашыцкім Гарадку, Пухавічах, Рэчыцы, Смілавічах, Смалявічах. З пратаколаў пасяджэнняў мясцовых бежанскіх камітэтаў вынікае, што харчовая праблема была найбольш вострай [91, спр. 235, арк. 23, 52].

У верасні 1917 г. бежанскі аддзел губернскага камітэта УЗС паведаміў у Асобую нараду па ўладкаванні бежанцаў, што агульная колькасць тых, хто карыстаецца пайком, складае 46 122 чалавекі, з якіх: 12 171 – працаздольныя мужчыны і жанчыны, 6378 – старыя, 17 573 – дзеці да 14 гадоў [91, спр. 260, арк. 22]. З гэтага месяца з-за адсутнасці сродкаў скарачалася выдача грашовага і прадуктовага пайка. Згодна з данымі на 1 кастрычніка губернскі камітэт з 75 462 зарэгістраваных апякаў 40 121, колькасць працаздольных складала каля 53 % ад агульнага ліку дагледаемых бежанцаў (табл. 5 і 6) [91, спр. 248, арк. 98].

*Табліца 5*

***Колькасць бежанцаў, зарэгістраваных мінскім губернскім камітэтам УЗС на 1 кастрычніка 1917 г.***

| Раённы камітэт | Колькасць зарэгістраваных бежанцаў | Працаздольныя бежанцы | |
|---|---|---|---|
| | | лічбы | % |
| Мінскі | 8366 | 1962 | 23,45 |
| Барысаўскі | 3295 | 1920 | 58,27 |
| Бабруйскі | 29658 | 11870 | 40,02 |
| Ігуменскі | 5219 | 3745 | 71,76 |
| Рэчыцкі | 12270 | 9128 | 74,39 |
| Мазырскі | 9224 | 6257 | 67,83 |
| Пінскі | 7420 | 5239 | 70,61 |
| Усяго | 75462 | 40121 | 53,17 |

Звяртае на сябе ўвагу значнае павелічэнне ў афіцыйных звестках колькасці працаздольных бежанцаў. Гэта тлумачыцца тым, што пад уплывам эканамічнага крызісу адбывалася скарачэнне колькасці людзей, якіх рэгістравалі як бежанцаў і аказвалі дапамогу. Таму адбылося павелічэнне ўдзельнай вагі працаздольных, якія захоўвалі статус бежанца, да агульнай колькасці зарэгістраваных бежанцаў, колькасць якіх памяншалася.



*Табліца 6*

***Састаў бежанцаў пад апекай мінскага губернскага камітэта УЗС***

| Раённы камітэт | Усяго | Бежанцы | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | пражывалі ў горадзе | пражывалі ў вёсцы | з'ўляліся дарослымі | з'ўляліся дзецьмі |
| Мінскі | 1962 | 951 | 1011 | 1715 | 247 |
| Барысаўскі | 1920 | 1540 | 380 | 1628 | 292 |
| Бабруйскі | 11870 | 4308 | 7562 | 8314 | 3556 |
| Ігуменскі | 3745 | 1064 | 2681 | 3094 | 651 |
| Рэчыцкі | 9128 | 5826 | 3302 | 7316 | 1812 |
| Мазырскі | 6257 | – | 6257 | 5086 | 1171 |
| Пінскі | 5239 | – | 5239 | 4195 | 1044 |
| Усяго | 40121 | 13689 | 26432 | 31348 | 8773 |

З-за цяжкага эканамічнага становішча ў кастрычніку 1917 г. галоўны камітэт УЗС аддаў распараджэнне губернскім камітэтам правесці рашучае скарачэнне ўстаноў, перш за ўсё бежанскіх. Адначасова была спынена выдача харчавання бежанцам. Апошнія павінны былі атрымліваць прадукты ў крамах харчовых упраў, як і мясцовае насельніцтва [91, спр. 242, арк. 53].

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўсе крыніцы фінансавання для бежанскіх устаноў былі перакрыты. Бежанцы ўвогуле перасталі атрымліваць дапамогу [91, спр. 242, арк. 95]. У снежні 1917 г. становішча бежанцаў апісвалася як жахлівае і жудаснае; яны галадалі, былі раздзетыя і разутыя [92, спр. 4, арк. 2].

Згодна з афіцыйнымі данымі, колькасць бежанцаў у канцы 1917 г. на тэрыторыі, падпарадкаванай камандаванню Заходняга фронту, складала 157 786 чалавек, паводле звестак мясцовых бежанскіх камітэтаў – да 200 тыс. чалавек [92, спр. 4, арк. 29].

Падсумоўваючы сказанае, можна зрабіць наступныя высновы. Актыўны ўдзел у аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі прымалі самыя розныя недзяржаўныя арганізацыі, якія былі пабудаваны як на грамадскіх і дабрачынных пачатках, так і па нацыянальных, рэлігійных і тэрытарыяльных прыметах. Праведзенае даследаванне дае падставу вызначыць, што галоўную ролю сярод іх адыгрывалі УЗС, УСГ і Таццянінскі камітэт. Гэтыя ўстановы былі створаны з рознымі мэтамі і займалі супрацьлеглыя пазіцыі ў дачыненні да палітыкі ўрада, аб чым сведчыць той факт, што адносіны паміж саюзамі і Таццянінскім камітэтам характарызаваліся жорсткай канкурэнцыяй і барацьбой за сферы ўплыву ў грамадстве.

Дзеячы мясцовых земскіх і гарадскіх самакіраванняў аб'ядналіся ва УЗС і УСГ з мэтай удзельнічаць у вырашэнні агульнадзяржаўных праблем, у тым ліку і бежанства. Мясцовыя камітэты саюзаў дзейнічалі на ўсёй тэрыторыі Беларусі і ў сваёй працы імкнуліся не толькі задаволіць асноўныя патрэбы бежанцаў, але і дапамагчы ім ізноў стаць паўнацэннымі членамі грамадства.

Саюзы крытычна ацэньвалі дзеянні ўрада як па агульных палітычных пытаннях, так і канкрэтна па вядзенні справы бежанцаў. Таму дабрачынная дзейнасць УЗС і УСГ, нягледзячы на яе карысць, была абмежавана дзяржаўнай уладай. Адсюль можна зрабіць выснову, што палітычная барацьба ў Расійскай імперыі непасрэдна ўплывала на дзейнасць па аказанні дапамогі бежанцам, прычым самым адмоўным чынам.

Таццянінскі камітэт уяўляў сабой дабрачынную арганізацыю, у якой прадстаўнікі цывільнай адміністрацыі і царквы на грамадскіх пачатках удзельнічалі ў аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны, у тым ліку і бежанцам. Гэта ўстанова мела асаблівы статус, паколькі самой сваёй назвай сімвалізавала клопат царскай сям'і пра пацярпеўшых ад вайны. Статус Таццянінскага камітэта вызначаўся таксама тым, што гэта ўстанова атрымлівала грашовыя сродкі непасрэдна ад цывільных і ваенных улад. Яе кіраўнікі самастойна вырашалі, якім іншым дабрачынным арганізацыям гэтыя сродкі размеркаваць. Пры падтрымцы ўлады мясцовыя аддзяленні Таццянінскага камітэта былі створаны і дзейнічалі на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

У складаных умовах дзейнічалі нацыянальныя і рэлігійныя арганізацыі, паколькі адна з прычын іх стварэння – адмоўнае стаўленне афіцыйных улад да нярускага і неправаслаўнага насельніцтва. Сярод нацыянальных і рэлігійных арганізацый самымі распаўсюджанымі былі яўрэйскія (іудзейскія) і польскія (каталіцкія) дабрачынныя камітэты.

Сярод нацыянальных арганізацый у Беларусі спачатку ўзніклі яўрэйскія і польскія дабрачынныя таварыствы. На тэрыторыі Беларусі дзейнічалі таксама мясцовыя аддзяленні літоўскіх і латышскіх арганізацый. Актыўнасць нацыянальных арганізацый падштурхнула ўлады садзейнічаць стварэнню ўстаноў, якія зыходзілі з прынцыпаў аказання дапамогі бежанцам толькі рускай нацыянальнасці і праваслаўнага веравызнання. Гэта супрацьпастаўленне стварала падставы для барацьбы і канкурэнцыі паміж арганізацыямі.

Беларускія дабрачынныя ўстановы імкнуліся аказваць дапамогу і бежанцам, і ўсяму пацярпеўшаму ад вайны насельніцтву. У некаторых губернях, дзе не было ўведзена мясцовае самакіраванне, для аказання дапамогі бежанцам спецыяльна ствараліся абывацельскія камітэты. Улады фінансавалі іх дзейнасць, але не маглі кантраляваць правільнае выкарыстанне казённых сродкаў. Гэта пацвярджаюць злоўжыванні, выяўленыя пры разглядзе дзейнасці Гродзенскага абывацельскага камітэта.

Аналіз дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам сведчыць, што менавіта дабрачынныя арганізацыі, пабудаваныя па нацыянальных, рэлігійных і тэрытарыяльных прыметах, разам з мясцовымі камітэтамі УЗС і УСГ непасрэдна клапаціліся пра бежанцаў. Мясцовая адміністрацыя і часткова Таццянінскі камітэт у сваю чаргу кантралявалі і фінансавалі гэту дзейнасць. Увогуле праблема фінансавання захоўвала актуальнасць на працягу ўсяго разглядаемага перыяду. Пазітыўная адзнака дзейнасці розных грамадскіх арганізацый, а гэта значыць і выдзяленне ім фінансавых сродкаў, залежалі ў асноўным не столькі ад якасці дапамогі і колькасці дагдядаемых бежанцаў, колькі ад адносін да іх дзейнасці з боку ваенных і цывільных улад, якія нярэдка насілі суб'ектыўны характар.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Змест манаграфіі – даследаванне дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам, якую ажыццяўлялі дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі ў Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Зроблены наступныя вывады.

Разгляд дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам з боку дзяржаўных і грамадскіх арганізацый быў пачаты прадстаўнікамі апошніх пры аналізе вынікаў сваёй працы. Рэвалюцыйныя падзеі прыпынілі вывучэнне гэтай праблемы. Савецкая гістарыяграфія закранала пэўныя аспекты бежанства ў шэрагу прац, прысвечаных сацыяльна-эканамічнай гісторыі перыяду Першай сусветнай вайны. Савецкія гісторыкі звярнулі ўвагу на цяжкае становішча бежанцаў, што перш за ўсё тлумачылася абыякавымі адносінамі дзяржаўнай улады да лёсу мірнага насельніцтва. Савецкая гістарыяграфія доўгі час замоўчвала існаванне дзяржаўнай апекі пра бежанцаў. Пры гэтым былі разгледжаны дзеянні органаў дзяржаўнай улады па выкарыстанні працы бежанцаў у сельскай гаспадарцы і прамысловасці. Толькі ў сярэдзіне 80-х гг. з'явілася манаграфія, у якой узгадвалася пра клопат аб бежанцах з боку дзяржаўных устаноў і дабрачынных арганізацый. Беларускія гісторыкі ў савецкі час таксама амаль не разглядалі гісторыю бежанства. У рэдкіх выпадках пры даследаванні жыцця і дзейнасці знакамітых беларусаў таго перыяду са станоўчых пазіцый ацэньвалася дзейнасць па аказанні дапамогі бежанцам. Сучасная расійская і беларуская гістарыяграфія разглядаюць бежанства як неад'емны элемент сацыяльнай гісторыі перыяду Першай сусветнай вайны. А расійская інтэнсіўна даследуе працэс узнікнення бежанства, характэрныя асаблівасці гэтай з'явы, а таксама праблемы рээвакуацыі. Сучасная беларуская гістарыяграфія разглядае бежанства як сацыяльную катастрофу беларускага грамадства.

У перыяд Першай сусветнай вайны мірнае насельніцтва Беларусі было фактычна перападначалена армейскаму камандаванню, якое атрымала надзвычайныя паўнамоцтвы на франтавых і прыфрантавых тэрыторыях. Эвакуацыйныя дзеянні, якія ваеннае кіраўніцтва праводзіла ў адносінах да мірных жыхароў, тлумачыліся ім як неабходныя для дасягнення перамогі. Таму цывільныя ўлады павінны былі садзейнічаць армейскаму камандаванню ў правядзенні масавага перасялення людзей, нягледзячы на велізарныя расходы і шматлікія праблемы, выкліканыя гэтым. Ваенныя і цывільныя ўлады ў пачатку вайны і асабліва ў той час, калі



баявыя дзеянні былі перанесены на тэрыторыю Расійскай імперыі, інтэнсіўна праводзілі эвакуацыю груп насельніцтва, жыццё і служба якіх лічыліся найбольш карыснымі для дзяржавы. Такімі грамадзянамі прызнавалі чыноўнікаў, дзяржаўных служачых, іх сем'і, праваслаўных святароў. За дзяржаўны кошт гэту катэгорыю бежанцаў эвакуіравалі на бяспечныя тэрыторыі, дзе яны павінны былі працягваць выкананне сваіх абавязкаў. У Беларусі эвакуацыя чыноўніцтва і праваслаўнага святарства праводзілася перш за ўсё ў Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губернях, і ў меншай ступені – у Мінскай і Магілёўскай. Выключная ўвага да бяспекі гэтых падданых з боку дзяржавы пацвярждаецца тымі акалічнасцямі, што толькі чыноўнікаў, служачых, іх сем'і і праваслаўных святароў эвакуіравалі па папярэдне распрацаваных палажэннях. Высяленне астатніх катэгорый грамадзян адбывалася на падставе загадаў і распараджэнняў, якія былі выдадзены непасрэдна ў час правядзення эвакуацыйных мерапрыемстваў. З самага пачатку вайны праводзіліся дэпартацыі прадстаўнікоў «нядобранадзейных», з пункту гледжання ўлад, народаў. Здольнымі да супрацоўніцтва з праціўнікам і здрады ўрад перш за ўсё лічыў немцаў, а таксама яўрэяў, галічан і палякаў. Таму прадстаўнікоў гэтых народаў прымусова высялялі і накіроўвалі ў аддаленыя тэрыторыі Расійскай імперыі. Значная колькасць іх рухалася цераз Беларусь транзітам, пэўная частка яўрэяў і палякаў засталася тут на часовае жыхарства. Летам і восенню 1915 г. ва ўмовах адступлення рускай арміі праводзілася масавае прымусовае высяленне жыхароў з заходніх губерняў, у тым ліку і з Беларусі. Армейскае камандаванне кіравалася імкненнем спыніць нямецкае наступленне любой цаной, таму пайшло на такую надзвычайную меру, як стварэнне паласы спусташэння на ўласнай тэрыторыі. Гэта прадугледжвала высяленне мужчынскага насельніцтва ваеннаабавязанага ўзросту і вываз ці знішчэнне прадуктаў харчавання і ўсялякай маёмасці. Улады афіцыйна тлумачылі прымусовае высяленне насельніцтва клопатам аб яго бяспецы, аднак іх сапраўднымі матывамі было недапушчэнне магчымасці працы і службы насельніцтва заходніх губерняў на карысць праціўніка. Эвакуацыйныя дзеянні выпрацоўваліся і праводзіліся ў тэрміновым парадку, што не дазваляла папярэдне падмацаваць іх неабходнай колькасцю фінансавых сродкаў. Ніжэйшыя армейскія чыны падзялялі недавер свайго кіраўніцтва да мясцовага насельніцтва, што прыводзіла да злоўжыванняў у адносінах да мірных жыхароў. Іх ахоплівалі панічныя настроі, паколькі насельніцтва не было дастаткова праінфармавана аб прычынах і сутнасці эвакуацыі. У выніку колькасць бежанцаў павялічылася да пагражальных памераў. Асобную катэгорыю бежанцаў складалі мірныя жыхары Беларусі, якія пад уплывам ваеннага становішча і дзеянняў армейскага

камандавання па ўласнай ініцыятыве накіроўваліся ў глыб імперыі, каб выратавацца ад жахаў вайны.

Утварэнне мільённай масы бежанцаў летам 1915 г. прымусіла органы дзяржаўнай улады звярнуць самую пільную ўвагу на аказанне дапамогі гэтай катэгорыі пацярпеўшых ад вайны. Акрамя аб'ектыўных умоў ваеннага часу, паспяховай арганізацыі азначанай дзейнасці перашкаджалі недахоп фінансавых сродкаў і адсутнасць адзінага кіравання справай. Таму ўрад павінен быў распрацаваць і замацаваць у заканадаўчым парадку прынцыпы дзяржаўнай палітыкі для аказання дапамогі бежанцам. У якасці галоўнага кіруючага органа выступіла МУС, якое распрацавала закон «Аб забеспячэнні патрэб бежанцаў», зацверджаны 30 жніўня 1915 г. У законе бежанцамі былі прызнаны фактычна ўсе катэгорыі насельніцтва, якія прымусова ці добраахвотна высяляліся ў глыб імперыі, за выключэннем падданых ваюючых з Расіяй дзяржаў і палітычна нядобранадзейных грамадзян. Важнейшым рашэннем дзяржавы для актывізацыі дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам было вызначэнне ў законе фінансавання гэтай справы сродкамі з казны. Гэта дало магчымасць удзельнічаць у справе забеспячэння патрэб бежанцаў не толькі ўстановам дзяржаўнай улады, але і шматлікім недзяржаўным арганізацыям, якія да выдання закона ад 30 жніўня не здольны былі аказваць бежанцам дастатковую дапамогу з-за абмежаванасці сваіх фінансавых сродкаў. У аснову прыцягнення арганізацый да ўдзелу ў аказанні дапамогі бежанцам закон паклаў перш за ўсё прынцып карыснасці для справы, прычым без уліку іх лаяльнасці да ўрада. Гэта тлумачыцца тым, што ўрад быў гатовы мабілізаваць для вырашэння бежанскай праблемы ўсе грамадскія сілы, паколькі сама дзяржава перш за ўсё засяроджвала ўвагу на вядзенні вайны. Лібералізм закона ад 30 жніўня праявіўся і ў тым, што, нягледзячы на разлікі МУС падпарадкаваць мясцовы клопат толькі губернскай адміністрацыі, атрымалі магчымасць актыўна ўдзельнічаць у гэтай справе і органы земскага і гарадскога самакіравання. Пры гэтым дзейнасць усіх арганізацый была падначалена МУС, якое кіравала бежанскай справай праз Асобую нараду па ўладкаванні бежанцаў. Апошняя каардынавала дзейнасць розных арганізацый і займалася размеркаваннем грашовых сродкаў. Пад уплывам палітычнай барацьбы дзейнасць арганізацый, якія крытычна ставіліся да ўрада, пачала прыкметна абмяжоўвацца, нягледзячы на карыснасць іх дабрачыннай дзейнасці. МУС здолела падначаліць мясцовую апеку бежанцаў толькі губернскай і павятовай адміністрацыі шляхам даручэння апошняй размяркоўваць фінансавыя сродкі і кантраляваць іх выкарыстанне. Гэта было замацавана ў «Кіруючых правілах па ўладкаванні бежанцаў», якія распрацавала Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў.



Важнай прычынай, з-за якой дзяржава імкнулася поўнасцю кантраляваць дзейнасць па аказанні дапамогі бежанцам на ўсіх узроўнях, былі разлікі ўрада выкарыстаць гэту дапамогу ў якасці стымулу для прыцягвання бежанцаў да працы. Гэтыя разлікі не спраўдзіліся таму, што памеры дапамогі з боку дзяржавы былі недастатковымі для аднаўлення працаздольнасці бежанцаў, а таксама з-за невялікай колькасці працаздольных бежанцаў.

Органы дзяржаўнай улады да лета 1915 г. непасрэдна не ўдзельнічалі ў аказанні дапамогі бежанцам, а толькі кантралявалі ці часткова фінансавалі дзейнасць дабрачынных устаноў у гэтай справе. Цывільная адміністрацыя была мабілізавана на забеспячэнне патрэб бежанцаў у час масавага руху апошніх летам – восенню 1915 г. З боку органаў дзяржаўнай улады аказаннем дапамогі бежанцам займаліся губернскія, гарадскія і павятовыя ўлады, а таксама спецыяльна створаны інстытут Галоўнаўпаўнаважаных па ўладкаванні бежанцаў на франтах. Беларусь знаходзілася ў сферы паўнамоцтваў Галоўнаўпаўнаважанага па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронту С.І. Зубчанінава. Апошні кіраваў сеткай дзяржаўных устаноў, якая атрымала агульную назву «Поўначдапамога». Гэта арганізацыя дзейнічала на ўсёй не акупіраванай тэрыторыі Беларусі са жніўня 1915 г. па восень 1916 г. У канцы лета і восенню 1915 г. «Поўначдапамога» забяспечвала патрэбы бежанцаў у час іх высялення і руху ў глыб імперыі. Пазней арганізацыя С.І. Зубчанінава займалася ўладкаваннем быту і працы бежанцаў на месцы часовага жыхарства. З-за мабілізацыі ўсіх сродкаў дзяржавы на вядзенне вайны «Поўначдапамога» здольная была забяспечыць толькі асноўныя патрэбы бежанцаў і кампенсаваць ім малую частку панесеных страт. Перад мясцовымі цывільнымі ўладамі стаяла задача скаардынаваць і накіраваць дзейнасць розных арганізацый, якія аказвалі дапамогу бежанцам. Для гэтага губернскія і павятовыя арганізацыі склікалі асобыя нарады, на якіх адсочвалася агульнае становішча бежанцаў і размяркоўваліся крэдыты на іх утрыманне. Мясцовая адміністрацыя не здолела паспяхова скаардынаваць дзейнасць розных арганізацый, аб чым сведчыць невысокая эфектыўнасць дапамогі, якую аказвалі бежанцам. Сярод прычын гэтага – складаныя ўмовы ваеннага перыяду і недастатковая ўвага да справы аказання дапамогі бежанцам з боку губернскіх, гарадскіх і павятовых улад.

Грамадскія арганізацыі праявілі павышаную цікавасць да ўдзелу ў аказанні дапамогі бежанцам. Гэта тлумачыцца як дабрачыннымі матывамі, так і імкненнем падобных арганізацый шляхам удзелу ў вырашэнні праблемы агульнадзяржаўнага маштабу замацаваць свой статус у грамадстве. Актыўную дзейнасць па аказанні дапамогі бежанцам разгарнулі УЗС і УСГ. Дзеячы

саюзаў успрымалі праблему бежанцаў як трагедыю людзей, якіх вайна пазбавіла сацыяльнага і маёмаснага статуса. Таму УЗС і УСГ імкнуліся не толькі падтрымаць жыццядзейнасць бежанцаў, але і дапамагчы ім аднавіцца ў якасці паўнавартасных членаў грамадства. У перыяд праўлення царскага ўрада гэта мэта не магла быць дасягнута, паколькі дзейнасць саюзаў як апазіцыйных ураду арганізацый была абмежавана. Таццянінскі камітэт быў створаны з мэтай аказання дапамогі насельніцтву, якое пацярпела ад вайны, і павінен быў сімвалізаваць дабрачыннасць царскай сям'і. Асобы статус Таццянінскага камітэта вызначаўся тым, што мясцовыя аддзяленні гэтай установы непасрэдна атрымлівалі казённыя сродкі, якія потым размяркоўваліся іншым дабрачынным арганізацыям. Пры актыўнай падтрымцы ўлад мясцовыя аддзяленні Таццянінскага камітэта былі адкрыты на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Адносіны паміж саюзамі і Таццянінскім камітэтам вызначаліся жорсткай канкурэнцыяй і барацьбой за сферы ўплыву, напрыклад, за права весці рэгістрацыю і ўлік бежанцаў.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі дзейнасць УЗС і УСГ ужо не падвяргалася палітычным і ідэалагічным перашкодам, аднак эканамічны крызіс не дазволіў саюзам актывізаваць дапамогу бежанцам. Таццянінскі камітэт змяніў назву і быў падначалены адпаведным дзяржаўным установам.

Сярод дабрачынных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам асобную групу складалі ўстановы, пабудаваныя па нацыянальных, рэлігійных і тэрытарыяльных прыметах. Шэраг іх узнік яшчэ ў пачатку вайны, паколькі афіцыйныя ўлады адмоўна ставіліся да неправаслаўнага і нярускага насельніцтва. Таму прадстаўнікі апошніх вымушаны былі аб'ядноўвацца ў арганізацыі, якія аказвалі дапамогу толькі пэўнай нацыянальнай ці рэлігійнай прыналежнасці. У Беларусі першымі сярод нацыянальных арганізацый узніклі яўрэйскія і польскія дабрачынныя камітэты. На тэрыторыі Беларусі дзейнічалі таксама мясцовыя аддзяленні літоўскіх і латышскіх устаноў. Актыўная дзейнасць нацыянальных арганізацый прымусіла ўлады садзейнічаць стварэнню ўстаноў, якія кіраваліся прынцыпамі аказання дапамогі бежанцам толькі рускай нацыянальнасці і праваслаўнага веравызнання. Такое супрацьпастаўленне стварала ўмовы для канкурэнцыі і барацьбы паміж гэтымі арганізацыямі. Беларускія дабрачынныя ўстановы ставілі мэтай сваёй дзейнасці аказанне дапамогі не толькі бежанцам, але і астатнім катэгорыям пацярпеўшага ад вайны насельніцтва. Для аказання дапамогі бежанцам некаторых губерняў, у якіх не было ўведзена мясцовае самакіраванне, спецыяльна ствараліся абывацельскія камітэты, якія даглядалі бежанцаў толькі гэтых тэрыторый. Улады фінансавалі іх дзейнасць, але не здольныя былі паспяхова кантраляваць правільнае выкарыстанне казённых сродкаў. Гэта пацвярджаюць злоўжыванні, выяўленыя ў працы Гродзенскага абывацельскага камітэта.

Такім чынам, з улікам аб'ектыўных прычын ваеннага часу дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам можна ацаніць станоўчым чынам. У складаных умовах бежанцам, якія страцілі свой сацыяльны статус, былі пазбаўлены сродкаў да жыцця і знаходзіліся ў стане цяжкага псіхалагічнага крызісу, была аказана абмежаваная, але дастатковая для падтрымання фізічнай жыццядзейнасці дапамога. Аднак мінімальныя памеры дапамогі не маглі садзейнічаць поўнаму аднаўленню бежанцаў як паўнавартасных членаў грамадства. Сярод прычын гэтага – не толькі ўмовы ваеннага перыяду, але і адносіны дзяржаўнай улады да бежанства як да другараднай праблемы.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ І КРЫНІЦ

1. Аврех А.Я. Царизм накануне свержения /АН СССР, Ин-т истории СССР ; отв. ред. А.М. Анфимов. М. : Наука, 1989. 251 с.

2. Анфимов А.М. Российская деревня в годы первой мировой войны (1914 – февраль 1917). М. : Соцэкгиз, 1962. 383 с.

3. Асташов А.Б. Союзы земств и городов и помощь раненым в первую мировую войну // Отечеств. история. 1992. № 6. С. 169–173.

4. Бабков А.М. Беженцы в Белоруссии в годы первой мировой войны (1915–1916) // Гіст. навука і гіст. адукацыя ў Рэсп. Беларусь. Новыя канцэпцыі і падыходы : Усебел. канф. гісторыкаў, Мінск, 3–5 лют. 1993 г. : у 2 ч. Мінск : Унів., 1994. Ч. 2 : Гісторыя Беларусі. С. 131–138.

5. Бабков А.М. Беженцы Беларуси в России в 1916 году: регистрация и правовое положение // Гістарычнаму факультэту – 20 гадоў : зб. навук. прац гіст. фак. ГДУ імя Францыска Скарыны / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь і інш. Гомель : ГДУ, 2009. С. 133–141.

6. Бабков А.М. Беженцы на Витебщине в годы первой мировой войны // Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность) : материалы Междунар. науч.-теорет. конф., 6–8 дек. 2001 г. Витебск, 2001. С. 349–352.

7. Бабкоў А.М. Бежанцы на Гомельшчыне ў гады першай сусветнай вайны (1915–1916) // Гомельшчына: старонкі мінулага. Нарысы. Гомель, 1996. С. 78–83. Вып. 2.

8. Бабков А.М. Помощь беженцам Первой мировой войны эвакуационными органами Полоцкого уезда в 1919—1920 гг. // Изв. Гом. гос. ун-та им. Ф. Скорины. 2009. № 6. С. 4–8.

9. Бабков А.М. Реэвакуация Гомельским базисным эвакопунктом беженцев Первой мировой войны в 1922 г. // Изв. Гом. гос. ун-та им. Ф. Скорины. 2009. № 4. Ч. 1. С. 153–157.

10. Багдановіч М. Агляд працы за першы год Мінскага Аддзела Беларускага Таварыства для помачы пацярпеўшым ад вайны // Полымя. 1981. № 12. С. 190–191.

11. Базанов С.Н., Рудая Е.Н. Россия и окончание первой мировой войны // Отечеств. история. 1999. № 4. С. 200–202.

12. Белорусское общество в Петрограде по оказанию помощи пострадавшим от войны. 1916–1918 гг. : межархив. справ. / сост. Н.Е. Калесник [и др.] ; предисл. В.В. Скалабана ; науч. ред. С.В. Жумарь ; редкол. В.И. Адамушко [и др.]. Минск : НАНБ, 2008. 90 с.

13. Барсукова С.Ю. Проблемы беженцев и вынужденных переселенцев в зеркале идеологий (Социологический анализ: Россия) // Полис: полит. исслед. 1999. № 5. С. 31–42.

14. Бартеле Т., Шалда В. Латышские беженцы в России в годы гражданской войны // Отечеств. история. 2000. № 1. С. 18–31.

15. Бежанства 1915 года : зб. / рэд. В. Луба. Беласток, 2000. 416 с.

16. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Мінск. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 2, 124, 125, 130, 132, 247. Калекцыя дак. аддз. рукап.



Бел. музея імя І. Луцкевіча. Справы Бел. т-ва па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны.

17. Близнец Г.И. Первая мировая война. Февральская революция в России : материалы лекций для преподавателей, студентов всех специальностей // Бел. ин-т инженеров ж.-д. трансп. Гомель, 1992. 50 с.

18. Вержховский Д.В. Первая мировая война 1914–18 // СИЭ. М. : БСЭ, 1967. Т. 10. С. 970–1005.

19. Вестник Всероссийского общества попечения о беженцах. Пг., 1915. № 1.

20. Вестник Всероссийского общества попечения о беженцах. Пг., 1916. № 2–44.

21. Вестник Всероссийского общества попечения о беженцах. Пг., 1917. № 45–52.

22. Волков Е.З. Динамика народонаселения СССР за восемьдесят лет. М.; Л., 1930. 272 с.

23. Воронкова С.В. Февральская буржуазно-демократическая революция в России. М. : Изд-во Моск. у-та, 1961. 38 с.

24. Всероссийский земский союз. Изв. главного ком. М., 1914. № 1–5.

25. Всероссийский земский союз. Изв. главного ком. М., 1915. № 6–29.

26. Всероссийский земский союз. Изв. главного ком. М., 1916. № 30–53.

27. Всероссийский земский союз. Изв. главного ком. М., 1917. № 54–55.

28. Гетрелл П. Беженцы в России в годы первой мировой войны // Ист. зап. М. : Наука, 2001. № 4(222). С. 46–72.

29. Гетрелл П. Беженцы и проблема пола в России во время первой мировой войны // Россия и первая мировая война : материалы Междунар. науч. коллоквиума. СПб. : Дмитрий Буланин, 1999. С. 112–128.

30. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / гал. рэдкал.: І.М. Ігнаценка [і інш.]. Мінск : Навука і тэхніка, 1972. Т. 2 : Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917) / рэдкал. : К.І. Шабуня [і інш.]. 1972. 687 с.

31. Грыневіч В. На рэках Вавілона (успаміны ўцекача) // Спадчына. 1997. № 4. С. 165–181.

32. Гусятников П.С. Назревание революционного кризиса в России в начале XX века. М. : Соцэкгиз, 1959. 184 с.

33. Данилов Ю.Н. На пути к крушению. М. : Изд. дом «XXI в. – Согласие», 2000. 400 с.

34. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917) : в 3 т. / под ред. В.Н. Перцева [и др.]. Минск : Изд-во АН БССР, 1953. Т. 3. 1019 с.

35. Дякин В.С. Русская буржуазия и царизм в годы первой мировой войны. Л. : Наука, 1967. 362 с.

36. Ерошкин Н.П. История государственных учреждений дореволюционной России. 3-е изд., перераб. и доп. М. : Высш. шк., 1983. 352с.

37. Ерошкин Н.П. Самодержавие накануне краха. М. : Просвещение, 1975. 160 с.

38. Жизнь беженцев. Еженедельный иллюстрированный журнал. Пг., 1916. № 1–10.

39. Жилин А.П. Изучение истории первой мировой войны в СССР // К 75-летию начала первой мировой войны : материалы науч. конф. М., 1990. С. 4–6.

40. Зайцева О. Беженцы и мировое сообщество: история и современность // Бел. журн. междунар. права и междунар. отношений. 1998. № 5. С. 102–104.

41. Законы и распоряжения о беженцах. 2-е изд. М., 1916. Вып. 1. 106 с.
42. Законы и распоряжения о беженцах (по 1 апр. 1916 г.). М., 1916. Вып. 2. 126 с.
43. Залесский К.И. Первая мировая война. Библиогр. энцикл. слов. М. : Вече, 2000. 576 с.
44. Записки бъженца. Пг., 1916. 32 с.
45. Зубчанинов С. Организация и условия работы по устройству беженцев Северо-Западного фронта. Пг., 1915. 20 с.
46. Зуев М.Н. История России : учеб. для вузов. М. : Приор, 1998. 687 с.
47. Изв. Всерос. союза городов. М., 1914. № 1–4.
48. Изв. Всерос. союза городов. М., 1915. № 5–22.
49. Изв. Всерос. союза городов. М., 1916. № 23–39.
50. Изв. Всерос. союза городов. М., 1917. № 40–51.
51. Изв. Ком. Ее Императ. Высочества Великой Княжны Татьяны Николаевны. Пг., 1916. № 1–14.
52. Изв. Ком. Ее Императ. Высочества Великой Княжны Татьяны Николаевны. Пг., 1917. № 15–18.
53. Иоффе Г.З. Выселение евреев из прифронтовой полосы в 1915 г. // Вопр. истории. 2001. № 9. С. 85–97.
54. История первой мировой войны. 1914–1918 : в 2 т. / под ред. И.И. Ростунова. М. : Наука, 1975. Т. 1–2.
55. Карнялюк В.Р. Маргінальнасць бежанцаў-беларусаў першай сусветнай вайны як фактар росту іх нацыянальнай самасвядомасці // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : материалы Междунар. науч. конф. / под ред. проф. У.Д. Розенфельда. Гродно, 2000. С. 312–321.
56. Карнялюк В.Р. Праблема гісторыка-дэмаграфічнай характарыстыкі бежанцаў з беларускіх зямель (1914–1918) // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы. Сер. І. 2000. № 2. С. 20–26.
57. Карнялюк В.Р. Фактары гісторыка-дэмаграфічных змен у складзе насельніцтва Беларусі ў 1913–1918 гг. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Бел. дзярж. ун-т. Мінск, 2001. 20 с.
58. Квачук Е. Бежанства 1915 года на Палессі // Загароддзе – 2 : матэрыялы навук.-краязнаўчай канф. «Палессе – скрыжаванне культур і часу», Пінск, 25–27 верас. 1999 г. / уклад. і агул. рэд. Ф.Д. Клімчука, В.А. Лабачэўскай. Мінск : Тэхналогія, 2000. С. 166–167.
59. Китанина Т.М. Война, хлеб и революция (Продовольственный вопрос в России, 1914 – октябрь 1917 г.). Л. : Наука, 1985. 384 с.
60. Краткий отчет о деятельности Минского Губернского Комитета ВЗС за 1916 г. Минск, 1917. 10 с.
61. Кризис самодержавия в России. 1895–1917. Л. : Наука, 1984. 664 с.
62. Круталевич В.А. Рождение Белорусской советской республики. Минск : Наука и техника, 1975. 335 с.
63. Кудринский Ф.А. Людские волны (Беженцы): очерк // Неман. 1997. № 6. С. 79–193.
64. Курцев А.Н. Беженство // Россия и первая мировая война : материалы Междунар. науч. коллоквиума. СПб. : Дмитрий Буланин, 1999.
65. Курцев А.Н. Беженцы первой мировой войны в России (1914–1917) // Вопр. истории. 1999. № 8.
66. Лапановіч С.Ф. Бежанства ў Беларусі ў перыяд Першай сусветнай вайны ў матэрыялах архіваў Мінска, Масквы і Санкт-Пецярбурга // Арх. чытанні І–ІІІ : матэрыялы навук. канф. «Падзеі першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі ў дакументах беларускіх архіваў». Мінск, 2006. С. 147–150.



67. Лапановіч С.Ф. Аказанне дапамогі бежанцам у Беларусі ў перыяд кіравання Часовага ўрада (сакавік – кастрычнік 1917 г.) // Вес. БДПУ ім. М. Танка. 2008. № 3. С. 17–20.
68. Лапановіч С.Ф. Да пытання аб гістарыяграфіі праблемы бежанства на Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны // Сучас. праблемы гістарыяграфіі гісторыі : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 28 кастр. 2003 г. Мінск, 2003. С. 276–283.
69. Лапановіч С.Ф. Дзейнасць Таццянінскага камітэта па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады першай сусветнай вайны // Вес. БДПУ ім. М. Танка. 2004. № 2. С. 26–29.
70. Лапановіч С.Ф. Дзейнасць урадавай установы «Поўначдапамога» па забеспячэнні патрэб бежанцаў у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1915–1917 гг.) // Новая и новейшая история Европы и США: проблемы, поиски, исследования / науч. ред. Г.А. Космач. Минск : БГПУ, 2006. С. 43–51.
71. Лапановіч С.Ф. Першая сусветная вайна і бежанства як агульнадзяржаўная праблема // Бел. гіст. часоп. 2005. № 10. С. 5–12.
72. Лапановіч С.Ф. Роля цэнтральнага і мясцовага апарата Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі ў вырашэнні праблемы бежанства ў Беларусі ў гады першай сусветнай вайны // Весн. Акад. МУС Рэсп. Беларусь. 2004. № 2. С. 47–51.
73. Лапановіч С.Ф. Удзел паліцыі Расійскай імперыі ў вырашэнні праблемы бежанства ў заходніх губернях пад час Першай сусветнай вайны (1914–1916 гг.) // Милиции Беларуси 90 лет: история и современность : материалы науч.-практ. конф., Минск, 27 февр. 2007 г. Минск, 2007. С. 94–100.
74. Лапановіч С.Ф. Удзел Усерасійскіх земскага і гарадскога саюзаў у аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады першай сусветнай вайны // Бел. гіст. часоп. 2007. № 6. С. 9–17.
75. Лапановіч С.Ф. Узаемаадносіны дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый у справе аказання дапамогі бежанцам у Расійскай імперыі ў гады першай сусветнай вайны (1914–1916 гг.) // Весн. Акад. МУС Рэсп. Беларусь. 2008. № 1. С. 21–26.
76. Лемке М. 250 дней в царской ставке. Пг., 1920. 860 с.
77. Липинский Л.П. Крестьянское движение в Белоруссии в 1914–1917 гг. Минск : Из-во БГУ, 1975. 184 с.
78. Лубны-Герцык Л.И. Движение населения на территории СССР за время мировой войны и революции. М., 1926. 124 с.
79. Маевский И.В. Экономика русской промышленности в условиях первой мировой войны. М. : Госполитиздат, 1957. 391 с.
80. Мікалаевіч А. Бежанцы // Бел. мінуўшчына. 1994. № 3. С. 60–61.
81. Мікалаевіч А. Бежанцы першай сусветнай вайны // Спадчына. 1994. № 3. С. 17–21.
82. Минц И.И. Россия в Первой мировой войне. Вторая буржуазно-демократическая революция (1914 – март 1917 г.). М. : Воен. изд-во, 1946. 88 с.
83. Мисник В.К. Изучение темы «Первая мировая война 1914–1918 гг.» в курсе новой истории. Калуга : Калуж. изд-во, 1959. 61 с.

84. Мунчаев Ш.М., Устинов, В.М. История России : учеб. для вузов. 9-е изд., изм. и доп. М. : Норма, изд. дом «Инфа-М», 2002. 75 с.
85. Нарастание революционного кризиса в России в годы первой мировой войны (1914 – февраль 1917 г.): междунар. вуз. сб. науч. тр. / Ленингр. гос. пед. ин-т им. А.И. Герцена. Л. : ЛГПИ, 1987. 152 с.
86. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 6423. Мінская гарадская ўправа. Перапіска аб бежанцах.
87. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 3639. Пастановы мінскай гарадской думы.
88. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8577, 8578, 8579, 8639, 8960, 8982, 8983, 8985, 8986, 8988, 8989, 9028, 9029, 9031, 9032, 9033, 9034, 9035, 9036, 9038, 9177. Канцылярыя мінскага губернатара. Загады, перапіска і звесткі пра бежанцаў.
89. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 300. Воп. 1. Спр. 67, 96. Перапіска па пытаннях размяшчэння бежанцаў у Мінскай губерні.
90. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 511. Воп. 1. Спр. 1, 7, 9, 14. Камітэт Яе Імператарскай Высокасці Вялікай Князёўны Таццяны Мікалаеўны. Перапіска мінскага гарадскога і павятовых аддзяленняў аб уладкаванні бежанцаў.
91. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 700. Воп. 1. Спр. 25, 41, 42, 121, 226, 227, 228, 229, 235, 242, 248, 255, 260. Мінскі губернскі камітэт Усерасійскага земскага саюза. Бежанскі аддзел.
92. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 700. Воп. 4. Спр. 4. Мінскі губернскі камітэт Усерасійскага земскага саюза.
93. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 48 720, 49 128. Канцылярыя віцебскага губернатара. Эвакуацыя ўрадавых устаноў.
94. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 2111. Канцылярыя магілёўскага губернатара. Звесткі аб арганізацыях, якія дапамагаюць бежанцам.
95. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 2005. Воп. 1. Спр. 764. Горацкае павятовае паліцэйскае упраўленне. Цыркуляры МУС.
96. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 2084. Воп. 1. Спр. 71. Магілёўская губернская земская ўправа. Справа аб арганізацыі дапамогі бежанцам.
97. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 2289. Воп. 1. Спр. 6, 7, 29, 34. Магілёўскае паўнамоцтва «Поўначдапамогі». Перапіска па ўладкаванні бежанцаў у Магілёўскай губерні.
98. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 2592. Воп. 1. Спр. 307. Канцылярыя віцебскага губернатара. Справа аб адкрыцці Віцебскага цэнтральнага гарадскога бюро працы для ўладкавання бежанцаў на працу.
99. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Мінск. Ф. 2708. Воп. 1. Спр. 27, 38, 65. Віцебскі губернскі аб'яднаны камітэт дапамогі бежанцам пры Ўсерасійскіх земскім і гарадскім саюзах.
100. Нелипович С.Г. Репрессии против подданных «центральных держав». Департации в России 1914–1918 гг. // Воен.-ист. журн. 1996. № 6. С. 32–42.



101. Немова В.В. Организация благотворительной помощи на Дону в годы первой мировой войны : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Ростов н/Д, 2009. 30, [1] с.
102. Олейник Н.Н. Первая мировая империалистическая война. Февральская буржуазно-демократическая революция в России : лекции / Харьк. худож.-пром. ин-т. Харьков : ХХПИ, 1991. 51 с.
103. Ольденбург С.С. Царствование императора Николая II. Ростов н/Д : Феникс, 1998. 576 с.
104. Очерк деятельности комитета Е. И. В. Великой княжны Татьяны Николаевны по оказанию временной помощи потерпевшим от военных действий со дня основания до 1 января 1916 г. Пг., 1916. 30 с.
105. Первая мировая война. М. : РАН, ИНИОН, 1994. 112 с.
106. Первая мировая война: дискуссии и проблемы истории / РАН, Ин-т всеобщей истории ; отв. ред. : Ю.А. Писаренко, В.Л. Мальков. М. : Наука, 1994. 303 с.
107. Первая мировая война: история и психология : материалы рос. науч. конф., Санкт-Петербург, 29–30 нояб. 1999 г. / под ред. В.И. Старцева [и др.]. СПб. : Нестор, 1999. 157 с.
108. Первая мировая война: пролог XX века : сб. ст. / Рос. акад. наук, Ин-т всеобщей истории, Ассоц. историков первой мировой войны. М. : Наука, 1999. 696 с.
109. Перепись беженцев в Петрограде / Особый отд. ком. ее Императ. Высочества Великой княжны Татьяны Николаевны. Пг. : Гос. тип., 1916. 89 с.
110. Правительственный вестник. 1914. № 195. 28 авг.
111. Правительственный вестник. 1915. № 15. 20 янв.
112. Провал политики царизма в годы первой мировой войны. Февральская буржуазно-демократическая революция в России : учеб. лекция / Бел. гос. ин-т нар. хоз-ва им. В.В. Куйбышева, каф. полит. истории; подгот. И.А. Толкачевым. Минск, 1990. 21 с.
113. Психология беженцев и вынужденных переселенцев: опыт исследований и практической работы / под ред. Г.У. Солдатовой. М. : Смысл, 2001. 279 с.
114. Рабочий класс России: 1907 – февраль 1917. М. : Наука, 1982. 464 с.
115. Радецкая В.Ф. О некоторых проблемах беженства в Беларуси в годы Первой мировой войны // Первая мировая война: история, геополитика, уроки истории и современность (к 90-летию окончания Первой мировой войны и начала формирования Версальско-Вашингтонской системы международных отношений) : материалы междунар. науч. конф., Витебск, 11–12 нояб. 2008 г. / редкол.: В.А. Космач (гл. ред.) [и др.]. Витебск : ВГУ, 2008. С. 199–200.
116. Расійскі Дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў (РДВГА), Масква. Ф. 1932. Воп. 12. Спр. 60, 75. Штаб Дзінскай ваеннай акругі. Аддзяленне цывільных спраў. Перапіска з губернатарамі аб уладкаванні бежанцаў.
117. Расійскі Дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў (РДВГА), Масква. Ф. 2005. Воп. 1. Спр. 40, 42. Ваенна-палітычнае і цывільнае упраўленне пры штабе Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Перапіска аб ўладкаванні бежанцаў.
118. Расійскі Дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў (РДВГА), Масква. Ф. 2020. Воп. 1. Спр. 124, 131. Канцылярыя галоўнага начальніка за-

беспячэння армій Паўночна-Заходняга фронту. Аддзел цывільных спраў. Перапіска аб бежанцах.
119. Расійскі Дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў (РДВГА), Масква. Ф. 2049. Воп. 1. Спр. 74, 399, 400, 402, 428, 435, 436, 438, 440, 441, 446, 447, 453. Канцылярыя галоўнага начальніка забеспячэння армій Заходняга фронту. Аддзел цывільных спраў. Загады, матэрыялы і звесткі пра бежанцаў.
120. Расійскі Дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў (РДВГА), Масква. Ф. 13 273. Воп. 1. Спр. 84, 96–99, 112–114, 185, 189, 418. Аддзел па ўладкаванні бежанцаў Усерасійскіх земскага і гарадскога саюза. Перапіска аб дзейнасці арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам.
121. Расійскі Дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА), СПб. Ф. 1322. Воп. 1. Спр. 1, 3, 4, 10, 11, 13, 23, 24, 30, 31, 33, 34. Часопісы пасяджэнняў Асобай нарады па ўладкаванні бежанцаў і крэдытнай камісіі. Цыркуляры МУС. Даведкі да пытання аб бежанцах.
122. Родзянко М.В. Крушение империи (воспоминания) / вступ. ст. В. Ганичева, С. Пионтковского. М. : Скифы, 1992. 283 с.
123. Россия в годы первой мировой войны, 1914 – февраль 1917 г. / Рос. гос. пед. ун-т им. А.И. Герцена; сост. И.В. Алексеева. СПб. : Образование, 1993. 74 с.
124. Ростунов И.И. Русский фронт первой мировой войны. М. : Наука, 1976. 388 с.
125. Рудович С. Бежанства 1915 года : рэц. // Бел. гіст. агляд. Мінск, 2000. Т. 7. С. 590–593.
126. Рудович С. Беларусь на сквозняках российской геополитики // Неман. 1997. № 11. С. 222–239.
127. Савицкий Э.М. Революционное движение в Белоруссии (август 1914 г. – февраль 1917 г.) / науч. ред. К.И. Шабуня. Минск : Наука и техника, 1981. 182 с.
128. Саладков И.И. Социально-экономическое положение Белоруссии до Великой Октябрьской социалистической революции (конец XIX – начало XX в.). Минск : Изд-во Бел. ун-та, 1957. 163 с.
129. Селіванаў П. Першая сусветная вайна // ЭГБ: у 6 т. Мінск : БелЭН, 1999. Т. 5. С. 472–476.
130. Сидоров А.Л. Экономическое положение в России в годы первой мировой войны. М. : Наука, 1973. 655 с.
131. Скалабан В.У. Бежанцы // ЭГБ : у 6 т. Мінск: БелЭН, 1993. Т. 1. С. 339–340.
132. Скалабан В. Белорусские беженцы Первой мировой войны : перспективы узучения // Последняя война Российской империи. М. : Наука, 2006. С. 69–70.
133. Скалабан В.У. «…В это суровое и важное время» // Неман. 1981. № 12.
134. Скир А.Я. Еврейская духовная культура в Беларуси : ист.-лит. очерк. Минск : Маст. літ., 1995. 144 с.
135. Смальянінаў М. Трагедыя пачатку XX ст. // Бел. гіст. часоп. 1994. № 3. С. 53–60.
136. Смирнов Н.Н. На переломе: российское учительство накануне и в дни революции 1917 г. / отв. ред. Т.М. Китанина ; РАН, Ин-т рос. истории, С.-Петерб. фил. СПб. : Наука, 1994. 410 с.



137. Соколов А.В., Деев В.М. Беженцы. Крат. слов.-справ. М. : Ин-т проблем гуманизма и милосердия, 1993. 80 с.
138. Солодков Т.Е. Борьба трудящихся Белоруссии против царизма (1907–1917 гг.). Минск : Наука и техника, 1967. 973 с.
139. Станкевич В.Б. Воспоминания, 1914–1919. М. : Рос. гос. гуманитар. ун-т, 1994. 286 с.
140. Старовойтов М.И. Миграционные процессы в белорусско-российско-украинском пограничье (конец XIX в. – 1917 г.) // Журн. междунар. права и междунар. отношений. 2008. № 3. С. 41–48.
141. Статут Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпеўшым ад вайны. Вільня : Друкарня М.М. Кухты, 1915. 16 с.
142. Сташкевич Н.С. Приговор революции. Крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917–1925). Минск : Унив., 1985. 304 с.
143. Тычина М. Народ и война: национальный характер как объект изображения. Мінск : Навука і тэхніка, 1985. 328 с.
144. Улашчык М. Бежанства // Спадчына. 2001. № 3. С. 211–218.
145. Утгоф В.С. Белорусские беженцы Первой мировой войны в 1914–1922 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. СПб., 2003. 23 с.
146. Уткин А.И. Забытая трагедия. Россия в первой мировой войне. Смоленск : Русич, 2000. 640 с.
147. Хасин В.В. Миграционные процессы в Российской империи в Первую мировую войну (по документам Нижнего Поволжья) : Отечественная история : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Саратов, 1999. 24 с.
148. Черменский Е.Д. Назревание революционного кризиса в России в начале XX века : лекции. М., 1953. 48 с.
149. Черменский Е.Д. Россия в период империалистической войны. Вторая революция в России (1914 – март 1917 г.) : лекции. М., 1954. 88 с.
150. Шацилло К.Ф. Россия перед первой мировой войной (Вооруженные силы царизма в 1905–1914 гг. ). М. : Наука, 1974. 112 с.
151. Шчаўлінскі М. Бежанцы і беларускі нацыянальны рух у гады першай сусветнай вайны // Бел. гіст. часоп. 1999. № 3. С. 24–28.
152. Щавлинский Н.Б. Белорусское национальное движение в годы первой мировой войны (1914–1918 гг.). Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2001. 136 с.
153. Щеров И.П. Организация и деятельность коллегий по делам пленных и беженцев в смоленском крае (1914–1921) : Отечественная история : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. М., 1998. 16 с.
154. Щетинина А.С. Беженцы на юге Западной Сибири 1914–1923 гг.: источники и методы изучения : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.09. Барнаул, 2007. 24 с.
155. Яковлев Н.Н. 1 августа 1914 г. М. : Молодая гвардия, 1974. 239 с.

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........................................................................... 3

Глава 1. ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ І КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ АГЛЯД ..................................................................... 6

Глава 2. ЭВАКУАЦЫЙНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ВАЕННЫХ І ЦЫВІЛЬНЫХ УЛАД У БЕЛАРУСІ ...................... 17

Глава 3. ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫХ УСТАНОЎ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ ПАТРЭБ БЕЖАНЦАЎ ............................ 32

Глава 4. УДЗЕЛ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У АКАЗАННІ ДАПАМОГІ БЕЖАНЦАМ ....................................... 72

ЗАКЛЮЧЭННЕ ........................................................................... 113

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ І КРЫНІЦ ....................... 119

*Навуковае выданне*

ЛАПАНОВІЧ Сяргей Фёдаравіч

ДЗЕЙНАСЦЬ
ДЗЯРЖАЎНЫХ І ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ
ПА АКАЗАННІ ДАПАМОГІ БЕЖАНЦАМ У БЕЛАРУСІ
Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ
(1914 – КАСТРЫЧНІК 1917 г.)

Манаграфія

Рэдактар *В.П. Скарынкіна*
Тэхнічны рэдактар *А.У. Мазалеўская*
Карэктар *Ж.Л. Каралёнак*

Падпісана да друку 26.10.2010. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 7,44. Ул.-выд. арк. 7,74.
Тыраж 100 экз. Заказ 256.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь».
ЛВ № 23330/0150245 ад 08.04.2008.
Пр-т Машэрава, 6, 220005, Мінск.